Усім чытачам "Голасу Радзімы" пажаданні поспеху ў 2006 годзе!

BELARUS 21.BY

Беларусь on-line у Інтэрнэце

Прызнанне

"Юны Містэр свету" і "Першая прынцэса" родам з Беларусі

Стар. 16

Кошт ў Беларусі 1 000 рублёў.

Газета выходзіць у другі і чацвёрты чацвер месяца.

22 снежня, 2005

Газета з Беларусі

Голас Радзімы

№ 51-52 (2973 — 2974)

Выдаецца з 1955 года

Актуальна

Прэзідэнцкія выбары прызначаны на 19 сакавіка 2006 года

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прынялі пастанову аб дасце правядзення выбараў Прэзідэнта краіны. Яны адбудуцца 19 сакавіка 2006 года. Цэнтральная выбарчая камісія ўжо правяла з гэтай нагоды сваё першае пасяджэнне. Такім чынам старт галоўнай выбарчай кампаніі дадзены.

Зваротная сувязь

"Над маім лунае лёсам Беларусь мая..."

Юбілейны, 50-ы, год для нашай газеты завяршаюць Дні "Голасу Радзімы" ў беларускіх суполках Эстоніі

Стар. 13

Дзяржава і дыяспара

Самарскае "Руска-Беларускае братэрства 2000" у рэаліях Саюзнай дзяржавы

Стар. 3

У таварыстве "Радзіма"

Вяртанне ў Ароў-парк

Беларуская мова і песня гучалі на амерыканскай зямлі як прывітанне з роднага краю

Стар. 9, 10

Скарбонка

"ГОСЦІ АД БОГА ЎСЕ КАЛЯДНІЧКІ"

Стар. 7

Да ўвагі чытачоў!

Наступны нумар газеты "Голас Радзімы" выйдзе 12 студзеня 2006 года

Падзея

Станіслаў БУКО: "Падтрымка міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды ў нашай краіне — не высокія словы, а адно з важнейшых дасягненняў дзяржаўнай палітыкі"

У Мінску адбылася прэзентацыя Маскоўскага дома нацыянальнасцей

Стар. 2

Навагодняе віншаванне

Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Шаноўныя землякі!

Шчыра і сардэчна віншую Вас, Вашых родных і сяброў з надыходзячымі Раждаствам Хрыстовым і Новым 2006 годам!

Жадаю, каб новы год прыйшоў да Вас з новымі поспехамі ў справах, прынёс шчасце і дабрабыт у Вашы сем'і, новых сяброў у Ваша жыццё.

Няхай гарачая любоў да мілай Беларусі ніколі не пакідае Вашы сэрцы, а ўспамін аб беларускіх краявідах, шэпце бароў і водары паветра роднай Бацькаўшчыны надаюць Вам новыя сілы ва ўсіх справах.

Няхай кожнаму з Вас мірнае, яснае неба падорыць шчаслівую зорку, што будзе весці Вас па жыцці і нагадваць сваім ласкавым святлом пра беларускую старонку, напяваць мілыя Вашаму сэрцу мілагучныя песні словамі матчынай мовы.

Здароўя, матэрыяльнага дабрабыту, поспехаў у справах, міру і шчасця Вам і Вашым сем'ям, дарагія суайчыннікі!

З павагай,

Станіслаў БУКО,
старшыня Камітэта.

Анонс

"Беларусь-TV" праз Інтэрнэт!

Праграмы беларускага тэлебачання сёння глядзяць не толькі ў краіне, але і за межамі Беларусі

Тэлеканал "Беларусь-TV", які распаўсюджваецца з дапамогай спадарожніка "Intelsat 904", могуць глядзець уладальнікі сістэм індывідуальнага спадарожнікавага прыёму тэлесігналу ці проста спадарожнікавых "талерак" у 20-ці краінах СНД, Балтыі, Усходняй і Заходняй Еўропы. Гэтыя краіны знаходзяцца ў зоне распаўсюджвання спадарожнікавага сігналу.

Яшчэ адзін спосаб — прагляд тэлеканала ў Інтэрнэце. Гэтую магчымасць могуць выкарыстоўваць тэлегледачы далёкага замежжа. Толькі ў лістападзе прамы эфір тэлеканала "Беларусь-TV" на сайце Белтэлерадыёкампаніі паглядзела больш за 45 тысяч чалавек. Найбольшую цікавасць да беларускага тэлебачання праяўляюць у ЗША, Ізраілі, Германіі, Расіі, Канадзе, Вялікабрытаніі.

Беларускім тэлепраграмам, якія па тэлеканале "Беларусь-TV" распаўсюджваюцца за мяжой, тэлегледачы і спецыялісты даюць высокую ацэнку. Вось меркаванні некаторых з іх:

"Беларусь-TV" дае мне такую унікальную магчымасць глядзець тыя ж самыя праграмы, якія беларусы глядзяць у Беларусі. Не зважаючы на той факт, што Амерыка знаходзіцца за тысячы кіламетраў ад Беларусі, тут можна глядзець тое ж, што я глядзеў бы ў гэтую ж хвіліну ў Беларусі, дзякуючы вяшчанню ў рэжыме рэальнага часу".

Юрый Эпштэйн, Чыкага, Ілінойс, ЗША.

"Вельмі прыемна, што ў моры бруду, патоку насілля і крыві з'явіўся беларускі канал. Трэба адзначыць — канал знайшоў свайго гледача. Дзякуй за цікавыя перадачы..."

Валерый, Вільнюс.

Для тых, хто жадае падключыцца да тэлеканала і глядзець беларускія тэлепраграмы паведамляем:

Параметры спадарожніка Intelsat 904: 600 усходняй даўгаты, частата на прыём 11529 МГц, палярнасць вертыкальная, сімвальная хуткасць патоку — 2,893 Мсімв/с, хуткасць MPEG — 4 Мбіт/с, FEC — .

Для прагляду прамога эфіру канала "Беларусь-TV" у сетцы Інтэрнэт на сайце www.tvr.by неабходны Microsoft Windows Media Player версіі 9.0 ці вышэй. Хуткасць падключэння да Інтэрнэта павінна быць не ніжэй за 96 Кбіт/сек.

Заканчэнне на стар. 2

Зваротная сувязь

Украіна

Ганарымся табою, Ксеня!

Як цудоўна выступіла наша беларусачка з Мазыра! Дзякуючы спадарожнікаваму тэлебачанню, мы змаглі назіраць за дзіцячым фіналам Еўрабачання-2005, у якім не было прадстаўніка Украіны, а таму ні адзін з тэлеканалаў Украіны не трансліраваў з Бельгіі гэты канцэрт маленькіх зорак, пазбавіўшы 47 мільёнаў грамадзян Украіны магчымасці атрымаць асалоду ад гэтага феерверку маладых талентаў з розных краін Еўропы. Але, дзякуючы спадарожнікаваму TV, мы ў сваім правінцыяльным Ізяславе па кабельным тэлебачанні не толькі назіралі за тым, што адбывалася на канцэртнай сцэне, але і поўнасцю запісалі ўсю трансляцыю на відэамагнітафон, каб ужо сёння зноў і зноў атрымліваць асалоду ад цудоўных мелодый, цудоўных галасоў, у рэшце рэшт, перамогі нашай зямлячкі, нашай шляхетненькай Ксеніі!!!

Калі пачалося "судзейства", я не спадзяваўся на ягоную аб'ектыўнасць і справядліваць, бо ўжо меў нагоду бачыць, якім яно было падчас дарослага конкурсу "Еўрабачання" ў сталіцы Украіны, калі прадстаўніцу Беларусі Анжаліку Агурбаш не прапусцілі ў фінал... Але на гэты раз падзеі развіваліся інакш.

Я вельмі парадаваўся за Іспанію: менавіта яе прадстаўнік увесь час быў сапернікам Ксені за 1-ае месца, але іспанцы не дазволілі сабе быць неаб'ектыўнымі (заўважу, што і беларусы гэтаксама высока, у 10 балаў, ацанілі выступленне прадстаўніка Іспаніі). Малайцы!

У мінулым годзе на Другім дзіцячым Еўрабачанні ў Нарвегіі спяваў ад Беларусі Ягор Ваўчок, які, на жаль, не заваяваў перамогу, але, дзякуючы яго цудоўным спевам, еўрапейскія аматары музыкі пачулі беларускага юнага спевака, даведаліся пра краіну, дзе жывуць талена-

Заканчэнне на стар. 13

ААЭ, Аргенціна, Арменія, Аўстралія, Аўстрыя, Балгарыя, Беларусь, Бельгія, Бразілія, Венгрыя, В'етнам, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Егіпет, ЗША, Ізраіль, Індыя, Іран, Італія, Казахстан, Канада, Карэя (Паўднёвая), Кітай, Куба, Кыргызстан, Латвія, Лівія, Літва, Малдова, Мексіка, Нарвегія, Нідэрланды, ПАР, Польшча, Расія, Румынія, Сербія, Сірыя, Славакія, Славенія, Туркменістан, Турцыя, Узбекістан, Украіна, Уругвай, Францыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эстонія, Японія

"Голас Радзімы" ў 52 краінах

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВИНИ*

Афіцыйна

Прэзідэнт Беларусі наведаў Кітай

Адбыўся афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітай. У ходзе праведзеных перамоў, па словах Аляксандра Лукашэнкі, бакі дасягнулі дамоўленасці аб будаўніцтве ў Беларусі шэрага сумесных прадпрыемстваў у галіне высокіх тэхналогій. "Кітай гатовы прафінансаваць гэтыя праекты і называе вялікія сумы", — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама паведаміў, што беларускія кампаніі, у сваю чаргу, намераны прыняць удзел у засваенні рэгіёнаў, якія развіваюцца, на паўночным захадзе КНР, перш за ўсё — у галіне сельскай гаспадаркі. А. Лукашэнка лічыць, што ажыццяўленне гэтых праектаў дазволіць значна падняць узровень двухбаковага тавараабароту, які зараз складае каля паўмільярда долараў у год.

"Мы дамовіліся, што да 2010 года Беларусь будзе мець з Кітаем як мінімум 1,5-2 мільярды тавараабароту", — падвёў вынік Прэзідэнт.

У цэлым Лукашэнка застаўся задаволены вынікамі паездкі ў КНР. "Падпісана больш дзесятка міжведамасных і міжурадавых пагадненняў, 20 кантрактаў на ўзроўні прадпрыемстваў", — заявіў беларускі лідэр.

На яго думку, галоўным вынікам візіту ў Пекін стала падпісанне дэкларацыі, якая азначае перспектывы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. "Гэты дакумент аб стратэгічным партнёрстве, на аснове якога і будзе адбывацца супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі", — падкрэсліў Лукашэнка.

Кітай з'яўляецца асноўным палітычным і гандлёва-эканамічным партнёрам Беларусі ў Азіі. У 2004 годзе дасягнуты рэкордныя паказчыкі гандлю ў гісторыі беларуска-кітайскіх адносін, тавараабарот з КНР склаў 459,5 мільёна долараў.

Па выніках дзевяці месяцаў бягучага года беларуска-кітайскі тавараабарот ужо перавысіў паўмільярдную адзнаку. У студзені-верасні абмен таварамі паміж Беларуссю і Кітаем павялічыўся больш чым на 60 працэнтаў у параўнанні з такім жа перыядам 2004 года і склаў 502 мільёны долараў.

Пры гэтым беларускі экспарт узрос на 44,5 працэнта і дасягнуў 307 мільёнаў долараў, імпарт — больш чым на 93 працэнты і склаў 195 мільёнаў долараў. Аснова беларускага экспарту ў Кітай — калійныя ўдабрэнні.

Падрыхтавала Алена СПАСЮК.

Анонс

"Беларусь-TV" праз Інтэрнэт!

Пачатак на 1-й стар.

"АЛІМПІЙСКАЯ ВІЗА"

Кожны чацверг у 19.25 (паўтор па пятніцах у 16.20)

Паспрабуем разам ацаніць шанцы беларускіх алімпійцаў на ўзнагароды Турына.

"СЯРЭБРАНЫ ГРАМАФОН"

Па нядзелях у 15.40 (паўтор у пятніцу ў 15.30)

Музычна-забаўляльная праграма: дзесяць кліпаў беларускіх выканаўцаў, за якія на працягу трох хвілін галасуюць пры дапамозе SMS паведамленняў тэлегледачы.

"НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЗДАБЫТАК"

25 снежня ў 18.10 (паўтор 27 снежня ў 18.30)

Дакументальны цыкл, складзены з васьмі серый. Кожная серыя распавядае аб самых значных момантах гісторыі, мастацтва, культуры Беларусі ад зараджэння пісьменства.

Падзея

Станіслаў БУКО:

"ПАДТРЫМКА МІЖНАЦЫЯНАЛЬНАЙ І МІЖКАНФЕСІЙНАЙ ЗГОДЫ Ў НАШАЙ КРАІНЕ — ГЭТА НЕ ВЫСОКІЯ СЛОВЫ, А АДНО З ВАЖНЕЙШЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ"

УНІКАЛЬНАЯ СІТУАЦЫЯ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ

Па даных апошняга перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь, адна пятая частка (19 працэнтаў) пражываючых у краіне — прадстаўнікі больш чым 130 нацыянальнасцей. 11 працэнтаў з іх — рускія, 3,9 — палякі, 2,4 — украінцы, 0,3 — яўрэі, а таксама армяне, татары, цыгане, літоўцы, азербайджанцы, малдаване, немцы, грузіны і іншыя. Усе яны валодаюць роўнымі палітычнымі, эканамічнымі і сацыяльнымі правамі, рэалізуюць свае гарантаваныя заканадаўствам правы на захаванне і развіццё роднай мовы, культуры, традыцый і звычаяў, з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускага грамадства.

Захаванне ўстойлівай міжканфесійнай і міжнацыянальнай згоды — адно з дасягненняў беларускай дзяржавы. У 1997 годзе ў мэтах ажыццяўлення кантролю за выкананнем беларускага заканадаўства па абароне правоў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей быў створаны Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Вынікі яго дзейнасці за гэтыя гады дэманструюць эфектыўнасць існавання такой установы. Па заключэннях замежных экспертаў, заканадаўства Беларусі ў сферы гарантый правоў асобам, якія належаць да нацыянальных меншасцей, адпавядае міжнародным стандартам. Так, міжнароднымі арганізацыямі прызнана унікальная сітуацыя інтэрнацыянальнага характару беларускага грамадства, стварэнне рэальнай мадэлі яго бесканфліктнага існавання.

Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Беларусі адыгрывае значную ролю ў гарманізацыі нацыянальных адносін. Сёння Беларусь — шматканфесійная і шматнацыянальная краіна, дзе дзейнічаюць 25 канфесій і 124 нацыянальныя аб'яднанні. Важнай задачай з'яўляецца правільная каардынацыя іх дзейнасці, з чым паспяхова спраўляецца Камітэт.

Усе зарэгістраваныя аб'яднанні працуюць у сферах культурна-асветніцкай, адукацыйнай, інфармацыйнай і дабрачыннай, асаблівую ўвагу надаюць развіццю нацыянальнай культуры. Асабліва гэта праяўляецца на Усебеларускім фестывалі нацыянальных культур, які праводзіцца кожныя два гады ў Гродне. На мінулым, у 2004 годзе, было прадстаўлена 25 нацыянальнасцей. Некаторыя грамадскія аб'яднанні маюць свае перыядычныя выданні. Так, напрыклад, на польскай мове выдаецца 12 газет і часопісаў. Упершыню пачалі выдаваць сваю газету беларускія цыгане.

У чэрвені бягучага года Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей разам з Офісам АБСЕ ў Мінску быў выдадзены буклет-даведнік "Беларусь шматнацыянальная", у якім адлюстравана гісторыя, культура, традыцыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, якія пражываюць у краіне і стварылі свае аб'яднанні.

Разам з Міністэрствам адукацыі Камітэт вырашае праблемы, якія звязаны з захаваннем нацыянальнай ідэнтычнасці. Так, сістэма школьнай адукацыі ў Беларусі дазваляе вывучаць прадстаўнікам розных нацыянальнасцей родныя мовы, пачынаючы з дашкольнага ўзроўню. У 2004-2005 навучальным годзе ў 188 сярэдніх навучальных установах, родную мову (іўрыт, польскую, літоўскую, новагрэчаскую, украінскую і іншыя) вывучалі каля 9 тысяч дзяцей.

Акрамя гэтага, пры грамадскіх аб'яднаннях нацыянальных меншасцей арганізавана 65 нядзельных школ. У іх родную мову, гісторыю і культуру вывучаюць 4,8 тысячы чалавек. Нядзельнымі школамі абзавяліся абшчыны азербайджанцаў, армян, афганцаў, яўрэяў, грузін, грэкаў, карэйцаў, літоўцаў, малдаван, латышоў, немцаў, палякаў, татар, украінцаў. Усе школы забяспечваюцца неабходнай метадычнай літаратурай. Спецыяльна выдадзены падручнікі польскай мовы і літаратуры для пачатковых класаў, у Літву заказваюцца перакладныя падручнікі па розных прадметах.

Разам з Нацыянальным інстытутам адукацыі Камітэтам выдадзены матэрыялы аб вопыце работы школ "Вучымся жыць разам" аб развіцці міжэтнічнага даверу ў школе і ў грамадстве. Для навучэнцаў старэйшых класаў падрыхтаваны падручнік "Гісторыя і культура нацыянальных меншасцей Рэспублікі Беларусь".

А ў мэтах аказання дапамогі ў развіцці сувязей грамадскіх аб'яднанняў з гістарычнай Радзімай Камітэт супрацоўнічае з падобнымі яму дзяржаўнымі органамі ў Літве, Латвіі, Эстоніі, Малдове, Польшчы, Украіне. Праводзіцца работа па пашырэнні такога супрацоўніцтва з іншымі краінамі.

Нядаўна адбылося падпісанне дамовы паміж Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і Камітэтам міжрэгіянальных сувязей і нацыянальнай палітыкі горада Масквы.

Пры маскоўскім Камітэце дзейнічае Дом нацыянальнасцей, прэзентацыя яго адбылася ў Доме дружбы ў Мінску і стала прыкметнай падзеяй.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ МАСКОЎСКАГА ДОМА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Карэнных масквічоў у расійскай сталіцы ўсяго толькі трэць, астатнія — прыезджыя з розных краін свету, рэспублік былога Савецкага Саюза. Рашэнне праблемы, як сфарміраваць у такіх розных гараджан пачуццё адзінства, падштурхнула да адкрыцця Дома нацыянальнасцей — месца сустрэч прадстаўнікоў розных дыяспар.

Дырэктар Маскоўскага дома нацыянальнасцей, ганаровы дзеяч культуры Расійскай Федэрацыі, прафесар Сяргей Гужаеў паведаміў, што ўстанова была створана па загаду ўрада Масквы ў 1998 годзе. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці з'яўляюцца пастаянная шматгаліновая работа з нацыянальна-культурнымі аўтаноміямі і грамадскімі аб'яднаннямі нацыянальных меншасцей. Пры Доме акрэдытавана больш як 100 арганізацый.

Маскоўскі дом нацыянальнасцей — унікальная ўстанова, дзе сустракаюцца людзі розных нацыянальнасцей, веры і перакананняў для канструктыўнага дыялогу і пошуку адказаў на пытанні: як жыць у свеце, дзе ўсе такія розныя; як "ворага" ператварыць у сябра; што трэба рабіць, каб ад палітыкі нацыянальнага пытання перайсці да разумення нацыянальных праблем? Адказы шукаюць на семінарах і "круглых сталах", якія пастаяна дзейнічаюць у Доме нацыянальнасцей. На іх запрашаюцца вядучыя вучоныя Масквы і Расіі, кіраўнікі дзяржаўных устаноў, прадстаўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў. Вынікі, рэкамендацыі і рэзалюцыі такіх сустрэч мэтанакіравана дасылаюцца ў дзяржаўныя структуры, міністэрствы і ведамствы Расійскай Федэрацыі, у адміністрацыйны апарат Прэзідэнта. Сяргей Гужаеў адзначае: "Наша работа — гэта ўклад у фарміраванне ўстановак талерантнай свядомасці ў краіне, прафілактыку экстрэмізму, выхаванне культуры свету".

У структуры Маскоўскага дома нацыянальнасцей актыўна працуе Маскоўскі цэнтр культуры свету. Разам з расійскімі і замежнымі адукацыйнымі і навуковымі інстытутамі, міжнароднымі арганізацыямі Цэнтр ажыццяўляе культурна-асветніцкія праграмы, у якіх удзельнічаюць людзі не толькі розных нацыянальнасцей, але і ўзросту. Так, у міжнародным конкурсе "Прыгажосць выратуе свет" самаму маленькаму канкурсанту было тры з паловай гады.

Штогод у Доме нацыянальнасцей праводзіцца больш за 400 розных мерапрыемстваў. Гэта і літаратурна-музычныя вечары, і выставы, і канцэрты, і прэзентацыі кніг і незвычайных праектаў. Як адзначаюць госці, а сярод іх былі Расул Гамзатаў, Чынгіз Айтматаў, Давід Кугульцінаў, Мурад Кажлаеў, Андрэй Эшпай, Іосіф Кабзон, Валянцін Распуцін, Рэнат Ібрагімаў, а таксама народны артыст Беларусі Ігар Лучанок, такія сустрэчы неабходныя, бо яны паглыбляюць паразуменне паміж людзьмі розных нацыянальнасцей і веры.

У Маскоўскім доме нацыянальнасцей сабрана значная калекцыя карцін і вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна ўвесь час папаўняецца. І вось ужо другі год у Доме праводзіцца "Этна- артфестываль", на якім прадстаўлены традыцыі і мастацтва многіх народаў.

З Маскоўскім домам нацыянальнасцей супрацоўнічае і аўтаномія "Беларусы Масквы", якую ўзначальвае Аляксей Кавалевіч. Тут даволі часта праходзяць сустрэчы прадстаўнікоў дыяспары, выставы, канцэрты і іншыя мерапрыемствы. У канцы лістапада ў Доме прайшла мастацкая выстава "Беларуская экзотыка".

Увогуле, па словах старшыні Савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі" Францішка Каўрыгі, апошні перапіс насельніцтва сведчыць, што ў Расіі пражывае каля 1 мільёна беларусаў. Нашы землякі вызначаюцца вялікай актыўнасцю, многія займаюць адказныя пасады ў структурах заканадаўчай і выканаўчай улад Расійскай Федэрацыі, працуюць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, у Расіі шмат вучоных, дзеячаў культуры — выхадцаў з Беларусі. Тры касманаўты, напрыклад, маюць прамое дачыненне да нашай краіны: Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак і Валянціна Церашкова, якая хоць і нарадзілася ў Расіі, але значны перыяд жыцця правяла ў Беларусі.

Аб актыўнай дзейнасці ФНКА "Беларусы Расіі" гаворыць той факт, што некалькі гадоў таму пры садзейнічанні мэра Масквы Юрыя Лужкова ў Мінску на беразе Свіслачы быў устаноўлены помнік вялікаму рускаму паэту Аляксандру Пушкіну, а ў хуткім часе на Кутузаўскім праспекце ў Маскве будзе адкрыты помнік беларускаму песняру Янку Купалу.

У МІНСКУ З'ЯВІЦЦА СВОЙ ДОМ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Праект Маскоўскага дома нацыянальнасцей зацікавіў кіраўніцтва Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі. Старшыня Камітэта Станіслаў Буко запэўніў, што ўжо вясной у Мінску з'явіцца свой Дом нацыянальнасцей. Пры падпісанні Дамовы аб супрацоўніцтве абодва бакі выказалі жаданне адкрыць у Беларусі яшчэ і філіял Маскоўскага дома. Першы намеснік старшыні Камітэта міжрэгіянальных сувязей і нацыянальнай палітыкі ўрада Масквы Павел Клімаў упэўнены: "Такое супрацоўніцтва прыдасць вялікі эфект. Маскоўскі дом — цікавы вопыт, такі дом — адзіны ў СНД. Калі наш вопыт спатрэбіцца ў Беларусі, мы будзем вельмі рады".

Акрамя гэтага, у рамках падпісання Дамовы прайшлі "круглыя сталы". Адзін адбыўся ў Доме Міласэрнасці. Удзельнікі яго абмяркоўвалі праблемы фарміравання атмасферы міжэтнічнай і міжканфесійнай салідарнасці, культуры свету і згоды ў грамадстве. На другім, які праходзіў у Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы, мінчане і масквічы дзяліліся вопытам работы з нацыянальнымі аб'яднаннямі, намячалі шляхі супрацоўніцтва. Па словах старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі Станіслава Буко, падпісанне пагаднення — значны крок на шляху да развіцця міжнацыянальных адносін паміж народамі Беларусі і Расіі.

Кацярына НЕМАГАЙ.

НА ЗДЫМКАХ: выступае саветнік Міністэрства рэгіянальнага развіцця Расіі Мікалай БУГАЙ, Станіслаў БУКО (на 1-й стар.); падчас прэзентацыі Маскоўскага дома нацыянальнасцей у Мінску.

Фота Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

З ПАСТЫРСКАГА ЛІСТА НА БОЖАЕ НАРАДЖЭННЕ 2005 ГОДА

"Пойдзем у Бэтлеем і паглядзім, што там сталася" (Лк 2,15) "А Слова сталася целам і пасялілася між намі" (Ян 1, 14)

Ва ўрачыстасць Божага Нараджэння нашыя вочы, нашыя вушы, нашыя сэрцы скіраваны да Бэтлеема, да стайні, да ясляў, бо мы жадаем нанава перажыць збаўчую таямніцу ўцелаўлення Божага Сына.

У гэтую святую Бэтлеемскую Ноч адбылася доўгачаканая сустрэча чалавека з Богам...

У Бэтлееме Юдэйскім распачалася найпрыгажэйшая гісторыя перакрыжавання шляхоў Бога і чалавека: стары свет граху і новы свет ласкі, любоў і прымірэнне дасягаюць найбольшай блізкасці, што адкрывае новую перспектыву гісторыі чалавека і свету. Бог увайшоў у гісторыю чалавецтва, у біяграфію кожнага чалавека, каб выбавіць нас з няволі граху, каб мы нанава "ад Бога нарадзіліся" (пар. Ян 1, 13), сталіся братамі Яго Сына і Яго ўсыноўленымі дзецьмі.

У Бэтлееме сустракаюцца вялікая любоў Бога і шчырая вера чалавека. Праз бэтлеемскую стайню Бог спяшаецца да людзей, а людзі вандруюць да Яго. Божы Сын стаў блізкі чалавеку, пасяліўся між людзей: Ён з імі, сярод іх і для іх...

Пасля свайго ўваскрасення і ўнебаўшэсця, верны свайму абяцанню — "не пакіну вас сіротамі" (пар. Ян 14, 18), "і вось Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку" (пар. Мц 28, 20), — Езус застаўся ў сваім Касцёле — Яго Містычным Целе, — які атрымаў дары Духа Святога, каб у сустрэчах з людзьмі ў святых сакрамэнтах весці іх да свайго вечнага Валадарства.

На Апошняй Вячэры, калі Езус устанавіў Боскую Эўхарыстыю, Ён даў людзям магчымасць штодзённа сустракацца з Ім праз удзел у святой Імшы — аднаўленні Яго крыжовай Ахвяры — праз прыняцце Яго Цела і Крыві ў постацях хлеба і віна, духоўнага спажытку для душы, праз наведванне і адараванне Яго ў Найсвяцейшым Сакрамэнце, у табэрнакулюме — жывой Эўхарыстычнай Стаенцы.

Неабходна часта і доўга заставацца на каленях перад Езусам Хрыстом, утоеным у Эўхарыстыі, каб належным чынам ушаноўваць Яго, каб дзякаваць Яму за атрыманыя ласкі, каб перапрашаць за ўчыненыя знявагі, каб прасіць Яго аб благаслаўленні.

І так, пачынаючы ад Бэтлеемскай Ночы, на працягу дзвюх тысяч гадоў ажно да канца гісторыі чалавецтва пастаянна і няспынна адбываюцца сустрэчы Бога з чалавекам і чалавека з Богам.

Якія ж невымоўныя дабрыня, міласэрнасць і любоў Бога ў адносінах да людзей!

Пастаянныя сустрэчы з Богам даюць чалавеку магчымасць прабываць з Ім ужо ў гэтым зямным жыцці і тым самым гарантуюць атрыманне прывілею вечнага прабывання з Богам у Нябесным Валадарстве.

З найлепшымі святочнымі пажаданнямі і пастырскім благаслаўленнем

Кардынал Казімір СВЁНТЭК,
Арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі,
Адміністратар Пінскай дыяцэзіі.

З паслання на Ражджаство Хрыстова

Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

"Ражджаство Тваё, Хрысце Божа наш, заззяла свету святлом розуму"
Трапар Ражджаству Хрыстоваму

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

Сэрцы нашы зноў лікуюць у перажыванні неспасціжнага цуду Ражджаства Хрыстовага. Кожны год на працягу стагоддзяў хрысціяне розных краін і народаў зноў і зноў дзівуюцца адкравенню Прасвятой Троіцы, якое здзейснілася ў Святой зямлі больш за дзве тысячы гадоў таму.

У адрозненне ад сакрэтаў чалавечых, тайны Божыя робяцца тым большымі і шматзначнейшымі, тым дзівоснейшымі і важнейшымі для нас, чым глыбей мы ў іх углядаемся і ўдумваемся. І па меры таго, як Промысл Божы раскрывае яўленую ў Ражджастве Хрыстовым прамудрасць, мы павінны ўсё больш выразна ўсведамляць сваю хрысціянскую адказнасць перад светам, які яшчэ не спазнаў радасці Ражджаства, альбо забыў яе, альбо так і не здолеў убачыць яе сапраўдны сэнс...

Дарагія браты і сёстры! Мы пакліканы быць сведкамі гэтага сыходжання Нябёсаў ва ўсёй іх паўнаце ў свет чалавечы; мы павінны быць сведкамі нябеснай велічы кожнага чалавека, які жыве на зямлі. А для гэтага неабходна навучыцца заўсёды бачыць першатворную бажэственную годнасць у кожнай чалавечай асобе — нават у далёкай і адчужанай, у пыхлівай і ганарлівай, у змрочнай і адчайнай...

У дні нараджэння мы звычайна выказваем удзячнасць сваім бацькам, згадваем родных са старэйшых пакаленняў, расказваем розныя гісторыі са свайго дзяцінства, маладосці і сталасці...

На нашай Беларускай зямлі гістарычны шлях Царквы Хрыстовай быў адзначаны на рубяжы стагоддзяў дзвюма выдатнымі падзеямі. У 1992 годзе мы праводзілі святкаванне 1000-годдзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай Царквы на Белай Русі, а ў адыходзячым 2005 годзе прайшлі ўрачыстасці ў гонар 1000-годдзя епархіі Тураўскай...

Мне хацелася б развеяць перасцярогі і страхі тых, хто панура і безнадзейна разважае пра духоўны стан і пра будучае нашага сучаснага грамадства. За гады царкоўнага адраджэння сфармавалася новае пакаленне, якое з ранняга дзяцінства далучана да Святых Хрыстовых Тайн, дзякуючы прасветленаму розуму і хрысціянскай дбайнасці іх бацькоў. Яны яшчэ маленькія, гэтыя дзеці і падлеткі, але колькасць іх узрастае, і Благадаць Божая, успрынятая імі ў дзяцінстве, неўзабаве прынясе свае плады там, дзе яны будуць здзяйсняць свой жыццёвы подзвіг пад засенню Крыжа прападобнай Еўфрасінні Полацкай і па благаслаўленню Тураўскага святціцеля Кірыла, Залатавуста Святой Русі.

Узлюбленыя браты і сёстры! У Ражджастве Хрыстовым мы атрымалі скарб, роўнага якому няма ў гісторыі свету.

Давайце ж дзяліцца Ражджэственскай радасцю з усімі людзьмі, таму што вось ён, цуд: Хрыстос пасярод нас — і ёсць, і будзе!

2005/2006 гг., Мінск

"Руска-Беларускае братэрства 2000" у рэаліях Саюзнай дзяржавы

На самарскай зямлі, паводле апошняга перапісу насельніцтва, пражывае 14 тысяч беларусаў. Здавалася б няшмат — крыху больш за адзін працэнт ад насельніцтва Самары. Але за апошнія гады ў культурным жыцці абласнога цэнтра самарскія беларусы сталі досыць прыкметныя. Адбылося гэта дзякуючы актыўнай грамадскай працы абласной арганізацыі "Руска-Беларускае братэрства 2000", якая сёлета адзначыла сваё 5-годдзе.

Узначаленая Ірынай Глускай грамадская арганізацыя самарскіх беларусаў — не звычайны нацыянальна-культурны цэнтр. Дзейнасць "Руска-Беларускага братэрства 2000" накіравана не толькі на развіццё нацыянальнай культуры і мовы беларусаў у Самары і вобласці, але і на вынаходніцкую, нестандартную прапаганду расійска-беларускага супрацоўніцтва. Самарскія падзвіжнікі руска-беларускага братэрства кожнай сваёй грамадскай акцыяй як бы падкрэсліваюць і нагадваюць грамадзянам: "Мы жывём не проста ў Расійскай Федэрацыі, а ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі". Яны, мабыць, самыя актыўныя ўдзельнікі штогадовага абласнога міжнацыянальнага свята "Вянок сяброўства народаў".

Абласная арганізацыя беларусаў актыўна спрыяе наладжванню культурных, эканамічных, чалавечых сувязей Самары з беларускімі гарадамі-пабрацімамі Гомелем і Віцебскам. Досыць сказаць, што дэлегаты ад самарскага таварыства "Руска-Беларускае братэрства 2000" пабывалі на 1030-годдзі Віцебска — сапраўднай культурнай сталіцы Беларусі, і на славутым Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". У сваю чаргу школьнікі і гімназісты з Віцебска і Гомеля прынялі ўдзел у міжнародных "Славянскіх чытаннях", якія традыцыйна праходзяць у сценах самарскай Славянскай школы № 132, а ў будучым годзе пройдуць і ў нашых гомельскіх пабрацімаў.

Ірына Глуская і яе паплечнікі ўмацоўваюць павагу да беларусаў у прадстаўнікоў усіх народаў, якія насяляюць рэгіён, у першую чаргу — маладых самарцаў. Таму свае грамадска-культурныя акцыі яны часцей за ўсё праводзяць у сценах самарскіх школ. Першы арганізаваны ў кастрычніку 2002 года музычна-літаратурны вечар прайшоў у дзіцячай музычнай школе № 9 і быў прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. А летась "Руска-Беларускае братэрства 2000" арганізавала ў Самары ўжо сапраўдны дзіцячы музычны фестываль "Сябры", прысвяціўшы яго Году Беларусі ў Расіі і 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Назапашаны вопыт дазволіў Ірыне Глускай і яе паплечнікам арганізаваць сёлета абласны фестываль мастацтваў "Беларусь — мая песня!". У конкурсных праграмах фестывалю прыняло ўдзел звыш 200 удзельнікаў. Адборачныя конкурсы праводзіліся па васьмі намінацыях. Да заключнага гала-канцэрта, які прайшоў у актавай зале дзіцячай музычнай школы № 17, было дапушчана 50 пераможцаў і дыпламантаў. Яго ўдзельнікаў і гасцей разам з прэзідэнтам таварыства "Руска-Беларускае братэрства 2000" віталі прадстаўнікі ад урада Самарскай вобласці і адміністрацыі горада Самары, Самарскай гарадской Думы, нацыянальна-культурных аб'яднанняў. А потым было сапраўднае свята беларускай музыкі і песні, якое стала своеасаблівым прызнаннем любві самарцаў да беларускага народа і яго культуры.

Паколькі фестываль быў прысвечаны 60-годдзю Вялікай Перамогі, прэзідэнт "Руска-Беларускага братэрства 2000" Ірына Глуская завяршыла яго вершам ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, вядомага самарскага паэта Паўла Рудэнкі, прадстаўніка абласнога ўкраінскага нацыянальна-культурнага цэнтра "Прамень":

Сплоченьем Беларуси и России
Семью славян навеки возродим.
Любые беды вместе мы осилим,
Врага любого вместе отразим.
Цвести садам над Бугом и над Волгой,
Стране единой и свободной быть.
Для всех нас нет святей и выше долга,
Чем дом беречь и наш Союз крепить.

Мабыць, самае галоўнае сведчанне такіх сумесных акцый — саюз Беларусі і Расіі ёсць каму мацаваць!

18 лістапада ў Палацы ветэранаў Самары адбылася ўрачыстасць з нагоды ўручэння 50 самарскім франтавікам — удзельнікам баёў на беларускай зямлі — памятных юбілейных медалёў "60 годоў вызвалення Беларусі".

Арганізацыя беларусаў Самары аказала самую актыўную падтрымку Дэпартаменту міжнародных адносін вобласці, а таксама Дэпартаменту міжнародных і міжрэгіянальных сувязей адміністрацыі Самары ў падрыхтоўцы візіту кіраўніка беларускага ўрада ў Самарскую вобласць. Знаходжанне Сяргея Сідорскага ў нашым горадзе не абышлося без беларускай песні ў выкананні маладых самарскіх талентаў, якіх адкрыў мінулы славянскі фестываль мастацтваў. 15 снежня прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, які знаходзіўся ў рабочай паездцы ў Самарскую вобласць, сустрэўся з прадстаўнікамі беларускай дыяспары.

Андрэй БАНДАРЭНКА.

НА ЗДЫМКУ: прэзідэнт Самарскай абласной арганізацыі "Руска-Беларускае братэрства 2000" Ірына ГЛУСКАЯ (злева), прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей СІДОРСКІ, губернатар Самарскай вобласці Канстанцін ЦІТОЎ.

Фота Рамана КАБЯКА, БелТА.

NEWS FROM BELARUS

Officially

Presidential Elections to be Held on March, 19

The presidential elections will be held on March 19, 2006. The date has been set in the Resolution adopted by the Chamber of Representatives of the National Assembly of Belarus on December, 16. In line with the Constitution the Parliament fixes the date of the presidential elections.

Cooperation

Belarus and China Strengthen Relations

President of Belarus and other high-ranked officials paid official visit to China. The visit envisaged signing a number of documents including about 10 bilateral agreements. In the course of the visit to Beijing the two sides planed to sign agreements on cooperation in the spheres of tourism, information and printing, on cooperation between customs departments, on statistics exchange and development of regional relations.

Presidents of Belarus and the People's Republic of China Alexander Lukashenko and Hu Jintao first had one-to-one talks followed by a broad meeting where a set of important documents was considered.

Alexander Lukashenko and Hu Jintao held a frank exchange of opinions in the areas of bilateral cooperation, on international and regional issues and reached understanding on a wide range of positions. The parties noted that extension of the mutually beneficial cooperation and pushing the relations between Belarus and China to new highs was in sync with the fundamental interests of the both states. Following the bilateral talks the heads of Belarus and China adopted joint declaration.

In the course of the talks the two sides also signed more than 10 ministerial and intergovernmental agreements and 20 contracts between economic agents of the two states.

Падрыхтавала Настасся ГВОЗДЗЕВА.

Укаранаваны абраз у мінскай катэдры

Фота Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

У Беларусі гістарычна ўсталяваўся культ Маці Божай. Дастаткова прыгадаць іконы ў праваслаўных святынях Жыровічаў і Мінска, абразы ў каталіцкіх касцёлах Будслава і Гродна, Гудагая і Тракеляў. Не так даўно апошнія чатыры былі ўганараваны каронамі паводле ласкі папярэдняга ватыканскага пантыфіка Яна Паўла II як цудатворныя.

10 снежня да іх у Беларусі дадаўся пяты ўкаранаваны абраз — Беззаганнай Марыі Панны ў Мінскім катэдральным касцёле. Вёў урачыстае набажэнства мітрапаліт Мінска-Магілёўскай дыяцэзіі кардынал Казімір Свёнтак у прысутнасці шматлікага духавенства, прадстаўнікоў улад, дыпламатычнага корпуса, гасцей з Аўстрыі, Польшчы і Калінінградскай вобласці Расіі.

Набажэнства вялося на беларускай мове, але найбольш важная інфармацыя перакладалася на англійскую, гучалі традыцыйная латынь, руская і польская мовы. Цырымонія пачалася з асвячэння васьмітонавага органа, падараванага касцёлу на ахвяраванні парафіян з аўстрыйскага горада Граца і яго ваколіц, — і адразу ж пад старажытнымі скляпеннямі загучалі мелодыі вялікага аўстрыйца Моцарта. Затым адбылося асвячэнне галоўнага алтара, у якім пачэснае месца занялі скульптуры святых апосталаў Пятра і Паўла. І ўрэшце — укаранаванне самога абраза. На выхадзе яго выявы раздаваліся ўсім прысутным.

Што ж датычыцца самога абраза, то ён прынцыпова розніцца ад тых, што былі ў Беларусі ўкаранаваны раней. Там — творы сакральнага мастацтва з даўняй гісторыяй, а тут — твор, намаляваны сучасным італьянскім мастаком-іканапісцам для Дома святой Марты ў Ватыкане. Копію з яго Ян Павел II асвяціў перад храмам святога Пятра, а потым перадаў для Беларусі, для мінскай катэдры. Галаву Маці Божай акаляюць зорачкі, а ад рук яе струменяцца промні ласкі.

Пад канец урачыстасці кардынал Казімір Свёнтак выказаў падзяку Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку за дзяржаўную дапамогу ў рэстаўрацыі касцельных фрэсак, раней прыкрытых тынкам. Ад імя ўлад са змястоўнай прамовай выступіў старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Станіслаў Буко, які гаварыў пра значнасць падзеі і прыязныя ўзаемаадносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі канфесіямі. Вернікаў таксама віталі папскі нунцый у Беларусі архібіскуп Марцін Відовіч, пробашч катэдральнага касцёла Антоній Клімантовіч і іншыя.

На працягу ўсёй урачыстасці я прабываў у стане асаблівага ўзрушэння. Бо ўвесь час прыгадвалася, як у пачатку 1990-х гадоў, пасля высялення з касцёла спартсменаў і перадачы будынка вернікам, уваходзіў у склад камісіі, што займалася аднаўленнем святыні. У ёй поплеч дружна працавалі Казімір Свёнтак, які тады яшчэ не быў кардыналам, прадстаўнікі міністэрстваў і грамадскіх арганізацый, беларускія і польскія спецыялісты. Многа спрачаліся, якім быць гэтаму касцёлу і адначасова выдатнаму помніку барочнай архітэктуры, — такім, якім яго пабудавалі ў пачатку XVIII стагоддзя езуіты, ці такім, якім ён стаў пасля шматлікіх пераробак, калі яго закрывалі атэісты? Пытанні ўзнікалі прынцыповыя, бо, скажам, пазнейшая падлога размяшчалася на 40 сантыметраў вышэй, чым першая. І ўсё ж рашылі, што там, дзе дазваляюць тэхнічныя магчымасці, трэба аднаўляць святыню такой, як яна выглядала першапачаткова, — памятаецца, я быў паслядоўным прыхільнікам менавіта такога падыходу. Праўда, і мне, і іншым тады не вельмі верылася, што такая складаная рэстаўрацыя можа стаць рэальнасцю.

А вось у час урачыстага каранавання катэдральнага абраза пераканаўся: амаль немагчымае — ажыццявілася. Вядома, драбнейшай работы яшчэ засталося нямала. Але яна па плячу — і спецыялістам, і вернікам.

Мінская катэдра адрадзілася. А ўкаранаванне яе галоўнага абраза ў цэнтральным алтары прыдае гэтаму адраджэнню сімвалічнасць.

Адам МАЛЬДЗІС.

"Міндаў, кароль Літовіі, у дакументах і сьведчаньнях" — кніга як аргумент значнасці гісторыі беларускай дзяржаўнасці

Гісторыя — дзіўная навука. З аднаго боку абапіраецца на факты, а з другога — дае падставу, дзякуючы рознай іх інтэрпрэтацыі, спекуляваць на падзеях. Але ёсць і надзейная, аб'ектыўная аснова — дакумент.

Кніга "Міндаў, кароль Літовіі, у дакументах і сьведчаньнях" (укладанне, падрыхтоўка да выдання, пераклад Алеся Жлуткі), што нядаўна выйшла накладам 250 асобнікаў у выдавецтве "Тэхналогія", якраз і з'яўляецца той крыніцай інфармацыі, зборнікам дакументаў, з якімі не паспрачаешся.

Вялікі князь, першы валадар Вялікага княства Літоўскага, пазней кароль Міндаў (Міндоўг) — асоба, прыцягальная сваёй веліччу і загадкавасцю. Гісторыкі аддалі ёй належнае. Але спецыялісты сцвярджаюць, што па-сапраўднаму цікавасць айчынных навукоўцаў Міндоўг стаў абуджаць не так даўно.

Алесь Жлутка займаўся вывучэннем асобы Міндоўга шмат гадоў. Спачатку гэта была цікавасць, якая пазней перарасла ў навуковы інтарэс. Алесь Жлутка сёння выказвае вялікую падзяку прафесару Адаму Мальдзісу і кажа, што ганарыцца тым, што можа назваць яго сваім настаўнікам. Менавіта пад кіраўніцтвам Адама Мальдзіса А.Жлутка абараніў дысертацыю, працаваў у Скарынаўскім цэнтры, калі напачатку 90-х гадоў пачаў займацца асобай Міндоўга. Дзякуючы яму ж, А.Жлутка змог трапіць у Ватыканскі "таемны" архіў, дзе ўдалося пабачыць і апрацаваць арыгінальныя дакументы. У той час не было магчымасці працаваць на камп'ютэры, таму тэксты перакладаліся, апрацоўваліся, правіліся ўручную. Потым мінуў пэўны час, і рукі не даходзілі да таго, каб узяцца за гэтыя дакументы. Але ў сувязі з 750-годдзем каранацыі караля Міндоўга зноў звярнуўся да іх. Ягоныя пошукі крыніц, што тычыліся асобы Вялікага князя, працягнуліся і ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, дзе даследчык працуе і цяпер.

Такім чынам, А.Жлутка, працуючы ў шэрагу архіваў Еўропы, сабраў, вывучыў, пераклаў з лацінскай мовы дакументальныя крыніцы, што тычацца асобы Міндоўга, а значыць, і Вялікага княства Літоўскага. Першую частку кнігі складаюць дакументы за подпісам Міндоўга. У выпадках, калі ўзнікала сумненне адносна арыгінальнасці, у кнізе ёсць спецыяльныя спасылкі. Другую — 20 дакументаў папы Рымскага, накіраваныя Вялікаму князю. Яны адрасаваныя самому Міндоўгу і людзям, звязаным з ім тым ці іншым чынам. Трэцяя група дакументаў — паведамленні тых, хто ведаў Міндоўга сам ці з расказаў сваіх знаёмых. Частка з іх — сведчанні ў час судовага працэсу 1312 года над Нямецкім ордэнам. Алесь Жлутка не сумняваецца ў іх аўтэнтычнасці з прычыны таго, што яны даваліся паважанымі і вядомымі людзьмі пад прысягай. Тэксты актаў у кнізе друкуюцца з арыгіналаў або ўзнаўляюцца на падставе копій з даданнем розначытанняў.

Да з'яўлення кнігі спрычынілася шмат розных людзей. Яны якраз і прысутнічалі на вечарыне-прэзентацыі кнігі ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Адзін з такіх людзей — першы намеснік начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення, начальнік ўпраўлення па каардынацыі ідэалагічнай работы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Слабадчук, які на час падрыхтоўкі выдання працаваў на дыпламатычнай рабоце ў Латвіі. Ён, выкарыстоўваючы дыпламатычныя каналы, якраз і дапамог Алесю Жлутку трапіць і працаваць у архівах Рыгі. Цяпер Аляксандр Слабадчук кажа, што рады мець дачыненне да выхаду кнігі: "Кожная краіна можа ганарыцца выданнем, створаным на высокім паліграфічным узроўні і прысвечаным слыннай гістарычнай асобе. Менавіта такія кнігі адказваюць на пытанні — хто мы, адкуль мы".

Нават чалавек, далёкі ад гістарычнай навукі, можа высока ацаніць кнігу, бо гэта выданне сапраўды выглядае шыкоўна. А людзі дасведчаныя называюць "Міндава, караля Літовіі, у дакументах і сьведчаньнях" паліграфічным узорам гістарычнага выдання.

Алесь Жлутка не толькі склаў важную для вывучэння гісторыі Беларусі кнігу, якая стане фактаграфічнай крыніцай для вывучэння Вялікага княства Літоўскага, ён таксама стварыў метадычныя рэкамендацыі па выданні лацінамоўных дакументаў, чаго ў Беларусі раней не было. І гэта не дзіва. Алесь Жлутка — адзін з нямногіх навукоўцаў, якія ў нашай краіне працуюць з лацінамоўнымі дакументамі. Дарэчы, ён кажа, што ў кнізе толькі кропля ад таго велізарнага масіву лацінскіх дакументаў, якія захоўваюцца ў архівах Еўропы і тычацца нашай гісторыі.

Юрый Бохан, доктар гістарычных навук, кажучы пра кнігу і ўклад дзейнасці А.Жлуткі ў сучасную гістарычную навуку, адзначыў, што менавіта такога выдання, якое ўключала б у сябе дакументальныя крыніцы, што раскрываюць механізм утварэння ВКЛ, не хапала навукоўцам. І выдадзеная кніга стане падмуркам для новых гістарычных даследаванняў.

Гэта тым больш прыемна, што выкананне названага інтэлектуальнага прадукту зроблена на найвышэйшым узроўні — філалагічным, гістарычным і паліграфічным. Тут вытрыманы ўсе міжнародныя стандарты публікацыі гістарычных крыніц. На гэта асаблівую ўвагу звярнуў гісторык Алесь Груша.

Нельга не адзначыць і палітычнае значэнне кнігі. Гэтае выданне — яшчэ адзін аргумент для прызнання значэння беларускай дзяржавы ў свеце, яе ролі ў еўрапейскай і сусветнай прасторы.

Аскончыць аповед пра новае выданне і яго прэзентацыю хочацца, згадаўшы словы паэта Уладзіміра Някляева пра тое, што дзякуючы вось такім навуковым працам, на свет з'яўляюцца гісторыі накшталт шэкспіраўскіх і караткевічаўскіх, якія ведае ўвесь свет. У. Някляеў успомніў: "Калі Уладзімір Караткевіч пісаў раман "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", ён пастаянна ездзіў у архівы Рыгі, Кіева, Вільнюса. І я тады пытаўся ў Караткевіча, што ж ён так шмат ездзіць? Ён адказваў: "Усялякую прыдумку трэба на нешта паставіць". Кніга, складзеная Алесем Жлуткам, і кнігі яе кшталту — якраз той падмурак, дзякуючы якому з'яўляюцца геніяльныя літаратурныя творы". Такім чынам, сур'ёзнае гістарычнае выданне яшчэ можа вярнуцца да нас у мастацкіх творах і раскрыць якую-небудзь незнаёмую старонку загадкавага свету беларускай даўніны.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКАХ: Алесь ЖЛУТКА; Дзмітрый МІРОНЧЫК, супрацоўнік МЗС і Аляксандр СЛАБАДЧУК.
Фота Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

Кнігарня

Рыхтуецца новая энцыклапедыя

Беларуская энцыклапедыя прыступіла да выдання 6-томнай энцыклапедыі "Рэспубліка Беларусь" на рускай мове.

Яна змесціць звыш 30-ці тысяч артыкулаў. Новая, арыгінальная энцыклапедыя дасць самыя поўныя звесткі пра Беларусь і шматвекавы гістарычны шлях беларускага народа. Чытачы змогуць азнаёміцца з флорай і фаунай краіны, станам эканомікі, культуры, навукі і тэхнікі на розных этапах іх развіцця, прачытаць пра знакамітых асоб. Тут будуць змешчаны звесткі пра народы, што здаўна пражываюць на тэрыторыі Беларусі, — пра рускіх, палякаў, яўрэяў, татараў, літоўцаў, якія ўнеслі свой значны ўклад у развіццё Беларусі, Еўропы ў цэлым.

Асобна будзе прадстаўлена жыццё беларускай эміграцыі. У стварэнні энцыклапедыі бяруць удзел вядучыя вучоныя Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі, Літвы, Польшчы, Украіны і іншых дзяржаў. Выданне плануецца багата ілюстраваць фатаграфіямі, малюнкамі, мастацкімі рэпрадукцыямі, картамі.

Плануецца, што першы том гэтай энцыклапедыі выйдзе ўжо ў канцы гэтага года і будзе складацца з нарыса пра сучасную Беларусь, яе прыроду, насельніцтва, дзяржаўны і грамадскі строй, навуку, культуру, рэлігію, яе вобласці і сталіцу краіны Мінск. І кошт яго даволі даступны — каля 35 тысяч беларускіх рублёў. Навейшы даведнік пра Беларусь ужо на шляху да чытача, як навагодні падарунак. Ён раскажа на адной з моў міжнародных зносін пра народ, які будуе моцную, квітнеючую Беларусь.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

"Голас Радзімы" ў Інтэрнэце
Belarus21.by/gazeta

Ніна ІВАНОВА, старшыня Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі:

"Народная дыпламатыя — лепшы папулярызатар беларускай культуры"

— Ніна Сямёнаўна, Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі сёння літаральна "кіпіць" ад правядзення мноства свят і вечарын. Гэта збег абставін ці таварыства заўсёды працуе так напружана?

— Сапраўды, апошнім часам узрасла цікавасць да нашых мерапрыемстваў, як з боку грамадскасці, так і з боку пасольстваў замежных краін. Нас гэта вельмі радуе. Амаль усе мерапрыемствы праходзяць з удзелам першых асоб дыпламатычных місій, часта яны самі праяўляюць ініцыятыву па правядзенні той ці іншай імпрэзы.

— Скажыце, калі ласка, ці для ўсіх прыцягальны Дом дружбы?

— Жыццё дыктуе свае законы і атрымліваецца, што ў канкрэтнай рабоце ёсць аб'ектыўныя прыярытэты. Па-першае, некаторыя самі актыўна ідуць на супрацоўніцтва. Напрыклад, Пасольства Кітая, таварыства "Беларусь — Кітай" пастаянна супрацоўнічаюць з Домам дружбы, яны плануюць сваю работу на год, але потым яшчэ маюць шмат ініцыятыў, з якімі звяртаюцца да нас, і атрымліваецца, што мы замест чатырох-пяці мерапрыемстваў, якія тычацца Кітая, праводзім іншы раз да 10-15 у год. Ідэй і прапаноў столькі, што іншы раз даводзіцца іх скарачаць, таму што наш Дом дружбы не можа працаваць толькі на адно ці на некалькі таварыстваў. У нас 36 нацыянальных таварыстваў, і мы так ставім задачу, каб кожнае з іх праводзіла адно мерапрыемства ў квартал.

Ёсць яшчэ суб'ектыўныя прыярытэты, яны тычацца славянскіх краін, нашых суседзяў, таму што ёсць шмат падстаў, матэрыялаў, каб падрыхтаваць вечар, імпрэзу. Да прыкладу, калі мы запланавалі вечар, прысвечаны сучаснай прозе і паэзіі Вялікабрытаніі, то аказалася, што цяжка знайсці неабходныя матэрыялы, таму што літаратурныя сувязі перапыніліся ці недастаткова наладжаны, няма па чым працаваць, ды і таварыства "Беларусь — Вялікабрытанія" радзей праводзіць свае мерапрыемствы. А што тычыцца Расіі, Украіны, Балгарыі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, тут якраз поле дзейнасці ў нас шырокае. Мы абапіраемся на напрацаваны папярэднікамі матэрыял, на пераклады паэтаў старэйшага пакалення. Акрамя таго, пасольствы славянскіх краін разумеюць, што гэта важнае звяно ў добрасуседскіх узаемаадносінах і садзейнічаюць арганізацыі выстаў выяўленчага мастацтва, сучаснай літаратуры, перакладаў і гэтак далей.

Тут да месца ўзгадаць Балгарыю, дзе кожны год выходзяць пераклады на балгарскую мову твораў беларускай прозы ці паэзіі і наадварот. Вось нядаўна выйшла "Анталогія беларускай паэзіі" на балгарскай мове, дзе сабраны пераклады класікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і сучасных маладых паэтаў. Вельмі ахвотна перакладаюць у Балгарыі Н.Гілевіча, Л.Дранько-Майсюка, Р.Баравікову, Н.Гальпяровіча, С.Законнікава, В.Іпатаву, А.Вярцінскага. Дзейнасць нашага пасольства, пасольства Балгарыі, таварыства "Балгарыя — Беларусь", нашых партнёраў з Федэрацыі дружбы народаў Балгарыі дае свой плён. Вось і атрымліваецца, што гэтыя таварыствы праводзяць значна больш мерапрыемстваў, чым, скажам, таварыствы "Беларусь — Канада", "Беларусь — ЗША" і некаторыя іншыя.

— Ці мае правядзенне вечарын працяг, нейкія буйныя сумесныя праекты, якія садзейнічаюць далейшаму развіццю двухбаковых адносін?

— Па-першае, кожнае нацыянальнае таварыства мае сваю праграму дзейнасці, у якой аб'яднаны ўсе культуралагічныя аспекты: літаратурны, выяўленчы, выступленні творчых калектываў, фотавыстаўкі, абмен дэлегацыямі: выкарыстоўваем такую форму работы, як правядзенне комплексных Дзён культуры Беларусі ў адпаведнай краіне. Мы займаемся не толькі папулярызацыяй замежнай культуры ў Беларусі, але ў меру нашых магчымасцей працуем і на папулярызацыю беларускай культуры за межамі Беларусі. Гэтым летам адбыліся Дні Беларусі ў Францыі. У розных рэгіёнах пабываў наш творчы калектыў "Вокс Арыенс", былі наладжаны фотавыставы, выставы прыкладнога мастацтва, якія пераканаўча паказалі, што ёсць краіна Беларусь, яе самабытная культура, людзі са сваім менталітэтам, са сваім светапоглядам. Такімі акцыямі стараемся выклікаць цікавасць у нашых замежных сяброў і тых, хто нас не ведае. Партнёрам у рэалізацыі гэтага праекта ў Францыі стала асацыяцыя ўрачоў "Аліса", якая займаецца гуманітарнай дапамогай і медыкаментамі.

Нядаўна мы пачалі супрацоўнічаць па адукацыйных праектах з нашым пастаянным партнёрам — Нямецкай філасофскай акадэміяй. Атрымліваем невялікія гранты ад урада Германіі для правядзення семінараў з настаўнікамі, выкладчыкамі нямецкай мовы. Такім чынам, прыцягваем новую катэгорыю людзей да народнай дыпламатыі. Для прафесіяналаў вялікае значэнне мае такая стажыроўка. Выкладчыкі прыязджаюць з Германіі, перадаюць сваю методыку, семінары праходзяць не толькі ў Доме дружбы, але і ў вышэйшых навучальных установах. Мы з'яўляемся адным з арганізатараў гэтага праекта. Але ад многіх праектаў даводзіцца адмаўляцца з-за недахопу сродкаў. Нашы партнёры гэта разумеюць і многія ўсе расходы бяруць на сябе. У прыватнасці, Францыя, Швейцарыя.

У нас ёсць нацыянальныя таварыствы, якія прадметна займаюцца маладзёжнымі праграмамі. Мы акцэнтуем увагу на моладзі не толькі тады, калі праводзім нашы мерапрыемствы: студэнты, якія займаюцца ў творчых навучальных установах, такіх як Акадэмія музыкі, — пастаянныя ўдзельнікі нашых імпрэз. Аднак зараз вырашылі актывізаваць маладзёжны абмен. Гэта робяць, напрыклад, два клубы: "Майнц — Мінск" і "Бон — Мінск" з Германіі, якія ахвотна прынялі маладых беларусаў. Сумесна былі праведзены міжнародныя канферэнцыі па маладзёжных праблемах. А цяпер мы рыхтуемся прыняць у сябе маладых людзей з Германіі: 24 снежня прыязджае група моладзі з Бона. Рассяляць маладых людзей будзем па нямецкамоўных сем'ях, а агульныя мерапрыемствы з удзелам таварыства "Беларусь — Германія" пройдуць у Доме дружбы. Так знаходзім выйсце для сябе — гэта праграма мала каштуе, але многа значыць. Цяпер распрацоўваем азнаямляльныя маршруты для нямецкай моладзі: экскурсіі, знаёмства з найпрыгажэйшымі куткамі нашай краіны, з архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі. А ў сем'ях яны пазнаёмяцца з нашай побытавай культурай. Такія кантакты могуць мець працяг.

— Ці праводзяць у вас вечарыны нацыянальныя супольнасці?

— З нацыянальнымі аб'яднаннямі мы працуем у цесным кантакце. Зараз падрыхтавалі выставу па Латвіі, запрасілі беларускіх латышоў. Таварыства "Беларусь — Украіна" працуе ў цесным кантакце з "Ватрай", з іншымі аб'яднаннямі ўкраінцаў у Беларусі. Асобнай праграмы з нацыянальнымі меншасцямі ў нас няма, для гэтага ёсць іншыя структуры. Рады любой ідэі, любому чалавеку, які з'яўляецца носьбітам пэўнай нацыянальнай культуры.

Што тычыцца пашырэння звестак пра адметнае ў беларускай культуры, тут таксама ў нас ёсць свой накірунак. Звяртаемся да замежных партнёраў з прапановамі ўключыць знамянальныя даты ў праграмы дзейнасці. З нагоды 120-годдзя Янкі Купалы, Якуба Коласа ўсе нашы партнёрскія арганізацыі правялі па некалькі мерапрыемстваў, прысвечаных класікам беларускай літаратуры. У гэтым годзе шырока адзначаецца 100-годдзе Петруся Броўкі. Нашы партнёры ва Украіне, у Расіі правялі ўрачыстасці, прысвечаныя гэтай даце. Такім чынам мы стараемся стымуляваць прапаганду беларускай культуры. Партнёры ў Германіі, Францыі ў свае праграмы запрашаюць нашы творчыя калектывы, таму што самім ім пакуль складана папулярызаваць беларускую культуру.

З лістапада адбыўся вечар, прысвечаны 100-годдзю П.Броўкі, на якім дыпламаты чыталі вершы П.Броўкі на сваіх мовах. Лічу, што вельмі важна такім чынам супрацоўнічаць з пасольствамі, папулярызаваць беларускія літаратурныя набыткі.

— У 2006 годзе Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі адзначыць 80-годдзе сваёй дзейнасці. Якія мэты былі ў таварыства ў тыя далёкія часы? Ці змяніліся задачы, напрамкі дзейнасці?

— У 2006 годзе ў нас двайны юбілей. Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі будзе адзначаць 80-годдзе сваёй дзейнасці, а Дом дружбы — 50-годдзе, таму што таварыства было ўтворана ў 1926 годзе, а Дом дружбы пабудаваны для гэтай грамадскай арганізацыі ў 1956-м. За гэты час мэты, задачы дзейнасці таварыства не змяніліся, і мы лічым, што гэта добра, таму што традыцыі, якія закладзены нашымі папярэднікамі, выклікаюць цікавасць і зараз. Развіццё народнай дыпламатыі, папулярызацыя беларускай культуры — такую мэту вызначылі ў 1926 годзе Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Міхась Чарот і іншыя арганізатары стварэння таварыства. Што можна дадаць? Вядома, мы прараслі нейкімі новымі праграмамі. Некалі нашы папярэднікі не маглі марыць аб такой праграме, як "Ад сям'і — да сям'і". Можа ўмовы былі не тыя, ці не прыйшла такая ідэя. Мы вельмі актыўна выкарыстоўваем яе і лічым, што яна вельмі важная. Прымаем французаў, немцаў і ўсе яны жывуць у сем'ях: такія кантакты найбольш дакладна даюць уяўленне аб традыцыях, культуры, сённяшніх дасягненнях і праблемах.

Ідэя параднення гарадоў з'явілася ў 70-я гады, але сістэмна мы сталі ёю займацца з 1995-га. Жыццё штурхае да пошуку новых форм, мы выбіраем тое, што адпавядае часу. Цяпер дзейнічаюць беларуская асацыяцыя пародненых гарадоў, праўленне асацыяцыі. Узначальвае гэту асацыяцыю мэр горада Мінска Міхаіл Якаўлевіч Паўлаў, які надае вялікае значэнне працэсу параднення гарадоў. Ён разумее, што чым больш кантактаў будзе ў кіраўнікоў, у лідэраў мясцовага самакіравання, тым больш вопыту цывілізаванага, еўрапейскага будзе ўкараняцца ў нашу сістэму, тым лепш гэтая сістэма будзе працаваць.

— Дзякую за размову і поспехаў вам.

Гутарыла
Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

Кансультацыя

У Латвіі сустрэліся консулы 23 дыпмісій Беларусі

Консулы беларускіх замежных устаноў у еўрапейскіх краінах абмеркавалі перспектывы ўзаемадзеяння.

Рэгіянальнае пасяджэнне консульскіх супрацоўнікаў замежных устаноў Беларусі, акрэдытаваных у еўрапейскіх краінах, адбылося ў пасольстве нашай краіны ў Латвіі. У ім прынялі ўдзел намеснік міністра замежных спраў Беларусі Аляксандр Герасіменка, Часовы Павераны у справах нашай краіны ў Латвіі Валерый Доўгань, консульскія супрацоўнікі 23 дыпмісій і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

Як паведамілі ў прэс-службе МЗС, галоўнымі мэтамі пасяджэння былі падвядзенне вынікаў консульскай дзейнасці беларускіх замежных устаноў у бягучым годзе, вывучэнне практычнага вопыту і абмен інфармацыяй па асноўных накірунках консульскай працы.

Таксама абмеркаваны перспектывы развіцця консульскай службы Беларусі, шляхі каардынацыі працы ва ўмовах пашырэння зоны дзеяння Шэнгенскай дамовы. У цэнтры ўвагі знаходзіліся і перспектыўныя накірункі візавай палітыкі нашай краіны, шляхі ўдасканалення дагаворна-прававой базы па консульскіх пытаннях, практыка ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання з консульскай службай Беларусі.

Польшча ўвяла страхаванне для іншаземцаў

З 1 снежня польскія пагранічнікі сталі правяраць наяўнасць грошай у іншаземцаў.

У адпаведнасці з распараджэннем міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі іншаземец, які заязджае на тэрыторыю Польшчы, на пакрыццё выдаткаў на жыхарства, харчаванне, праезд і выезд з польскай тэрыторыі павінен мець не меней 100 злотых на кожны дзень знаходжання альбо эквівалент у замежнай валюце (каля 30 долараў). Для пакрыцця выдаткаў на лячэнне ў яго таксама павінна быць 300 злотых на кожны дзень знаходжання альбо эквівалент у замежнай валюце (каля 90 долараў).

Гэтыя патрабаванні не крануць тых, хто мае страхавы паліс, сапраўдны на тэрыторыі Польшчы, альбо арыгінал запрашэння, адпаведнага патрабаванням польскага заканадаўства.

Уводзіцца дэкларавание на мяжы Латвіі

З 1 студзеня 2006 года пры перасячэнні мяжы Латвійскай Рэспублікі, якая з'яўляецца таксама знешняй мяжой Еўрапейскага Саюза, неабходна будзе дэкларваць наяўныя грашовыя сродкі, якія перавышаюць 10 тысяч еўра (7 028 латаў).

Дэкларваныя грашовыя сродкі будуць пералічвацца ў еўра. Фізічныя асобы пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы Латвіі павінны будуць пісьмова запоўніць бланкі дэкларацый на латышскай, англійскай ці рускай мове і падаць іх работнікам мытні ці пагранічнай аховы. Тыя, у сваю чаргу, будуць надзелены правам правяраць адпаведнасць указанай у дэкларацыі сумы фактычнай колькасці грошай.

За парушэнне патрабаванняў аб дэкларванні наяўных грашовых сродкаў будзе прадугледжаны грашовы штраф у памеры да 200 латаў (каля 380 долараў ЗША).

Падрыхтавала
Настасся САМУСЕНКА.

Бурштынавая і брыльянтавая Малькаўка

4 верасня 2005 года ў Мінску прайшоў чарговы, чацвёрты з'езд літоўцаў Беларусі, якіх сёння ў нашай краіне налічваецца прыкладна 6,5 тысячы чалавек (без уліку тых, хто мае літоўскія карані ў сваім радаводзе). Большасць з іх пражывае на тэрыторыі Гродзенскай вобласці. Але, напэўна, мала хто ведае пра існаванне літоўскіх паселішчаў на самым усходзе нашай рэспублікі — на Магілёўшчыне.

Пра адну з такіх вёсак — вёску Малькаўка Мсціслаўскага раёна — я павяду расповед. Пісаць пра сваю радзіму — няпростая справа: ёсць небяспека, што не знойдзеш усіх патрэбных слоў, каб раскрыць свае самыя глыбокія пачуцці і ўражанні ад малюнкаў, да болю знаёмых.

...У 80-я гады XIX стагоддзя літоўскія сяляне праз Пазямельны банк выкупілі ў Малькаўцы ўладанне мясцовага пана Георгія Тэрміна. Амаль што ўсю набытую зямлю займаў лес: 1 800 гектараў з 2 260. Яшчэ 200 гектараў займалі лугі, і толькі 88 гектараў было зямлі ворыўнай. Літоўцы пачыналі сваю гаспадарку з раскарчоўвання пнёў.

Нават сёння, у XXI стагоддзі, для некаторых жыхароў Малькаўкі цяжка адарвацца ад наседжаных і абжытых месцаў. Паездка ў раённы цэнтр — цэлая падзея. А што казаць пра сялян стагоддзя XIX, якія ў пошуках "новай зямлі" пакідалі сваю радзіму, відаць, ужо не спадзеючыся ўбачыць яе зноў, якія адпраўляліся ў іншае моўнае, культурнае і ментальнае асяроддзе.

Жаданне лепшага жыцця, спадзяванні на ўласныя сілы і малітву ў сэрцах везлі перасяленцы з сабой. Так ад продкаў дасталіся мне старыя малітоўнікі. Я не мог уявіць, дзе маглі друкавацца гэтыя кнігі, калі друкаванне лацінкай на літоўскай мове ў той час было забаронена? Пошукі адказу на гэтае пытанне прывялі мяне ў рэдакцыю "Голасу Радзімы", дзе я даведаўся, што такія кнігі выдаваліся ва Усходняй Прусіі (сучасная Калінінградская вобласць) і затым тайна дастаўляліся ў Літву, адкуль, хутчэй за ўсё, іх і прыхапілі, ад'язджаючы, мае літоўскія прапрадзеды. Магчыма, гэтыя малітоўнікі нёс на сваіх плячах адзін з тых самых кніганошаў, пра якіх напісаў сваё аднайменнае апавяданне Уладзімір Караткевіч. Дарэчы, на старонках сваёй апошняй, выдадзенай пасмяротна ўжо кнігі "Мсціслаў. Эсэ пра гісторыю і людзей адной зямлі" пісьменнік выказаў здзіўленне, сустрэўшы, вандруючы па краю, ахінутую медуніцамі і пчалінымі раямі літоўскую вёску.

На Магілёўшчыне былі і іншыя кампактныя пасяленні літоўцаў — Суслаўка, Сафійск. Але Малькаўка — самае вялікае з іх. У 1933-1934 гадах у вёсцы налічвалася 536 жыхароў. Большыя літоўскія вёскі ва Усходняй Беларусі былі толькі на Віцебшчыне, у Лёзненскім раёне.

Сёння, у эпоху цывілізацыйнага надлому, калі канфлікты і супярэчнасці на нацыянальнай глебе ў некаторых краінах сталі сімваламі часу, я са здзіўленнем і захапленнем разважаю пра тое, як на беларускай зямлі маглі мірна суіснаваць розныя народы, як кожны захоўваў сваю культурную самабытнасць. У акружэнні беларускіх вёсак, сярод якіх сустракаліся буйныя яўрэйскія мястэчкі, за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад Расіі жылі літоўцы...

Цэментуючымі фактарамі літоўскай самасвядомасці, вядома, з'яўляліся мова і каталіцкае веравызнанне. Малькаўцы кожную нядзелю збіраліся на службу ў касцёле Сэрца святога Езуса ў Расне, мястэчку, вядомым з XIV стагоддзя, дзе да 1942 года жылі яўрэі, з якімі літоўскія сяляне актыўна вялі гандаль. Арганістам у касцёле быў мясцовы літовец Казімір Віжыніс. "Музыку аргана нагадвае ціхі пошум бяроз..." — такі шчымлівы надпіс цяпер на яго магіле. У 1932 годзе касцёл у Расне быў зачынены і ператвораны ў клуб. Тады літоўцы сталі маліцца ў найбольш умяшчальных хатах. Самі хрысцілі дзяцей, адпявалі нябожчыкаў...

Часта мяняючы месца дыслакацыі, збіралася вечарамі таксама моладзь. Беларусы прыходзілі на літоўскія вячоркі, літоўцы — на беларускія. Я не магу ўспомніць, каб мне аднавяскоўцы расказвалі гісторыю, дзе яны скардзіліся б на які-небудзь нацыянальны ўціск з боку карэнных жыхароў. Наадварот: літоўцы выклікалі ў іх павагу.

У 1920-я гады Малькаўцы як буйному пасяленню літоўцаў у Беларусі быў нададзены статус нацыянальнай вёскі. Калгас, які ўзнік у 1929-1930 гадах, пазней насіў імя В. Міцкявічуса-Капсукаса, вядомага літоўскага камуніста. У вёсцы працавала літоўская хата-чытальня, дзейнічала няпоўная сярэдняя сямікласная школа. Поўную сярэднюю адукацыю на літоўскай мове можна было атрымаць у вёсцы Дзіманова Лёзненскага раёна, дзе вучыліся літоўцы не толькі з Беларусі, але і з Расіі. 1936/1937 навучальны год стаў годам першага і апошняга выпуску вучняў, якія пачыналі навучанне ў Малькаўцы па-літоўску. У 1938 годзе ўсе літоўскія школы былі зачынены.

Рэпрэсіі 30-х гадоў закранулі вёску. Так, дакладна вядома пра тое, што каля дзесяці малькаўцаў былі расстраляны ў кар'еры насупраць магілёўскага мясакамбіната. Сіратой засталася малая дзяўчынка Валянціна Юшкаўскене — першы старшыня клуба "Бяржынас", які аб'яднаў цяпер у Літве выхадцаў з Малькаўкі. Пазней яе бацькі былі рэабілітаваны.

Многія малькаўскія вучні працягнулі адукацыю і змаглі рэалізаваць сябе потым у самой Літве. Так, Іосіф Захараўскас працаваў намеснікам міністра адукацыі Літ.ССР, а Іосіф Манюшыс стаў нават прэм'ер-міністрам Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Малькаўка заўсёды была літоўскамоўнай вёскай. У сваіх сем'ях, паміж сабой жыхары размаўлялі выключна па-літоўску. Мае ўспаміны дзяцінства: бабуля спявае літоўскія песні, а тут адчыняюцца дзверы, і суседка вітаецца: "Гяру дзена" ("Добры дзень") — у Малькаўцы часта віталіся менавіта так, а не вядомым "лабас". Увогуле ж мова ў вёсцы мела свае асаблівасці, пра што ў Санкт-Пецярбургу нашай зямлячкай Марыяй Кіндурытэ-Сівіцкене ў свой час была абаронена кандыдацкая дысертацыя "Літоўская гаворка ў беларускім асяроддзі (Гаворка вёскі Малькаўка ў БССР)". Часам мовы блыталіся. Да прыкладу, жанчына купляла хустку ў краме так: "Колькі каштуе тая скарала?".

У час Другой сусветнай вайны многія з вяскоўцаў загінулі, асабліва калі фронт стаяў на рацэ Проня — там ішлі вельмі крывавыя баі. Сваякі распавядалі мне, што калі праз вёску ішлі савецкія салдаты і папрасілі ў аднаго старога дзеда якую-небудзь адзежыну, той аддаў усю мужчынскую вопратку, якая была ў хаце, пакінуўшы толькі тое, што было на ім. Калі, адступаючы, немцы спалілі блізкія да Малькаўкі вёскі, то вяскоўцы прынялі да сябе іх жыхароў.

Літоўцы Беларусі перагарнулі ўсе трагічныя старонкі нашай гісторыі разам з беларусамі.

Амаль кожны з сённяшніх малькаўцаў мае родных у Літве. У 1990-я гады яны часта рабілі супольныя паломніцтвы на сваю малую радзіму. Аказваецца, што кусты бэзу і дзічкі на месцы былога хутара могуць з'яўляцца моцным магнітам, які прымушае чалавека пераадолець сотні кіламетраў. Нашы землякі не забываюць пра Беларусь. Не можа не радаваць тое, што, прыязджаючы, яны спяваюць песні "Песняроў" або дэкламуюць вершы Яўгеніі Янішчыц. Беларусь засталася ў іх сэрцах. У 2004 годзе ў Вільнюсе выйшла кніга "Святло малькаўскіх бяроз". Яна складаецца з чатырох частак: гісторыя вёскі, успаміны аднавяскоўцаў, вершы і мініяцюры пра Малькаўку, мясцовы літоўскі фальклор.

Апошнім часам у вёску зачасцілі журналісты як з Беларусі, так і з Літвы. Але малькаўцаў тут засталося ўжо няшмат.

Сонца ў Малькаўцы робіць жыта спелым, а лета — бурштынавым. Увечары яно апускаецца акурат у самыя вершаліны бяроз на могілках. Увогуле бярозы абступілі вёску з усіх бакоў. Апошнія літоўскія хаты патанаюць у бярозавых гаях. Калі я ад'язджаю з вёскі, заўсёды іду сюды, на старыя могілкі, і калі я іх пакідаю, мне ўслед — як абярэг — нібы працягваюць свае рукі-крылы мае беларускія літоўскія продкі...

А зімой, перад Калядамі і Новым годам, бярозы, як і ўся Малькаўка, становяцца белымі-белымі. Бурштынкі ператвараюцца ў брыльянцінкі. І зззяюць, усяляючы ў сэрцы надзею і веру ў будучыню.

Аляксандр ТАРЭЛКІН,
аспірант Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

НА ЗДЫМКАХ: памяць сабрала ўсіх вяскоўцаў Малькаўкі і яе ўраджэнцаў на могілках; малькаўскія жанчыны на Новы год у Вільнюсе (здымак 50-х гадоў XX стагоддзя).

Самабытнасць Ханукі

У гэтым годзе нерабочы дзень 25 снежня, калі беларускія каталікі адзначаюць Каляды, супаў з пачаткам іудзейскага свята Ханука. Пра гэта свята карэспандэнту "Голасу Радзімы" Валянціне Грышкевіч расказаў нашчадак выхадцаў з Беларусі, прэзідэнт буйнейшай яўрэйскай арганізацыі кантынента — Еўра-Азіяцкага яўрэйскага кангрэсу (ЕАЯК) — Аляксандр МАШКЕВІЧ:

— Больш за дзве тысячы гадоў таму, калі старажытныя ізраільцяне пакутавалі пад прыгнётам грэка-сірыйскіх захопнікаў, іх цар Анціох IV (Епіфан) вырашыў любой цаной насадзіць свае парадкі сярод яўрэяў, пазбавіўшы наш народ сваіх каранёў і традыцый.

Па царскім рашэнні свяшчэнныя скруткі Торы былі канфіскаваны і спалены. Былі забаронены яўрэйскія святы. За парушэнне забароны катавалі і каралі. Тыя, хто адмаўляўся падпарадкоўвацца загадам акупантаў, збіраліся ў партызанскія атрады Макавеяў, якія ўступілі ў бой з іншаземнымі захопнікамі. Пасля доўгай партызанскай барацьбы яўрэі вярнулі сабе свабоду. Святыню нашага народа, Іерусалімскі Храм, трэба было ачысціць ад бруду і брыдоты. І 25 кіслева 3622 года па яўрэйскім летазлічэнні (138 год да нашай эры) Храм быў нанава асвечаны.

Свяшчэнні-коэны павінны былі запаліць агні храмавага каганца — Менары. Але ва ўсім Храме не было дастатковай колькасці рытуальна чыстага (кашэрнага) масла. Пасля доўгіх пошукаў знайшоўся адзіны гладыш з маслам, які быў замацаваны пячаткай першасвяшчэнніка. Масла ў каганцы магло хапіць толькі на суткі. Для таго, каб падрыхтаваць новае масла, патрабавалася 8 дзён. Але ўсё ж было вырашана запаліць Менору, не чакаючы новай порцыі масла. І адбыўся цуд — агонь гарэў 8 дзён. Менавіта цуду, а не ваеннай перамозе, прысвечана надыходзячае свята, і ў гэтыя дні мы запальваем ханукальныя агні.

Акрамя таго, святкуючы Хануку ў нашы дні, мы часта ўспамінаем не толькі пра гісторыю яўрэйства, але таксама выказваем сваю салідарнасць з тымі народамі і дзяржавамі, у тым ліку і з Беларуссю, якія паспяхова абараняюць права на самабытную мадэль дэмакратычнага развіцця, нягледзячы на знешні ціск.

Актуальна

Рэлігійныя арганізацыі ў Беларусі вызвалены ад выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомую маёмасць

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 571 "Аб вызваленні рэлігійных арганізацый ад абкладання зямельным падаткам і падаткам на нерухомую маёмасць".

Як паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, паводле ўказа, зарэгістраваныя ў Беларусі рэлігійныя арганізацыі ўсіх канфесій і накірункаў вызвалены ад выплаты падаткаў на зямельныя ўчасткі, прадастаўленыя ім для ўтрымання або абслугоўвання культавых будынкаў, а таксама на асноўныя сродкі, якія адносяцца да культавай маёмасці.

Ад абкладання падаткам на нерухомую маёмасць вызвалена маёмасць рэлігійных арганізацый, якая можа быць аднесена да асноўных сродкаў і выкарыстоўваецца ў рэлігійных, а не ў гаспадарчых або іншых мэтах. У іх ліку — прадметы храма (алтары, іконы, грабніцы), прадметы, неабходныя для здзяйснення абрадаў і цырымоній (крыжы, харугвы, пацеркі, купелі, набажэнскія ўборы), набажэнская літаратура. Гэтыя прадметы маюць высокую гісторыка-культурную каштоўнасць альбо зроблены з выкарыстаннем каштоўных металаў.

Да ўказа прыкладаецца пералік рэлігійных арганізацый, якія вызваляюцца ад выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомую маёмасць, а таксама пералік асноўных сродкаў, якія адносяцца да культавай маёмасці і не абкладаюцца падаткам на нерухомую маёмасць.

Гэтыя меры дазволяць палепшыць матэрыяльнае становішча рэлігійных арганізацый, якія фінансуюцца выключна за кошт добраахвотных ахвяраванняў вернікаў, актывізаваць іх сацыяльную, асветніцкую і гуманітарную дзейнасць.

БелТА.

Скарбонка

Чытайце "Скарбонку" ў Інтэрнэце
Belarus21.by/gazeta

"ГОСЦІ АД БОГА ЎСЕ КАЛЯДНІЧКІ"

Першае дакладнае ўпамінанне аб язычніцкім святкаванні Каляд з маскамі і пераапрананнем на землях старажытнай Русі знаходзім у летапісах X-XI стагоддзяў. Пасля прыняцця хрысціянства ў 988 годзе царкоўныя ўлады вялі пастаянную барацьбу з усімі язычніцкімі святамі, звычаямі і абрадамі, у тым ліку і з Калядамі. Але, нягледзячы на ўсе намаганні царквы, народныя традыцыі працягвалі існаваць і развівацца. Болей таго, пасля ўсталявання хрысціянскага свята Раджаства было пашырана святкаванне студзеньскіх каляд. З іх пачынаўся Новы год. У выніку гэтага сфарміравалася новая традыцыя — навагодняе зімовае свята, якое атрымала ва ўсіх славянскіх этнасаў назву "каляды". Яны цесна звязаны з хрысціянскім Раджаством.

У гэты ж перыяд на землях Беларусі (XI-XIII стагоддзі), як адзначаюць некаторыя даследчыкі, з'яўляюцца скамарохі, якія ў сваіх выступленнях абапіраюцца на народныя абрады і фальклор таго часу. Вялікай папулярнасцю ў XIV-XVI стагоддзях, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага, карысталіся выступленні батлеечнікаў. У XVII стагоддзі звычай пераапранання ў звярыныя шкуры быў шырока распаўсюджаны ў расійскіх і беларускіх гарадах на святкі (Каляды) і Масленіцу. Самыя забаўныя ўборы пераапранутых нагадвалі мядзведзя, казу, жорава, бабу. На святкі пераапранутыя хадзілі па дамах і з дазволу гаспадароў паказвалі ў смешным выглядзе рухі звяроў і людзей, у якіх яны прыбіраліся. Пасля таго, як пераапранутых абносілі налійкаю і калі яны адыходзілі, дваровыя, паводле звычаю, павінны былі валяць іх у снезе. Маскіраванне на Каляды ў XIX — пачатку XX стагоддзя сустракалася на тэрыторыі Беларусі паўсюдна. Адрозніваліся толькі тэрміны, калі хадзілі маскіраваныя — напярэдадні Каляд і ў першыя тры дні свята, на Шчодры вечар (напярэдадні Новага года), на Васілле — у першы дзень новага года, і нават на Вадохрышча. Былі рознымі таксама склад удзельнікаў абраду і комплексы персанажаў і масак.

У Беларусі сустракаліся маскі, якія прадстаўлялі зааморфных, антрапаморфных персанажаў і міфічных істот. Зааморфныя персанажы — гэта каза (казёл), мядзведзь, кабыла (конь), бусел (жораў, журавель), радзей сустракаліся бык (тур, карова), воўк, ліса, заяц. У масках антрапаморфных персанажаў увасабляліся дзед (старац), баба (старчыха, баба Яга), цыган і цыганка, яўрэй і яўрэйка, афіцэр (салдат, гусар, генерал, гайдук і іншыя), які часцей за ўсё быў у пары з маладзіцай, паніч і паненка, цар або кароль, поп і дзяк, доктар або лекар-аптэкар, пастух, грабаўшчык, плакальшчыца. Міфічныя істоты, што ўдзельнічалі ў калядным маскарадзе, былі прадстаўлены маскамі анёла, шчодры (шчадраца), чорта (д`ябла), смерці, каляды, ведзьмы.

Звычайна ў кожнай хаце імкнуліся як мага лепей адарыць калядоўшчыкаў, бо, паводле народнага меркавання, чым больш шчодрыя дары даць ім, тым больш шчодрым і багатым будзе надыходзячы год. Часцей за ўсё адорвалі хлебам (на Палессі выпякалі спецыяльныя булачкі ці бліны), салам, каўбасамі, арэхамі, зернем, многія давалі грошы і гарэлку. Падарункі складвалі ў мех, які насіў механоша.

Паўсюль на Беларусі бытавала павер'е, што пераапранутыя прыносяць на Каляды ў сям'ю дабрабыт, багаты ўраджай, шчасце, здароўе і забіраюць няшчасце, хваробы, гора. Калядніки былі прадстаўнікамі іншага свету і праз іх тое, што было падаравана, трапляла да ўсіх прадстаўнікоў таго свету, пачынаючы ад Бога і заканчваючы духамі і сіламі прыроды. Уяўленні пра Бога-госця, які ходзіць па зямлі ў чалавечым абліччы, былі ўласцівыя яшчэ ў глыбокай старажытнасці індаеўрапейцам, а ў XIX стагоддзі захоўваліся ў народнай творчасці і свядомасці беларусаў. Калядніку ў песнях і размовах называлі "Госці ад Бога ўсе калядніцкі".

Таццяна КУХАРОНАК.

Народны каляндар

"Студзень — году пачатак"

*1-га студзеня — **працяг Піліпаўкі** ў праваслаўных беларусаў (да 5 студзеня).*

*3-га — **прысвятак Пракоп**, пра які кажуць, што ён "па снегу ступае, дарогу капае". У Віленскай губерні (цяперашнія Гальшаны) некалі бытавала такая прыказка: калі да Каляд застаецца два тыдні, то Каляды яшчэ ў амбары, калі два ці тры дні, то яны ўжо на печцы. Тут мелася на ўвазе збожжа, цеста і калядніки — булачкі, якімі адорвалі калядоўшчыкаў.*

*5-га — **запіс Каляд** у каталікоў.*

*6-га — у праваслаўных **Першая (посная) куцця** — сямейная перадкалядная вячэра. Асноўная абрадавая страва — ячная каша з алеем або мёдам, а таксама аўсяны кісель, жур, узвар (кампот з сухафруктаў), рыба, грыбы ва ўсіх відах (салёныя, смажаныя, поліўка грыбная), бліны з цёртым макам і ўсе астатнія стравы — посныя, пякуць свежы жытні хлеб.*

У каталікоў у гэты дзень на заканчэнне Каляд — Тры Каралі, калядны карнавал.

7-га студзеня — Ражаство, пачатак каляднага мясаеда (які цягнецца да Вялікага посту), народнага святкавання ў гонар зімовага сонцастаяння. З раніцы падаюць стравы з забітага перад Калядамі кабана: сала, смажаную свежаніну з каўбасамі, сальцісон, вантрабянку, крывянку, верашчаку грыбную са скабкамі і каўбасой, халадзец і іншыя, якія ядуць з жытнім хлебам і гароднінай. І абавязкова — бліны, якія гаспадыня складае горкай на льняным ручніку. Моцныя напоі — для дарослых, а дзецям — узвар. Пшанічныя пышныя булкі, рознае печыва завяршаюць святочны пачастунак. Вечарам здзяйсняюць абрад калядавання з каляднай зоркай і спецыяльна прымеркаванымі песнямі. Гурт звычайна суправаджалі музыкі, а механоша збіраў падарункі — сала, каўбасы, хлеб, булачкі, пірагі. Дзяцей частуюць арэхамі і семкамі-гарбузікамі. Моладзь калядным вечарамі збіралася на ігрышчы з танцамі. На Поазер'і спраўляюць гульню "Жаніцьба Цярэшкі". Даўней у вёсках і гарадах наладжвалі народны лялечны тэатр у двухпавярховай скрынцы — батлейку, якая сёння адраджаецца ў школьным асяроддзі.

*8-га — **працяг Каляд**. Калядаванне (Дзед з Казой, Баба, Цыган з Кабылай, Цыганка з дзіцем, Мядзведзь, Жораў або Бусел. Такія ж персанажы з'яўляюцца ў навагоднюю ноч падчас абраду шчадравання). Жанчыны ў гэты дзень даўней варылі кашу і пяклі аладкі, частавалі імі бабуль-пупарэзніц.*

*9-га — **Сцяпан**, дзень найму батракоў у мінулым.*

*13-га студзеня — **Шчодрая куцця**, абрадавая перадна­вагодняя скаромная вячэра з багаццем страў, якіх павінна быць не менш, як 12. Перад вячэрай клічуць Мароза куццю есці. Ноччу і да раніцы здзяйсняюць абрад шчадравання са спецыяльна прымеркаванымі да яго песнямі, карнавалам, гульнямі.*

*14-га — **Новы год па старым стылі**. Раніцай шчадруюць дзеці, здзяйсняючы абрад засявання (сыплюць у хаце жыта, віншуюць з Новым годам).*

*18-га студзеня — **Пісаная Каляда**, завяршальны дзень Каляд: на сценах будынкаў пісалі крыжы, акраплялі іх асвечанай у царкве вадой. Пасля абеду ішлі на работу, таму шмат дзе гэты дзень называецца Паабед-Каляда. Вечарам спраўлялі сямейную посную вячэру-куццю.*

*19-га — **Вадохрышча**. Высцілалі дарогі яловымі лапкамі, рабілі крыж з лёду на рэках і азёрах, святары асвячалі ваду ў іх, якая лічылася гаючай — яе захоўвалі цэлы год ад хвароб людзей і свойскай жывёлы.*

*20-га — **Прывадахрышча**, заканчэнне святкавання Каляд. З гэтага дня і да Масленіцы — Малая вясельніца. У некаторых рэгіёнах 21 студзеня лічыцца Провадамі Каляд.*

*31-га студзеня — **Апанасся**. Гусінае свята. З гэтага дня гусей кормяць зярнятамі ў абручыку. Святы Апанасій лічыцца абаронцам жывёлы ад марозу.*

Пабудуйце лазню!

Жыхчанін Міхаіл Сцяпанавіч Дзмітрэнка нарадзіўся ў вёсцы Мохаў Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці. У наступным годзе ён адзначыць сваё 80-годдзе. 32 гады працаваў на Мінскім радыёзаводзе, атрымаў званне "выдатніка якасці" як рэгуліроўшчык радыёапаратуры. А калі пайшоў на пенсію, грымнула чарнобыльская бяда, якую ўспрыняў з болем у душы. Не толькі таму, што яго родная Лоеўшчына моцна пацярпела, а таму, што чалавек ён па натуры мяккі і добрасардэчны, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, моцнага характару, дзейсны і бескарыслівы. Усвядоміўшы памеры катастрофы і небяспеку для людзей, захацеў дапамагчы ў першую чаргу землякам і адправіўся ў Лоеў.

У райвыканкаме ён прапанаваў перш за ўсё сваю дапамогу ў будаўніцтве лазняў. Зусім слушна і своечасова ўзняў гэты просты чалавек праблему, якую можна было вырашыць. Аднак мясцовыя чыноўнікі яго не зразумелі, палічыўшы, што ў земляка з галавой не ў парадку. На знявагі не звяртаў ніякай увагі, а напісаў ліст Гарбачову, пасля якога яго ўжо не чапалі, але і не дапамаглі ў рэалізацыі ідэі. Дарэчы, гэта была рэкамендацыя медыкаў, якую проста ніхто не думаў выконваць — людзям, якія жылі і працавалі ў зоне радыеактыўнага забруджвання, неабходна было часцей змываць небяспечны для здароўя пыл. Тады Міхаіл Сцяпанавіч паехаў у родную вёску і на свае грошы і па свайму праекту збудаваў перасоўную лазню на беразе возера — мыйцеся, землякі, бясплатна і на здароўе! У вёсцы яго празвалі "Дзед — поле цудаў". Ёсць такая тэлевізійная гульня, удзельнікі якой атрымліваюць дарагія падарункі.

Міхаіл Сцяпанавіч марыў і дагэтуль марыць пра тое, каб такая эфектыўная і простая лазня была ў кожнай вёсцы, у першую чаргу ў тых раёнах, якія маюць павышаны радыяцыйны фон. Ён удасканаліў топку-кацёл і гатовы быў яе тыражаваць. Работнікі Мінскай ТЭЦ-4 з адходаў вытворчасці дапамаглі яму зрабіць топкі, якія адправілі ў Лоеўскі і Хойніцкі раёны.

У свой час спецыяльна цікавіўся, колькі ж лазняў у Лоеўскім раёне. Галоўны санітарны ўрач у 1992 годзе публічна ў раённай газеце назваў колькасць грамадскіх лазняў — іх было ўсяго 26! Прычым, частка з іх не працавала, што спецыяліст лічыў недаравальным. Таму прапанову Міхаіла Сцяпанавіча — забяспечыць кожную вёску таннай перасоўнай лазняй — трэба лічыць слушнай для свайго часу, калі адбылася чарнобыльская аварыя. Пагаджаюцца з ім спецыялісты і зараз, пра што сведчыць адказ начальніка Упраўлення па справах інвестыцый і будаўніцтва Мінсельгасхарча Рэспублікі Беларусь В.Пашкевіча ад 12 сакавіка 2005 года:

"Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання яшчэ раз уважліва разгледзела вашу рацыяналізатарскую прапанову па будаўніцтве ў сельскай мясцовасці экалагічна чыстых лазняў па прапанаванай вамі канструкцыі і падтрымлівае ваша меркаванне, што будаўніцтва такіх лазняў асабліва актуальна пры разглядзе распрацаванай праграмы "Адраджэнне вёскі"... У ёй вызначаны заданні па будаўніцтву і рэканструкцыі сельскіх лазняў.

Урадам пытанні будаўніцтва такіх аб'ектаў і іх далейшая эксплуатацыя перададзены ў вядзенне органаў выканаўчай улады на месцах. Толькі ў кампетэнцыі раённых і абласных выканкамаў знаходзіцца пытанне выбару праекта, па якому будаваць тую ці іншую сельскую лазню.

З павагай да вас, сапраўднага патрыёта нашай Беларусі!"

Зараз Міхаіл Сцяпанавіч прыводзіць у жыццё новы праект: разам з настаўнікамі-энтузіястамі хоча навучыць школьнікаў старэйшых класаў будаваць лазні. Сам ён — прыклад здаровага ладу жыцця: правільна харчуецца, дастаткова рухаецца і раз у тыдзень абавязкова парыцца ў лазні.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.
НА ЗДЫМКУ: Міхаіл ДЗМІТРЭНКА.

Расія

"УРАДЖАЙНАЯ ВОСЕНЬ" МАСКОЎСКІХ БЕЛАРУСАЎ

Снежань — час падводзіць вынікі мінулага года. Што датычыць маскоўскіх беларусаў, то 2005 год быў для іх вельмі шчодрым на падзеі. Найбольш "ураджайнай" была, безумоўна, восень. З некаторымі мерапрыемствамі кастрычніка—снежня нас пазнаёміла член Савета РНКА "Беларусы Масквы" Тамара ЯШЫНА.

МАСКВА ЎБАЧЫЛА "БЕЛАРУСКУЮ ЭКЗОТЫКУ"

Па ініцыятыве грамадскіх аб'яднанняў беларусаў Масквы ў Маскоўскім доме нацыянальнасцей адбылася фотавыстава "Беларуская экзотыка", якая дала магчымасць усім жадаючым завочна здзейсніць цікавае падарожжа па Беларусі.

Дзякуючы таленту і своеасаблівому погляду, беларускі фотамастак Сяргей Плыткевіч паказаў, як многа незвычайнага ёсць у звычайным беларускім асяроддзі: вёсках, лясах, пералесках, а таксама ў мясцінах, амаль не закранутых цывілізацыяй — Белавежскай пушчы, Прыпяцкім, Браслаўскім, Нарачанскім нацыянальных парках, Бярэзінскім біясферным запаведніку...

Старажытныя замкі, велічныя руіны палацаў, незвычайная прырода, сардэчныя людзі і вечныя каштоўнасці — такая яна, цудоўная краіна Беларусь.

АДКРЫТА ПАМЯТНАЯ ДОШКА МАЗУРАВУ

Актыў РНКА "Беларусы Масквы" і супрацоўнікі Пасольства Беларусі ў Расіі прынялі ўдзел у адкрыцці памятнай дошкі, якая была размешчана ў Маскве, на доме № 15 па вуліцы Спірыдонаўка, дзе апошнія гады жыў вядомы савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну — Кірыл Трафімавіч Мазураў.

Ініцыятарамі адкрыцця памятнай дошкі выступілі маскоўскія ветэраны — удзельнікі вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адным з аўтараў з'яўляецца член Савета РНКА "Беларусы Масквы", намеснік Галоўнага архітэктара горада Масквы Ю.П. Грыгор'еў.

БЕЛАРУСКАЕ ПАЭТЫЧНАЕ СЛОВА Ў МАСКВЕ

Намаганнямі РНКА "Беларусы Масквы" і Цэнтральнай грамадскай бібліятэкі імя М.Някрасава 2 снежня быў праведзены вечар сучаснай беларускай паэзіі.

Ільняная і жытнёвая.
Сялянская.
Бравая ў казачнай красе.
Старажытная.
Ты самая славянская.
Светлая, як травы у расе.
Вобразная, вольная, пявучая,
Мова беларуская мая!

Менавіта з гэтых паэтычных слоў Пімена Панчанкі пачалося мерапрыемства, на якім на працягу амаль трох гадзін гучалі ўспаміны пра "куточак запаветны, дзе растуць, нібы грыбы, здаўна паэты", вершы беларускіх паэтаў і беларускія мелодыі.

Свае новыя творы прачыталі Іван Карэнда і Алесь Пісарык, а намеснік старшыні Савета РНКА "Беларусы Масквы" Раман Чырвонцаў і паэтэса Любоў Турбіна пазнаёмілі прысутных з паэтычным словам Анатоля Сыса.

Прагучалі рамансы ў выкананні аўтараў — паэтэсы Любові Церахавай і саліста Маскоўскай абласной філармоніі, кампазітара Аляксандра Спірыдонава. Ураджэнка Віцебска народная артыстка Расіі Святлана Дзяцел выканала песні на беларускай і рускай мовах, а студэнт Антон Андруховіч — кранаючы за сэрца твор "Не прадавайце дом бацькоў!".

Добрыя ўражанні засталіся ад знаёмства з работамі "Славянскія матывы" мастака Леаніда Феадора, якімі была ўпрыгожана зала.

Нягледзячы на снежаньскі мароз, вечар атрымаўся цёплым і сардэчным.

ПЯЮ ВАМ, БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ!

25-годдзе сваёй творчай дзейнасці адзначыла цудоўная спявачка і даследчык народнай песні народная артыстка Расіі Ларыса Трухіна.

Дзяцінства і юнацтва артысткі прайшлі на Гомельшчыне, дзе яна ўсім сэрцам палюбіла народную песню і сардэчных працавітых беларусаў.

Ларыса Трухіна лічыць, што ў беларусаў і расіян агульнае духоўнае багацце, якое трэба берагчы і мацаваць. Таму спявачка даражыць сваімі сувязямі з радзімай і суайчыннікамі, шчодра дзеліцца сваімі ведамі пра беларускую песню і народныя традыцыі, актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах, што праводзяць маскоўскія беларусы.

На канцэрце, які адбыўся ў Дзяржаўнай цэнтральнай канцэртнай зале "Расія", спявачцы была ўручана Ганаровая грамата Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь "за актыўную дзейнасць па прапагандзе, захаванні і развіцці беларускай культуры ў Расійскай Федэрацыі, вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне сяброўскіх адносін паміж народамі Беларусі і Расіі і актыўны ўдзел у дзейнасці Рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі".

ВЫЙШЛА НОВАЯ КНІГА АЛЕСЯ КАЖАДУБА

Маскоўскія беларусы не толькі ў ліку першых пазнаёміліся з новымі творамі члена саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі Алеся Кажадуба, але і пазнаёмілі з імі жыхароў Масквы.

Пісьменнік нарадзіўся ў 1952 годзе ў горадзе Ганцавічы Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта настаўнічаў у Лагойскім раёне, працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа Акадэміі навук БССР, рэдактарам літаратурна-драматычных праграм рэспубліканскага тэлебачання, літсупрацоўнікам аддзела публіцыстыкі часопіса "Маладосць". З 1990 года жыве і працуе ў Маскве. Зараз ён галоўны рэдактар выдавецтва "Савецкі пісьменнік" і адначасова намеснік галоўнага рэдактара беларуска-расійскай газеты "Лад", а таксама актыўны член РНКА "Беларусы Масквы".

Абмен уражаннямі аб кнізе "Палёты ў мінулае" адбыўся ў Маскоўскім Доме нацыянальнасцей, куды былі запрошаны вядомыя пісьменнікі, літаратурныя крытыкі і аматары сучаснай прозы.

Удзельнікі мерапрыемства адзначылі, што Алесь Кажадуб — незвычайная з'ява ў сучаснай прозе. Яго творы вылучаюцца вобразнасцю і паэтычнасцю, цікавым сюжэтам і характарамі, асобым гумарам і каларытам.

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ. БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ...

20 снежня Савет РНКА "Беларусы Масквы" пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь і Маскоўскага дома нацыянальнасцей правёў вечар, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

У праграме вечара — паказ дакументальнага фільма, выступленні перакладчыкаў і паклоннікаў творчасці гэтага цудоўнага беларускага пісьменніка, а таксама знаёмства з кнігай "Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду.", якая выйшла ў свет у выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў бягучым годзе.

Я сумую па радзіме,
Як каханы па дзяўчыне,
Я жадаю ўвесь прыпасці
Проста да яе рукі,
Да грудзей — тугіх узгоркаў,
Да вачэй — азёраў сініх,
І замерці ў пацалунку
На гадзіны і вякі.

Гэтыя паэтычныя радкі У.Караткевіча дарагі як беларусам, так і ўсім, хто знаходзіцца за межамі радзімы, але неразрыўна заязаны з ёю навекі.

Сустрэча маскоўскіх беларусаў і аматараў творчасці Уладзіміра Караткевіча атрымалася сардэчнай і плённай.

Польшча

У Беластоку адбыўся XV з'езд Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы

На з'ездзе асноўная ўвага была нададзена падсумаванню вынікаў працы адной з буйнейшых арганізацый беларускай меншасці ў Польшчы, а таксама вызначэнню далейшых накірункаў у яе дзейнасці. Асаблівая ўвага была нададзена арганізацыі мерапрыемстваў у сувязі з 50-годдзем БГКТ, якое будзе адзначацца ў лютым 2006 года.

Ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на адкрыцці з'езда беларускаму паэту Польшчы Віктару Шведу паслом Беларусі ў Польшчы быў уручаны медаль Францыска Скарыны. В.Швед адзначаны ўзнагародай Беларусі за шматгадовую актыўную дзейнасць па папулярызацыі твораў беларускай літаратуры ў Польшчы, вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне беларуска-польскіх культурных сувязей і ў сувязі з 80-гадовым юбілеем.

Паслом Беларусі былі выказаны словы ўдзячнасці за актыўную дзейнасць Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў справах падтрымкі развіцця беларускай культуры і адукацыі ў Польшчы. Былі зачытаны віншавальныя лісты з нагоды з'езда ад імя міністраў культуры і адукацыі, старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі, старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Дэлегаты з'езда выказалі ўдзячнасць за падтрымку, якую аказвае Беларусь у дзейнасці таварыства. За 4-гадовы справаздачны перыяд у розных культурных мерапрыемствах БГКТ прынялі ўдзел больш за 50 творчых калектываў з Беларусі. Усяго Таварыствам за справаздачны перыяд праведзена каля 300 беларускіх культурных і асветніцкіх мерапрыемстваў, на якіх прысутнічала каля 260 тысяч гледачоў.

На з'ездзе адбыліся перавыбары кіраўніцтва БГКТ. На чарговы 4-гадовы перыяд Старшынёй Галоўнага праўлення БГКТ аднагалосна выбраны Ян Сычэўскі.

Падрыхтавала Алена СПАСЮК.

Аўтограф

Медаль Скарыны

У 2005 годзе гэту пачэсную ўзнагароду атрымалі наступныя нашы суайчыннікі: сустаршыня Цюменскага нацыянальна-культурнага таварыства "Беларусь" Уладзімір Шугля — за значны ўклад у развіццё гандлёва-эканамічных і культурных сувязей паміж Беларуссю і Расіяй; беларускі паэт ў Польшчы Віктар Швед, старшыня аб'яднання грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей Латвіі "Садружнасць" Мікалай Буры і старшыня Саюза беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова...

Сёння мы прадстаўляем чытачам мастака Віктара МАКАРЧУКА, па эскізу якога быў выраблены гэты медаль. З ім гутарыць наш карэспандэнт Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

— Віктар Аляксеевіч, раскажыце, калі ласка, пра свой творчы шлях.

— Я скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут, аддзяленне графікі, у 1967 годзе прыйшоў мастаком-кансультантам у Беларускае аддзяленне Усесаюзнай гандлёвай палаты, потым стаў галоўным мастаком. Трэба было забяспечваць рэкламнай прадукцыяй нашы прамысловыя прадпрыемствы за мяжой. Калі для Беларусі быў выдзелены павільён у Лейпцыгу, мне было даручана скласці экспазіцыйна-тэматычны план беларускай выставы. Вось такая была мая першая значная праца.

Аднойчы Мастацкі фонд прапанаваў мне аформіць Обальскі музей у Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці — філіял Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны. З-за гэтага мне прыйшлося пакінуць прэстыжную працу ў Гандлёвай палаце і ўладкавацца ў Мінскія мастацкія майстэрні. На само афармленне васьмі залаў мне далі месяц тэрміну, падрыхтоўчая работа заняла значна больш часу. З той пары я аформіў шмат музейных экспазіцый, займаюся гэтым і зараз.

Шмат кніг афармляў у тым ліку і беларускіх пісьменнікаў. Сярод шырокавядомых — альбом "Беларускае мастацкае шкло"(1978 год); буклет на пяці мовах "Срэбраны звон цымбал" (1982 год), прысвечаны Дзяржаўнаму народнаму аркестру Іосіфа Жыновіча; "Вязынка" — купалаўскі мемарыяльны музей (1983 год); буклет, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа "Паэт-пясняр між нас жыве"...

Па заказу Міністэрства культуры афармляў першую пласцінку фірмы "Мелодыя" Ігара Лучанка. Эмблема Філармоніі — таксама мая работа.

А медалямі пачаў займацца з 70-х гадоў. Значныя работы — гэта памятны медаль, прысвечаны 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (за яе я атрымаў званне "Майстар-залатыя рукі"). Сярод апошніх работ — Медаль Скарыны.

Вяртанне ў Ароў-парк

Беларуская мова і песня гучалі на амерыканскай зямлі як прывітанне з роднага краю

Праект таварыства "Радзіма" "Дакраніся да сваіх каранёў" пашырыў сваю геаграфію. Калі папярэднія яго этапы рэалізоўваліся для суайчыннікаў, якія жывуць у блізкім замежжы, то сёлета, дзякуючы спонсарскай падтрымцы і дапамозе вядомай многім беларусам дабрадзейкі, нашай зямлячкі з Кліўленда (ЗША) Ірэне Каляда-Смірноў, а таксама дырэктарата Ароў-парку ў асобе Мані Сімак, Пола Бярэжнага і Еўдакіі Клімовіч, сутыкнуцца з культурай сваёй Бацькаўшчыны змаглі нашы суайчыннікі ў Злучаных Штатах Амерыкі.

Я, каардынатар праекта Галіна Навіцкая, разам з салісткай Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча, выканаўцай народных песень Нінай Кавалёвай былі запрошаны суайчыннікамі на свята славянскіх культур, якое было прымеркавана да Дня працы.

Праграмай прадугледжвалася дзевяцідзённае знаходжанне ў Нью-Йорку, сустрэчы з землякамі, выступленні з канцэртамі ў Ароў-парку і ў іншых асяродках.

Перад тым, як расказаць пра свае ўражанні, хочацца згадаць некалькі фактаў з гісторыі Ароў-парку — культурнага і адпачынкавага цэнтра працоўнай эміграцыі з этнічнай перавагай беларусаў.

Яшчэ ў сярэдзіне 40-х гадоў эмігранты з былога СССР задумалі стварыць культурны цэнтр, дзе можна было б збірацца для адпачынку і праводзіць вольны час. У 1947 годзе была створана спецыяльная камісія па падборы месца для фермерскай асацыяцыі. Гэтая камісія ў 1948 годзе знайшла добры маёнтак з цудоўнымі алеямі, лесам, вялікім возерам, непадалёку ад мястэчка Манро, які затым быў выкуплены і атрымаў назву "Ароў-парк" (назва ўзята ад раней існуючых асацыяцый рускіх рабочых таварыстваў узаемадапамогі).

4 ліпеня 1948 года ў Дзень незалежнасці адбылося афіцыйнае адкрыццё фермы. У тым жа годзе на свята Дня працы з усіх канцоў ЗША ў Ароў-парк з'ехалася больш за 15 тысяч эмігрантаў, у тым ліку і выхадцаў з Беларусі. У 1957 годзе Фермерская асацыяцыя была ліквідавана, а замест яе створана карпарацыя "Ароў-парк". З таго часу ўся маёмасць належыць карпарацыі і ўладальнікам яе акцый. Агульная плошча Ароў-парку складае каля 500 акраў, тут многа ўсялякіх пабудоў, частка якіх здаецца ў арэнду ў летні час, з чаго атрымліваецца прыбытак. Сярод акцыянераў — беларусы, украінцы, рускія, палякі. Уся работа па добраўпарадкаванні тэрыторыі робіцца на добраахвотных пачатках. Акцыянеры Ароў-парку маюць права ўваходзіць на тэрыторыю бясплатна, а таксама арандаваць памяшканні для адпачынку на 10 працэнтаў танней.

Летам тут даволі шматлюдна. Сюды прыязджаюць, каб правесці свой вольны час не толькі члены Карпарацыі, але і асобы, якія не маюць акцый.

Як мне сказалі людзі, што тут часта праводзяць свой вольны час, білет на адзін дзень каштуе 8 долараў (разам з платай за паркоўку аўтамабіля) і 4 долары для дзяцей, зняць пакой на адны суткі можна за 50 долараў. Ёсць тут летнія домікі на некалькі чалавек, якія каштуюць яшчэ танней. Сезон адпачынку пачынаецца ў маі і заканчваецца ў кастрычніку. Культурныя праграмы ў асноўным разлічаны на суботу і нядзелю — гэта канцэрты, танцы, выступленні артыстаў з Расіі, Украіны. Сярод беларусаў, якія таксама выступалі тут у свой час, — Эдуард Зарыцкі, Іна Афанасьева. Сустрэліся мы тут і з сям'ёю Козакаў, якія вось ужо 15 гадоў жывуць у эміграцыі ў ЗША. Яны таксама часта выступаюць з канцэртамі на пляцоўцы Ароў-парку, спяваюць нашы беларускія песні, і мне здалося, што гучаць яны ў іх выкананні неяк асабліва душэўна і кранальна (можа таму, што так даўно іх выканаўцы не былі на Радзіме). І вось цяпер свае майстэрства прадэманстравала Ніна Кавалёва.

...Сціплая брама з надпісам "Arrow Park" нібы адчыняе ўваход у парк. Адчуваю хваляванне ад сустрэчы з тымі краявідамі, якія бачыла на фотаздымках, а цяпер вось бачу ўласнымі вачыма. Прайшлі трошкі далей па алеі, і перад намі адкрылася вялікая паляна, на якой усталяваны бюст нашаму песняру Янку Купалу.

Першы раз я пачула пра помнік Янку Купалу ў Ароў-парку яшчэ калі працавала ў школе настаўніцай англійскай мовы. Я ведала, што гэты помнік быў створаны скульптарам А. Анікейчыкам і архітэктарам С.Баткоўскім і ўстаноўлены ў Ароў-парку побач з помнікамі ўкраінскаму песняру Т.Шаўчэнку, расійскаму паэту А.Пушкіну і амерыканскаму паэту У. Уітмэну. А калі пачала працаваць у таварыстве "Радзіма", то яшчэ даведалася, што таварыства мае самае непасрэднае дачыненне да ініцыятывы ўстанаўлення помніка: яго прадстаўнікі прысутнічалі на адкрыцці ў 1973 годзе. Адкрыццё помніка стала вялікай урачыстай падзеяй — гэта было свята яднання трох народаў-братоў: рускага, беларускага і ўкраінскага, якія імкнуцца згуртавацца ў любых умовах, нават знаходзячыся на чужыне.

Прызнаюся, калі мы пад'язджалі да Ароў-парку, сэрца затрапяталася: як адбудзецца сустрэча, знаёмства, хто прыйдзе, ці будзе цікавасць да беларускага мастацтва і ўвогуле да нас. Сустрэлі нас дырэктар Маня Сімак і старшыня Камітэта па культуры Пол Бярэжны. Яны правялі нас па будынку, парку, расказалі пра сваю працу, пачаставалі нас баршчом, галубцамі (на жаль, нашых дранікаў не было, але рэцэпт на кухні ўзялі, абяцалі пры наступнай сустрэчы абавязкова прыгатаваць).

У аднапавярховым павільёне, які служыць залай для масавых мерапрыемстваў, сабралася даволі многа народу, у асноўным — людзі сталага ўзросту. Як даведалася я з размоў, многія з іх нарадзіліся тут, у Амерыцы, але ад сваіх матуль, бацькоў ведаюць пра сваю Бацькаўшчыну. І гэта не толькі Беларусь, але і Расія, і Украіна. Некаторыя, калі былі маладзейшыя, прыязджалі ў Беларусь, дарэчы, вельмі многія з дапамогай таварыства "Радзіма". Цікавасць да нас была велізарная. І, сустрэўшыся цяпер з пасланкамі з Беларусі, вельмі хацелі ведаць, "як там?". Мы разумелі, што дакладнай інфармацыі тут мала, таму імкнуліся расказаць як мага больш пра нашу краіну, паказаць фотаздымкі гарадоў, падараваць на памяць беларускія сувеніры.

Будучы ў пераважнай большасці людзьмі сталага ўзросту, якія нарадзіліся ў Амерыцы (у некаторых бацькі таксама нарадзіліся тут), яны, на жаль, не ведаюць беларускай мовы, нават па-руску размаўляюць не вельмі добра (часта я карысталася англійскай мовай), але як прыемна было чуць, што яны цікавяцца жыццём нашай краіны, яе дасягненнямі, пытаюцца пра мясціны, аб якіх расказвалі іх бабулі і дзядулі. На тварах гэтых старых людзей была не толькі зацікаўленасць, але і шчырая туга і смутак аб тым, што лёс, на жаль, не падаруе ім сустрэчу з краінай, адкуль бярэ вытокі іх жыццё. Але той невялікі кавалачак Беларусі, яе мову і песню мы прывезлі з сабою і падаравалі кожнаму, хто прыйшоў на спатканне з намі. Спявачка Ніна Кавалёва, статная прыгажуня ў нацыянальным беларускім касцюме, з першай песні заваражыла, закранула душы і сэрцы кожнага прысутнага. Я назірала за залай, калі спявачка была на сцэне, і адразу ж пазнавала, хто быў беларус: выдавалі слёзы і хусцінка ля вачэй. Бо сапраўды, тое, што ўваходзіць у нас з малаком маці, жыве і застаецца ў сэрцы кожнага назаўсёды.

Былі яшчэ сустрэчы і выступленні ў дзвюх праваслаўных цэрквах: у мястэчках Парамус і Раверфорт (штат Нью-Джэрсі), прыхаджанамі якіх з'яўляюцца эмігранты з славянскіх дзяржаў, у тым ліку беларусы. Я ведала і раней, што вакол цэркваў гуртуецца культурнае жыццё. Цяпер убачыла на свае вочы, як гэта адбываецца. Прыхаджане пасля службы збіраюцца ў асобнай зале, дзе разам адпачываюць, частуюцца стравамі, дзеляцца ўспамінамі, абмяркоўваюць хвалюючыя пытанні. Адбываюцца тут таксама і канцэрты. Запрашаюць артыстаў з краін свайго паходжання. Вось і мы парадавалі прыхаджан-беларусаў гэтых цэркваў сваім прыездам да іх. Нас сустракалі вельмі цёпла, як дарагіх і жаданых гасцей.

Мы планавалі і вельмі хацелі сустрэцца і выступіць у Беларускай царкве, што ў Брукліне, але па нейкіх прычынах нас прыняць не змаглі. Шкада, што беларусы, якія наведваюць гэтую царкву, не змаглі выкарыстаць магчымасць пачуць беларускую песню, родную мову, атрымаць прывітанне з роднага краю.

Незабыўным і вельмі ўражлівым было наша наведванне штаб-кватэры ААН, якое адбылося якраз на-

— Заканчэнне на 10-й стар. —

ЗША

Вяртанне ў Ароў-парк

Беларуская мова і песня гучалі на амерыканскай зямлі як прывітанне з роднага краю

— Пачатак на 9-й стар. —

пярэдадні юбілейнай, 60-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, для ўдзелу ў якой з'язджаліся кіраўнікі дзяржаў свету, у тым ліку і Беларусі.

Праз сваю знаёмую з рускай місіі ААН Тамару Пазнякову я звязалася з прадстаўнікамі Беларусі ў ААН Аляксандрам Тубальцом і Валерыем Марусіным, які, дарэчы, некалі працаваў у таварыстве "Радзіма". Яны сустрэлі нас у будынку ААН, правялі па паверхах, пазнаёмілі з экспазіцыямі, выставамі. Быў вельмі цікавы момант, калі мы прыпыніліся каля габелена, падараванага Беларуссю ў 1992 годзе Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ("Чарнобыль" Аляксандра Лішчанкі). Якраз у гэты час гід, якая праводзіла экскурсію для наведвальнікаў ААН, расказвала пра Беларусь каля нашага габелена. Мы нечакана апынуліся ў цэнтры увагі, і, як мне здаецца, вельмі дастойна прадставілі сваю краіну, адказваючы на пытанні зацікаўленых экскурсантаў — прадстаўнікоў з многіх краін свету. Беларуская мова і песня гучалі ў гэты дзень у будынку ААН. Наша выступленне сабрала шмат работнікаў ААН, і вельмі прыемна, што да нас прыйшлі не толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых місій.

Выказала зацікаўленасць да нас рэдакцыя ААН. У інтэрв'ю яго карэспандэнту Наталлі Церахавай расказалі пра таварыства "Радзіма", якое арганізавала гэтую паездку, пра тых людзей, якія дапамаглі яе здзейсніць, пра нашы ўражанні. Дарэчы, гэтае інтэрв'ю было накіравана ў Беларусь на нацыянальнае радыё, і таксама прагучала ў эфіры.

Будынак штаб-кватэры ААН называюць Вавілонскай вежай на Іст-Рывер. На якіх толькі мовах не размаўляюць тут дэлегаты з розных краін, якіх толькі колераў і прычосак не дэманструюць пасланцы народаў свету. Адзін мы не згубіліся нават у такой атмасферы культурнай разнастайнасці. За той час, што знаходзіліся ў будынку ААН, змаглі прыцягнуць да сябе ўвагу і выклікаць непадробную цікавасць да Беларусі, яе мовы, мастацтва і — галоўнае — пакінуць добрую памяць аб нацыянальным характары. А гэта, згадзіся, не часта ўдаецца нават дыпламатам.

Падчас нашага наведвання Нью-Йорку нам давялося сустрэцца і пазнаёміцца з многімі беларусамі, якія жывуць і працуюць на амерыканскай зямлі, але не забываюць пра Беларусь, беражна ставяцца да яе мовы, гісторыі, культуры. Сярод іх — галоўны рэдактар газеты "Час" Юры Васілеўскі. З ім мы сустрэліся ў першы дзень нашага наведвання Ароў-парку, і на працягу нашага знаходжання ў Нью-Йорку ён, па магчымасці, увесь час быў з намі. Надзвычай эрудзіраваны, ён вельмі многа і цікава расказаў аб жыцці беларускай дыяспары ў ЗША, зрабіў для нас экскурсію па Нью-Йорку, пазнаёміў з яго выдатнымі мясцінамі. Спадзяёмся на такую ж плённую і цікавую сустрэчу з ім на беларускай зямлі.

На жаль, з-за недахопу часу мы не змаглі паехаць у Кліўленд, дзе жыве Ірэна Каляда-Смірноў — наш самы дарагі сябар, якая не аднойчы дапамагала таварыству "Радзіма" ў ажыццяўленні мерапрыемстваў і праграм. І на гэты раз, дзякуючы яе ўвазе, клопату і падтрымцы, мы змаглі паспяхова ажыццявіць наш праект, прывезці нашым суродзічам праз акіян узоры беларускай культуры, далі магчымасць кожнаму з іх адчуць подых роднай Бацькаўшчыны. Дзякуй вам, паважаная спадарыня Ірэна, за вашу дабрыню, клопат і ўвагу.

Заканчу свае ўспаміны аб наведванні ЗША словамі падзякі вельмі сардэчнай, чулай, добрай асобе — Еўдакіі Клімовіч, якая прыклала шмат намаганняў, каб наша паездка здзейснілася. Яна нарадзілася і жыве ў Нью-Йорку, займае пасаду выкладчыка псіхалогіі ў адным з універсітэтаў, вельмі паважаны чалавек. Доўгі час таварыства "Радзіма", я асабіста, падтрымлівалі кантакты з ёю, не аднойчы яна была ў Беларусі, на радзіме сваіх бабуль і дзядуляў, але ёй вельмі хацелася, каб наша сустрэча адбылася ў Амерыцы, на зямлі, дзе нарадзіліся яе бацькі — Вольга і Фрэд Клімовічы, дзе нарадзілася яна сама.

Бацькі яе стаялі ля вытокаў стварэння Ароў-парку. Да гэтага часу старажылы памятаюць танцавальны ансамбль "Юла", кіраўніком і заснавальнікам якога быў Фрэд Клімовіч. Дуня ўсё сваё жыццё, з маленства, разам з бацькамі прымала самы актыўны ўдзел у дзейнасці арганізацыі, танцавала ў ансамблі, а потым і сама кіравала танцавальнай групай. На жаль, цяпер няма моладзі, каб працягваць тыя традыцыі, якія былі закладзены яе бацькамі, але яна і цяпер з'яўляецца членам Культурнага камітэта, які займаецца арганізацыяй адпачынку і культурных мерапрыемстваў у Ароў-парку. Ініцыятыва запрасіць беларусаў — мяне як прадстаўніка таварыства "Радзіма" і спявачку Ніну Кавалёву, належыць менавіта ёй.

Усе дзевяць дзён мы знаходзіліся разам. Гэта былі незабыўныя дні нашага знаёмства з Амерыкай, з жыццём нашых суродзічаў на гэтай зямлі, а для Дуні — нагода, каб яшчэ раз пачуць пра краіну, адкуль паходзіць яе род, успомніць пра сваіх продкаў, бацькоў, якіх яна вельмі любіла, якія марылі і сумавалі аб Беларусі.

Галіна НАВІЦКАЯ,
супрацоўніца таварыства "Радзіма", каардынатар праектаў.

НА ЗДЫМКАХ: беларусы ў штаб-кватэры ААН у Нью-Йорку; Ніна КАВАЛЁВА і Галіна НАВІЦКАЯ з сям'ёй КОЗАКАЎ; дырэктар Ароў-парку Маня СІМАК, Галіна НАВІЦКАЯ і Дуня КЛІМОВІЧ; помнік Янку КУПАЛУ ў Ароў-парку; па Брайтан-Біч гасцей з Беларусі правёў Юры ВАСІЛЕЎСКІ.

У будучы даведнік

Латвія

Іваноў Барыс

Іваноў Барыс Феафанавіч (10.06.1955, вёска Орцы Міёрскага раёна Віцебскай вобласці), педагог, грамадскі дзеяч Латвіі, старшыня БКАТ "Уздым" г. Даўгаўпілса, вядомы ў Латвіі прадпрымальнік.

Бацька Барыса Іванова, Іваноў Феафан Нікіфаравіч, ваяваў на фронце ў гады Вялікай Айчыннай вайны, інвалід Вялікай Айчыннай вайны. Пасля заканчэння Мінскага інстытута замежных моў сорак гадоў працаваў настаўнікам у школе. Маці, Іванова (дзявочае прозвішча — Арцёменка) Тамара Рыгораўна 42 гады таксама выкладала ў школе.

У першы клас Барыс пайшоў у 1962 годзе. На працягу ўсіх гадоў вучобы ў школе хлопчык выдатна вучыўся, займаўся спортам, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці школы. Матэматычны склад розуму і здольнасці да прыкладных навук адыгралі сваю ролю ў далейшым лёсе таленавітага юнака. У 1972 годзе Барыс скончыў з залатым медалём Перабродскую сярэднюю школу Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Паступаць у вышэйшую навучальную ўстанову вырашыў у бліжэйшым горадзе, каб была магчымасць дапамагаць бацькам, часцей наведваць родных. Таму ў тым жа годзе Барыс паступіў у Даўгаўпілскі педагагічны інстытут на фізіка-матэматычны факультэт.

У 1977 годзе Барыс Іваноў паспяхова закончыў Даўгаўпілскі педагагічны інстытут і атрымаў дыплом па спецыяльнасці настаўнік матэматыкі і фізікі. Затым ён праходзіў службу ў войсках Савецкай Арміі ў Забайкаллі. Пасля зноў працягваў вучобу. На гэты раз паступіў у аспірантуру Латвійскага дзяржаўнага універсітэта ў Рызе (1979-1983). Пасля заканчэння аспірантуры з 1983 года працаваў на кафедры Даўгаўпілскага педагагічнага інстытута выкладчыкам матэматычнага аналізу.

З 1991 года наш суайчыннік пачаў актыўна займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Працаваў у розных камерцыйных фірмах Латвіі. Вядомы ў Латвіі прадпрымальнік, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым" у Даўгаўпілсе, аказвае яму фінансавую дапамогу.

У 2002 годзе Барыс Іваноў абраны старшынёй рады БКАТ "Уздым" горада Даўгаўпілса.

Наш суайчыннік жанаты, выхоўвае чацвёра дзяцей.

Наталля ТАКТАСУНАВА.

Украіна

Кавалевіч Фёдар

Кавалевіч Фёдар Паўлавіч нарадзіўся 5 мая 1945 года ў вёсцы Сашно Пінскага раёна.

У 1962 годзе скончыў сярэднюю школу і паступіў у Брэсцкі педагагічны інстытут на факультэт прыродазнаўства. Праходзіў службу на Балтыйскім флоце ў Калінінградзе. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці флота, быў пазаштатным карэспандэнтам газеты "Вартаўнік Балтыкі". Пасля дэмабілізацыі па рэкамендацыі Палітаддзела флота быў прыняты на работу ў Брэсцкі абкам камсамола на пасаду інструктара арганізацыйнага аддзела.

У 1969 годзе па сямейных абставінах пераехаў у Адэсу. Працаваў у Адэскім абкаме камсамола. У 1971-м быў прызваны ў органы Дзяржбяспекі, дзе працаваў да снежня 1991 года. Зволены ў запас у званні палкоўніка.

Ф.Кавалевіч з'яўляецца адным з ініцыятараў стварэння нацыянальна-культурнага аб'яднання "Беларусь" у Адэсе, якое ўзначальвае з мая 2000 года. Аб'яднанне прымае актыўны ўдзел ва ўсіх гарадскіх мерапрыемствах.

Па ініцыятыве Ф.Кавалевіча праведзены Дні беларускай культуры ў Адэсе, а з удзелам балгарскай абшчыны — Дні славянскага пісьменства, якія атрымалі шырокі рэзананс сярод грамадскасці горада.

Ф. Кавалевіч пастаянна садзейнічае ўстанаўленню гандлёва-эканамічных сувязей паміж Адэскім рэгіёнам і рэгіёнамі Беларусі. Пры садзейнічанні НКАГ "Беларусь" праведзены сустрэчы прадстаўнікоў Мінскага аўтазавода з кіраўніцтвам мэрыі Адэсы, якія завяршыліся дамовай аб набыцці мінскіх аўтобусаў і тралейбусаў для жыхароў горада. Ініцыіравана правядзенне сустрэч прадстаўнікоў бізнесу Адэсы з кіраўнікамі прамысловых цэнтраў Беларусі — Гомеля, Брэста.

Ф. Кавалевіч клапоціцца аб папаўненні шэрагаў аб'яднання, створаны філіял НКАГ "Беларусь" у горадзе Белгарад-Днястроўскім, ідзе працэс аб'яднання беларусаў у гарадах Балце і Ільічоўску Адэскай вобласці, дзе кампактна пражываюць выхадцы з Беларусі. З гэтай мэтай створаны Беларускі культурны цэнтр.

За асабісты ўдзел у захаванні нацыянальных традыцый, мовы прадстаўнікамі беларускага этнасу ў рэгіёне, кіраўніцтвам Савета прадстаўнікоў нацыянальна-культурных таварыстваў Адэскай вобласці Ф.Кавалевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Адэскага абласнога савета.

Ірына АРЖАХОЎСКАЯ,
старшыня Саюза беларусаў Украіны.

Эстонія

Міжуй Уладзімір

Міжуй Уладзімір Паўлавіч (6.2.1948, вёска Закур'е Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці), інжынер-будаўнік, дырэктар АТ "Транссэрвіс-Н", дэпутат Нарвскага гарадскога сходу, член праўлення Беларускага культурнага таварыства "Сябры", вядомы бізнесмен і грамадскі дзеяч Эстоніі.

У. Міжуй паходзіць з сялянскага роду. Бацька — Міжуй Павел Парфёнавіч, маці — Міжуй (дзявочае прозвішча Паздняк) Марыя Кандрацьеўна.

У 1963 годзе У. Міжуй скончыў мясцовую васьмігадовую школу. У тым жа годзе паступіў вучыцца ў Нарвскі політэхнічны тэхнікум у Эстоніі. Адначасова з вучобай у тэхнікуме вучыўся ў ГПТВ № 14 па спецыяльнасці слесар-сантэхнік. Пасля заканчэння вучобы быў накіраваны на работу ў Нарвскае кіраўніцтва "Сантэхмантажу". У 1966 годзе паступіў у Талінскі політэхнічны інстытут на будаўнічы факультэт. Уладзімір Паўлавіч сумяшчаў вучобу і працу. У 1972 годзе ён скончыў Талінскі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці "інжынер-будаўнік па цеплагазазабеспячэнні і вентыляцыі". Затым служыў у радах Савецкай Арміі. З 1975-га па снежань 1981 года займаў пасаду дырэктара Нарвскага ўпраўлення "Водаканал". За час знаходжання Уладзіміра Паўлавіча на кіруючай пасадзе была поўнасцю рэканструявана водаправодная сетка старой часткі горада Нарвы, пабудаваны 26-кіламетровы водаправод ад Чорнай рэчкі.

У снежні 1981 года нашага суайчынніка выбралі намеснікам старшыні Нарвскага гарвыканкама. Праз год ён быў пераведзены на пасаду першага намесніка старшыні гарвыканкама Нарвы. У 1985 годзе Уладзімір МІЖУЙ быў выбраны мэрам Нарвы. На гэтай адказнай пасадзе ён паспяхова працаваў да лістапада 1993 года. За гэты час у горадзе было пабудавана звыш 30 розных прамысловых, сацыяльна-культурных і жылых аб'ектаў. У 1993 годзе Уладзімір Паўлавіч па ўласным жаданні падаў у адстаўку. У 1993-1994 гадах з'яўляўся прэзідэнтам бізнес-цэнтра горада Нарвы. З снежня 1994 года Уладзімір Паўлавіч працуе дырэктарам АТ "Транссэрвіс-Н". Вялікая заслуга нашага суайчынніка як кіраўніка ў тым, што ён змог упарадкаваць рух транзітнага транспарту праз Нарву і граніцу з Расіяй.

У. Міжуй вельмі актыўна ўдзельнічаў у грамадскім і палітычным жыцці Эстоніі. Ён быў выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета ЭССР, неаднаразова выбіраўся дэпутатам гарадскога Савета Нарвы. Цяпер з'яўляецца дэпутатам гарадскога сходу.

Прымае вельмі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці беларусаў Эстоніі. Ён не толькі ўдзельнічае ў мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Беларускім культурным таварыстве "Сябры", але і матэрыяльна падтрымлівае гэтую грамадскую арганізацыю.

У. Міжуй жанаты, мае дачку і двух унукаў.

Наталля ТАКТАСУНАВА.

Збіральнікі

Дваццаць гадоў музейнага шчыравання

Учора я расказала чытачам "Голасу Радзімы" пра Алену Васільеўну Аладаву, чыімі стараннямі пасля вайны быў адроджаны Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. З'яўляючыся доўгі час яго дырэктарам, яна памножыла скарбы гэтай вядучай музейнай установы краіны. Яшчэ пры жыцці турбавалася, каму перадаць эстафету. Такім выбраннікам, яе пераемнікам заслужана стаў Юрый Аляксандравіч Карачун (1931-1997). У 1977 годзе, адразу пасля смерці Алены Васільеўны, яго прызначылі дырэктарам музея.

Юрый КАРАЧУН з сынам.

Жыццёвы шлях Юрыя Карачуна складваўся нялёгка. Дзяцінства яго прайшло ў Краснаярскім краі, куды ў 1933 годзе быў сасланы разам з жонкай Зінаідай і сынам яго бацька, вядомы беларускі паэт і публіцыст, загадчык аддзела рэдакцыі газеты "Звязда" Аляксандр Карачун, які нярэдка друкаваўся пад псеўданімам А. Папраўскі. Амаль адначасова не па сваёй волі трапіў з Кухцічаў Уздзенскага раёна ў Алтайскі край і дзед, Васіль Сямёнавіч, рэабілітаваны ў 1991 годзе. Ды ж стала вядома і пра рэабілітацыю бацькі (хаця яна наступіла яшчэ ў 1957 годзе), расстралянага ў Мінусінску пасля паўторнага арышту 31 сакавіка 1938 года.

Такім чынам, з сямі гадоў Юрый застаўся сіратой. Вярнуўшыся ў Мінск, ён з дапамогай сваякоў паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча, дзе яго настаўнікамі былі Галіна Ізергіна і Віталь Цвірка. Потым завочна закончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут. З 1962 года пачаў з Генадзем Галубовічам, вядомым мастаком кнігі, прымаць удзел у выставачнай дзейнасці Саюза мастакоў СССР, хаця сябрам гэтага саюза стаў толькі ў 1988 годзе.

Адначасова з творчасцю ў галіне станковага жывапісу і графікі (акварэль, пастэль, фламастар, аловак, туш) Юрый Карачун займаўся афармленнем кніг, мастацкім і навуковым рэдагаваннем. Пісаў артыкулы, рыхтаваў альбомы, за што атрымліваў дыпломы на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставах. Цяпер творы Ю. Карачуна знаходзяцца ў музеях Беларусі і многіх прыватных калекцыях, таму што ён іх ахвотна дарыў сваім сябрам.

З 1977 года і да самай апошняй хвіліны жыцця Юрый Аляксандравіч з'яўляўся дырэктарам Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Тут раскрыліся і добра выявіліся яго дзівосныя ўласцівасці як цудоўнага арганізатара, гаспадарніка і адміністратара, у якім добра спалучаліся інтэлігентнасць, павага да людзей, дабрыня, сціпласць, сумленнасць і адначасова прынцыповасць, строгасць, высокая патрабавальнасць. Здзіўляла яго шырокая эрудыцыя, любоў да культуры, адчуванне беларускай мовы, пачуццё гумару. Для яго непрымальным было кагосьці пакрыўдзіць, абразіць. Вытрымка ў яго была выключная. Нам здавалася, што ўсё гэта ён пераняў ад Алены Аладавай, якая амаль дзесяць гадоў апекавалася ім, перадавала яму сваё, дырэктарскае бачанне свету, многія музейныя таямніцы.

Як і ў А. Аладавай, сціпласць у Ю. Карачуна была неверагодная. Ён нікому не казаў, куды збіраецца ехаць. А гэта маглі быць Бразілія і Францыя, Італія і Англія, Германія і Польшча, Расія і Югаславія, Балгарыя і Украіна, Латвія і Літва. Вярнуўшыся ж з далёкіх падарожжаў, ён найперш лічыў патрэбным расказаць пра ўбачанае і пачутае сваім супрацоўнікам. Ён увёў штотыднёвыя планёркі, на якіх інфармаваў аб планах, іх рэалізацыі, вострых праблемах. Штогод ён рабіў справаздачу перад калектывам як дырэктар музея. На сходах гэтага калектыву яго рэкамендавалі для прысваення звання заслужанага дзеяча культуры Беларусі (1992), вылучалі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

З вялікай увагай адносіўся ён да экспазіцыйнай дзейнасці музея. Падтрымліваў цікавыя праекты як зарубежных выстаў ("Дрэздэнская галерэя", "Метраполітэн-музей", "Кетэ Кольвіц", "Ліёнскія тканіны"), так і новых беларускіх. Адкрыццё выставы ператвараласяў вялікую падзею. Заўсёды там цешыў вока воблік Юрыя Аляксандравіча — прыгожага, элегантна апранутага, унутрана сабранага, выдатнага прамоўцы. Гэта была таленавітая асоба — аблічча не толькі музея, не толькі Міністэрства культуры, але і ўсёй нашай краіны.

Ю. Карачун умела кантактаваўся з пасольствамі, быў прыроджаным дыпламатам. Не выпадкова менавіта ён стаў першым старшынёй беларускага аддзела ІКАМОС (1992), сябрам дзяржаўнай Беларуска-польскай камісіі па супольнай спадчыне, таварыстваў Беларусь — Францыя і Беларусь — Іспанія, Беларускага фонду культуры, Камісіі па прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь. Пасля стварэння музейнага аддзялення на гістарычным факультэце БДУ яму прапанавалі чытаць курс "Музеі свету".

Гэта Юрыю Аляксандравічу належала ідэя стварэння філіялаў музея — у Магілёве, Раўбічах, Міры, Гальшанах, Лошыцы, Азгура і Ваньковіча ў Мінску. Разглядаліся прапановы па стварэнні музеяў у Новым Свержані, Ракаве, Гнезне, Маламажэйкаве. Урэшце, у 1994 годзе разам з Іванам Загрышавым, Уладзімірам Гілепам, Сяргеем Маслоўскім, Ірынай Голубевай і мною распрацаваў ён канцэпцыю Нясвіжскага музея-запаведніка як філіяла Нацыянальнага мастацкага музея.

Нямала намаганняў прыклаў Ю. Карачун для папаўнення і камплектавання калекцый музея як творамі беларускіх мастакоў, так і зарубежнай класікай. З'яўляючыся сябрам Дзяржаўнай экспертнай камісіі Міністэрства культуры, ён увесь час адстойваў інтарэсы музея ў набыцці каштоўнасцей. Яшчэ з А. Аладавай ён узняў вельмі складаную праблему пашырэння плошчаў, што прывяло да будаўніцтва другой чаргі музея (новага будынку), атрымання дадатковага дома на вуліцы Кірава.

Юрыя Аляксандравіча вылучала высокая адукаванасць. Яго цікавіла культура ў самых розных яе праявах — у выяўленчым мастацтве, літаратуры, музыцы, тэатры. Разам са сваёй жонкай Валянцінай Міхайлаўнай ён абавязкова наведваў прэм'еры. Любіў прымаць у сябе калег, сяброў: Георгія Паплаўскага, Арлена Кашкурэвіча, Міхаіла Савіцкага, Генадзя Галубовіча і многіх іншых. Пяшчотна адносіўся да сваёй радні. Ганарыўся сваім адзіным сынам кандыдатам філасофскіх навук Аляксандрам, унукам Міхаілам, які з адзнакай закончыў факультэт міжнародных адносін БДУ.

Вялікую ўвагу Ю. Карачун удзяляў моладзі, яе падрыхтоўцы. Ён падтрымаў стварэнне рэстаўрацыйнага аддзялення ў Мінскім мастацкім вучылішчы. І не выпадкова абарона дыпломных работ яго выпускнікоў адбывалася ў сценах нашага музея.

Заахвочванне дзейнасці таленавітых супрацоўнікаў і стварэнне творчай атмасферы вылілася ў тое, што чатыры супрацоўнікі музея сталі кандыдатамі навук, адзін — доктарам, два — заслужанымі дзеячамі культуры Беларусі, пяць — сябрамі Саюза беларускіх мастакоў. Гэта яму належала ідэя вылучэння на Дзяржаўную прэмію Беларусі ў 1986 годзе трылогіі па старажытным беларускім мастацтве (лаўрэатамі тады сталі пяцёра нашых супрацоўнікаў), а на прэмію "За духоўнае адраджэнне" — Міхаіла Раманюка (1997).

Наш былы дырэктар заўсёды лічыў, што чым больш нашых музейшчыкаў будзе ўдзельнічаць у рабоце розных саветаў, інстытутаў, універсітэтаў, арганізацый, тым ярчэй і маштабней будзе глядзецца сам музей на рэспубліканскай і зарубежнай арэне. І яны працавалі ў БДУ, акадэміях — мастацтваў і музыкі, Мінскім мастацкім вучылішчы і нават у Оксфардскім універсітэце. Яны ўваходзілі ў склад розных камісій і саветаў, запрашаліся экспертамі на мытні, членамі журы розных конкурсаў, кіравалі дыпломнымі работамі і пісалі артыкулы для энцыклапедый.

У артыкуле для "Голасу Радзімы", відаць, трэба падкрэсліць, што Юрый Аляксандравіч упершыню ў Беларусі стаў заключаць дамовы з музеямі Літвы, Польшчы, Расіі і іншых краін. Узаемаадносіны з зарубежнымі калегамі перарасталі ў сапраўдную дружбу. Яе вынікамі сталі абменныя выставы ў Кракаве і Яраслаўлі, Вільнюсе і Мінску. Асаблівую ўвагу Ю. Карачун удзяляў рэстаўрацыі экспанатаў, якая праводзілася не толькі ў Мінску, але і ў Ленінградзе, Маскве, Растове-на-Доне.

— Заканчэнне на 12-й стар. —

Пераднавагоднія сенсацыі

У апошні час у розных сродках масавай інфармацыі, як беларускіх, так і зарубежных, з'явілася нямала цікавых і нават сенсацыйных матэрыялаў, якія маюць прамое дачыненне да вяртання нашай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. Некаторыя з публікацый разглядаюцца і каменціруюцца ў гэтым аглядзе.

За некалькі дзён Магілёў пасталеў на шэсць стагоддзяў

Адкрыўшы энцыклапедыю, вы даведаецеся, што гэты горад на Дняпры ўпершыню ў пісьмовых крыніцах упамінаецца ў 1267 годзе. Гісторыкі да апошняга часу сведчылі, што замак тут быў пабудаваны дзесьці ў XVI стагоддзі, а першы мураваны (езуіцкі) храм узнёсся толькі ў 1604 годзе.

І раптам, зусім нечакана ўсё змянілася. Спачатку магілёўскія сябры-беларусісты паведамілі нам, а потым розныя СМІ апублікавалі весткі, што група выкладчыкаў і студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя Аркадзя Куляшова пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук Ігара Марзалюка, праводзячы ў лістападзе раскопкі на тэрыторыі колішняга замка, нечакана і літаральна ў апошні дзень работы знайшлі...

Пералічыць у адным сказе ўсе, хаця б толькі самыя важныя знаходкі, проста немагчыма. Таму найперш адзначым галоўнае. На замчышчы аказаўся ляпны гліняны посуд, які адносіцца да так званай Кіеўскай культуры. А гэта ўжо... пятае стагоддзе! Потым знайшлі плінфу (старажытную пляскатую цэглу), якая сведчыць, што тут існаваў мураваны праваслаўны храм ужо ў XII ці XIII стагоддзі. Тое ж датычыцца істотных слядоў мураванага замка, куды старэйшага, чым лічылася раней. Урэшце былі знойдзены невялікія папяровыя світкі, вельмі падобныя на берасцяныя граматы. Ад часу яны пачарнелі, скурчыліся. Але вучоныя не сумняваюцца, што на іх ёсць пісьмёны. Дык пачакаем, што пакажа рэстаўрацыя, што скажа расшыфроўка.

Не будзем тут расказваць пра больш "дробныя" знаходкі. Скажам, пра элементы аздобы пояса княжацкага дружынніка, выробленыя таксама ў XII-XIII стагоддзях, пра шматлікія бранзалеты і рэшткі зброі. Мы спадзяёмся, што пра ўсё гэта больш падрабязна, з выкарыстаннем ілюстрацый раскажа ў "Голасе Радзімы" сам прафесар Марзалюк, з якім пачаліся ўжо адпаведныя перамовы.

А пакуль што можна адзначыць галоўнае. Магілёў не толькі пастарэў на некалькі стагоддзяў. Ён стаў адным з галоўных, буйных гарадоў беларускіх зямель перыяду Полацкага і Тураўскага княстваў. Ён стаў адным з самых старажытных грамадска-палітычных і несумненна культурных асяродкаў усяго Падняпроўя, усяго Усходняга Славянства.

Вось чаму магілёўская сенсацыя мае не толькі мясцовае, не толькі агульнабеларускае, але і агульнаславянскае, міжнароднае значэнне.

Новае жыццё спадчыны Сяргея Вішнеўскага

У 2005 годзе Беларусь, можна сказаць, упершыню пазнаёмілася з жыццём і творчасцю ўсебакова адоранай асобы — мастака, фатографа, краязнаўца Сяргея Вішнеўскага (1909-1992). У Мінску, у галерэі Фальварак "Добрыя Мысліі", адбылася яго, бадай, першая персанальная выстава. Было выдадзена некалькі буклетаў. Асоба творцы прыцягнула ўвагу беларускай і зарубежнай прэсы.

Сяргей Вішнеўскі нарадзіўся на цяперашняй Віцебшчыне. У 1934-1938 гадах вучыўся ў Віленскай мастацкай школе імя Адама Міцкевіча. Ягоным настаўнікам быў вядомы віленскі жывапісец Мар'ян Кулеша. Вішнеўскі наведваў таксама гурток знакамітага майстра фатаграфіі Яна Булгака, пра якога нядаўна двойчы пісаў "Голас Радзімы".

А пасля Вільні, да вайны і пасля яе, ён працаваў настаўнікам малявання ў Докшыцкай сярэдняй школе. Затым заснаваў у Докшыцах прафесійную студыю. Маляваў наваколльныя краявіды. Але творы свае па розных прычынах не выстаўляў. Пасля смерці мастака ўся яго спадчына засталася ў Докшыцах.

І вось — нечаканае, але заслужанае прызнанне. Рэцэнзенты высока ацанілі прафесіяналізм Сяргея Вішнеўскага, высокую мастацкую і гістарычную каштоўнасць яго палотнаў і фатаграфій.

НА РЭПРАДУКЦЫІ: малады Сяргей ВІШНЕЎСКІ ў сваёй майстэрні ў Вільні.

Падрыхтавала Тамара ШКУРКО.

Збіральнікі

Дваццаць гадоў музейнага шчыравання

— Пачатак на 11-й стар. —

Ён здабываў немалыя сродкі, каб падрыхтаваць копіі ікон і скульптур для перадачы іх у храмы, якія пачыналі нанава дзейнічаць, — гэта было вельмі важна для захавання асноўных фондаў музея. Немалыя намаганні ён прыкладаў, каб даказаць, што нясвіжская калекцыя Радзівілаў была ў 1941 годзе перададзена менавіта Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР, папярэдніцы нашага музея. Таму прэтэнзіі на яе іншых музеяў не маюць пад сабой аніякай юрыдычнай сілы: ён нікому не перадаў аніводнага экспаната з гэтай калекцыі.

Зусім натуральна, што за актыўную дзейнасць па прапагандзе нацыянальнай культуры ў 1992 годзе Юрыю Карачуну было прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтва Беларусі, а ў 1997 годзе за высокія дасягненні ў музейнай справе ён быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў Расійскай Федэрацыі.

У 1998 годзе ў Мінску, Уздзе і Кобрыне адбыліся першыя вялікія пасмяротныя выставы таленавітага мастака.

У памяці ўсіх тых, хто ведаў Юрыя Аляксандравіча, ён назаўсёды застанецца вельмі прыстойным, інтэлігентным, добразычлівым чалавекам, яркай творчай індывідуальнасцю. Усе свае сілы ён пасляпоўна і шчыра аддаваў нацыянальнай культуры, умацаванню шырокіх міжнародных сувязей.

Вядома, многае з задуманага Юрыю Карачуну так і не ўдалося здзейсніць. Напрыклад, ператварыць музей у навукова-даследчы інстытут, стварыць музей старажытнага беларускага мастацтва і экспазіцыю сучаснага мастацтва, дзе былі б залы, прысвечаныя творчасці Міхаіла Савіцкага, Георгія Паплаўскага, Віталія Цвірка і многіх іншых выдатных дзеячаў нацыянальнай культуры; паказаць у належным аб'ёме нашы унікальныя калекцыі рускай класікі XVIII-XX стагоддзяў, мастацтва Захаду і Усходу, злепкі, рэпрадукцыі з Луўра, падараваныя нашай выдатнай зямлячкай Надзеяй Лежэ, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Ажыццяўленне пералічанага вышэй дазволіла б вывесці наш музей на сусветны ўзровень. Але, спадзяюся, усё гэта стане справай цяперашняга і наступных пакаленняў музейшчыкаў-збіральнікаў.

Уклад у беларускую культуру такіх дзеячаў, як Алена Аладава і Юрый Карачун, такі значны і вялікі, што яго нельга забываць ні пры якіх абставінах. Яны заклалі такі магутны фундамент для нашага музея, што ў наступныя перыяды, нягледзячы на розныя верагодныя калізіі, яго проста немагчыма разбурыць — ніколі і нікому. Вось чаму лічу неабходным, выказваю такую прапанову: у бліжэйшы час узнавіць, зрабіць мемарыяльным кабінет ранейшых дырэктараў музея А. Аладавай (1944-1977) і Ю. Карачуна (1977-1997). Бо гэта — больш паўстагоддзя нашай збіральніцкай гісторыі!

Надзея ВЫСОЦКАЯ,
доктар мастацтвазнаўства,
загадчык аддзела Дзяржаўнага мастацкага музея Беларусі.

З пошты

Дзякуй за матэрыялы пра Нясвіж!

Вельмі ўдзячны за надасланы ліст, а таксама за цікавыя матэрыялы пра тое, што замак і касцёл у Нясвіжы ўнесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Весткай вельмі мы ўзрадаваліся і маем надзею, што ўнясенне стане істотным крокам наперад, абуджаючы свядомасць і жаданне наведваць гэтае фантастычнае месца.
З павагай,

Марцін РАДЗІВІЛ (Варшава).

Таямніцы Чорнага тракта

Вядома, што пасля паражэнняў пад Барадзіно і пры пераправе праз Бярэзіну армія Напалеона ў пачатку зімы 1812 года адступала праз Маладзечна, Смаргонь, Ашмяны на Вільню. Але шлях французскай арміі пасля Ашмян добра не даследаваны. Вядома толькі, што яе ўжо трывожылі казацкія атрады. Таму, як сцвярджаецца ў некалькіх крыніцах, давялося па дарозе закапаць скарбы, нарабаваныя ў Маскве, ці, прынамсі, іх частку.

З маіх назіранняў вынікае, што французы былі вымушаны часткова адступаць не напрасткі, а кружным шляхам — так званым Чорным трактам, які пралягае праз сённяшнюю Астравеччыну. Пра гэта сведчаць курганы каля вёскі Слабодка, якія выразна маюць не старажытнае паходжанне, у народзе называюцца "французскімі".

А ў адным месцы на Астравеччыне ўзвышаецца цэлая гара, насыпаная са жвіру і торфу. Сёння яна парасла дрэвамі. Людзей, што яе насыпалі, маглі знішчыць, каб не выдалі таямніцу. Таму, каб пазбегнуць марадзёрства, канкрэтную мясціну не называю і я, хоць далучаю яе фота. Але дакладны адрас перасылаю рэдакцыі "Голасу Радзімы", каб яна пры патрэбе перадала яго кампетэнтным спецыялістам — музейным работнікам, археолагам ці прадстаўнікам Пасольства Расійскай Федэрацыі.

Што знаходзіцца ў штучнай гары — нарабаваныя скарбы ці парэшткі французскіх воінаў — сёння не ведае ніхто. Надзіва маўчыць пра паходжанне гары і мясцовая традыцыя — няма ніякіх паданняў, легендаў. Гэта насцярожыла мяне яшчэ з дзяцінства. А ў сталым узросце рашыў звярнуцца да органаў улады. Доўга кружылі мае лісты. Нарэшце атрымаў адказ з Астравецкага райвыканкама: ваш ліст быў накіраваны ў акадэмічны Інстытут гісторыі. А адтуль прыйшоў адказ, што, маўляў, прадстаўленая мною інфармацыя "мае акрэсленую навуковую цікавасць, і можа быць зроблена вонкавае абследаванне з далейшымі археалагічнымі раскопкамі. Указаныя работы могуць быць зроблены на аснове гаспадарчай дамовы пры ўмове яе фінансавання".

Але... адкуль у нашага райвыканкама сродкі на тыя археалагічныя раскопкі?! Па-мойму, справа мае як грамадскае, дзяржаўнае, так і міжнароднае значэнне.

А можа яна вырашыцца ў 2006 годзе з дапамогай "Голасу Радзімы", кагосьці з яе зацікаўленых чытачоў?

Станіслаў АЛЕКСАНДРОВІЧ.
(г. п. Астравец Гродзенскай вобласці).

Сітуацыя

Вітаўтаў пояс усё ж не купілі...

"Голас Радзімы" ўжо неаднаразова пісаў пра сярэбраны, з пазалотай, па-мастацку зроблены пояс, які быў знойдзены ў час земляных работ каля вёскі Літва Маладзечанскага раёна і таму павінен лічыцца дзяржаўнай уласнасцю. Але потым ён быў куплены ў Дзяржаўным музеі гісторыі і культуры Беларусі за смешную цану (5 тысяч долараў) расійскім прадпрымальнікам, які працуе ў Мінску. Другі падобны пояс трапіў за граніцу і адтуль прапаноўваўся для куплі Эрмітажу. Прафесар Валянцін Рабцэвіч, аўтар артыкулаў у "Голасе Радзімы", аргументавана даказаў, што беларуская рэліквія № 2 (другая пасля Крыжа Ефрасінні Полацкай) была ў свой час падаравана крымскім ханам Хаджы Гірэем князю Вялікага княства Літоўскага Вітаўту. Але па дарозе нешта прымусіла людзей, якія везлі паясы і грошы, часова схаваць іх каля вёскі з сімвалічнай назвай.

І вось гістарычную каштоўнасць уладальнік выставіў на аўкцыён у вядомым ужо (асабліва па скандалу з карцінай Марка Шагала) антыкварна-аўкцыённым доме "Paragis", ацаніўшы яе ў 80 тысяч долараў, гэта значыць рашыў павялічыць сваю маёмасць (фактычна за кошт дзяржавы), прынамсі, у 16 разоў. Пры тым, што "Голас Радзімы" ставіў пытанне прынцыпова і прама: пояс "належыць дзяржаве і не можа быць прададзены ў прынцыпе". Праўда, уладальнік (тут мы спасылаемся на газету "Рэспубліка") прапанаваў і Міністэрству культуры купіць тую ж археалагічную знаходку, але ўжо не за ранейшую, а за новую цану. І цяпер "пралічваюцца розныя варыянты пошуку сродкаў і мэтазгоднасць такой пакупкі".

Сенсацыя ж, як нам падаецца, заключаецца ў тым, што ў час аўкцыёна так і не знайшлося адважных, хто б выклаў належную суму (а меркавалася давесці цану да 600-700 тысяч долараў) за гістарычную і мастацкую каштоўнасць, месца якой — у дзяржаўным музеі. Прытым — у асобнай вітрыне ці нават асобным пакоі.

Тамара ШКУРКО.
Фота Аляксандра КАНАТОПА.

Знойдзены рукапіс пра палескую вёску Чудзін

У бібліятэцы Галоўнай гандлёвай школы ў свой час мне ўдалося натрапіць на цікавы рукапіс. Гэта — дыпломная праца колішняга студэнта гэтай школы Р. Ралецкага. Прысвечана яна грамадска-гаспадарчым узаемаадносінам паміж сялянамі вёскі Чудзін былога Лунінецкага павета.

Памятаецца, часткова выкарыстаў каштоўныя звесткі з гэтага рукапісу, калі пісаў сваю кнігу пра Палессе. Нічога не ведаю пра самога аўтара, але, думаю, звесткі пра яго пры патрэбе знойдуцца ў асабістых справах студэнтаў Галоўнай гандлёвай школы.

У мяне няма сумненняў, што аўтар добра ведаў вёску, можа, нават там жыў (сын настаўніка?) і прадставіў чытачу вельмі цікавы малюнак мясціны ў адсталым кутку былой Рэчы Паспалітай, дзе "найбольшым аўтарытэтам быў паліцыянт", а ўмовы жыцця заставаліся яшчэ вельмі цяжкімі, амаль першабытнымі. Ёсць там — наколькі памятаю — фатаграфіі. Для сучаснага этнографа, асабліва беларускага, гэта можа быць сапраўдным скарбам.

Сумняваюся, ці ўдасца выдаць такі рукапіс у Польшчы, хаця ёсць намеры зацікавіць універсітэцкіх выдаўцоў. Аднак, можа будуць магчымасці выдаць працу па-беларуску ў Мінску? Вядома, у нас у апошні час ускладніўся доступ да рукапісаў, таму што здараюцца плагіяты, якія складана высачыць. Зняцце копіі і перавоз яе праз мяжу таксама патрабуюць пэўных фармальнасцей. Але яны пераадольныя. Праца, якая паўстала 70 гадоў таму, варта новага жыцця!

Ежы ТАМАШЭЎСКІ,
прафесар (Варшава).

Латвія

Віншую ўсіх чытачоў і супрацоўнікаў "Голасу Радзімы" з Новым 2006 годам і Раждаством Хрыстовым!

Зычу ўсім моцнага здароўя, дабрабыту, добрага, сонечнага настрою, плёну на ніве роднай культуры! Няхай "Голасу Радзімы" заўсёды шчасціць на добрых людзей і цікавыя сустрэчы са сваімі суайчыннікамі!

Станіслаў ВАЛОДЗЬКА,
Даўгаўпілс.

Украіна

Ганарымся табою, Ксеня!

— Пачатак на 1-й стар. —

вітыя дзеці. І перамога ў бельгійскім Хасельце Ксені Сітнік — яскравае гэтаму пацвярджэнне! Усе 16 краін, якія прымалі ўдзел у тэлефонным галасаванні, не абмінулі сваёю ўвагай нашу таленавітую дзесяцігадовую Ксеню Сітнік з Мазыра...

А закончу дзяліцца сваімі ўражаннямі заўвагаю на моўную тэму: прадстаўнікі усіх краін спявалі песні на сваіх родных мовах, як таго і патрабуюць правілы правядзення конкурсу дзіцячай песні на Еўрабачанні, апрача нашай пераможцы Ксені Сітнік, якая спявала "на адной з дзяржаўных моў краіны", а не на мове этнасу, які даў назву гэтай краіне! Калі вядучы конкурсу ў перапынку гутарыў па-англійску з Ксеняй і прасіў яе сказаць, як гучыць па-беларуску тое ці іншае слова ці словазлучэнне, наша "птушачка" на прыгожай беларускай мове перакладала англійскія словы і спалучэнні слоў вокамгненна! А гэта гаворыць пра тое, што яна дасканала валодае беларускай мовай і змагла б цудоўна праспяваць песню па-беларуску. Мне асабіста, як беларусу, які прытрымліваецца паўсюль сваёй беларускасці, было няёмка чуць з вуснаў вядучага вось такую фразу: "Ты замечательно спела, правда, на русском языке..." Хочацца спадзявацца, што ў Румыніі ўжо іншы выканаўца ад Беларусі праспявае сваю песню ўсё ж па-беларуску...

Наступнае спатканне з Ксеніяй Сітнік адбудзецца ўжо на чацвёртым дзіцячым конкурсе Еўрабачання ў Румыніі, дзе яна будзе ўручаць узнагароду новаму пераможцу і падорыць нам са сцэны песню "Мы разам" (спадзяюся, што ў Беларусі ёсць шмат таленавітых паэтаў-перакладчыкаў). І няхай гэта будзе яе маленькім, але вельмі дарагім падарункам усім нам, беларусам, якія жывуць за межамі сваёй гістарычнай Бацькаўшчыны і не цураюцца роднай мовы!

Мы сапраўды павінны быць разам, адзіным цэлым са сваёй гісторыяй, культурай, мовай!

Ксеня, ганаруся тваёй перамогай, удзячны тваім бацькам, настаўнікам, сябрам па сцэне і жадаю табе новых перамог!

Пятрусь КАПЧЫК.

"Над маім лунае лёсам Беларусь мая..."

50-ы, юбілейны год для нашай газеты завяршаюць Дні "Голасу Радзімы" ў беларускіх суполках Эстоніі

СУСТРЭЧА Ў НАРВЕ

Арганізацыю паездкі ўзяла на сябе энергічная Людміла Аннус — намеснік старшыні суполкі беларускай культуры "Сябры". У творчую групу былі ўключаны нашы сябры — спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Надзея Мікуліч, маладая спявачка і кампазітар Наталля Санамян, канферансье Юрый Хітры і актыўны пазаштатны аўтар газеты, знаўца беларускага фальклору, мастацкі кіраўнік самадзейных калектываў і танцор Мікола Котаў, якога добра ведаюць беларусы свету. Загадзя была складзена праграма сустрэч з беларусамі рэгіёна. І вось мы нарэшце ў Нарве, якая апранулася ў першы снежны строй, і дзе нас, як родных, сустрэлі — старшыня суполкі "Сябры" Канстанцін Браім, яго намеснік Людміла Аннус, адзін з першых старшынь суполкі Аляксандр Парцянко і яго жонка Галіна, актывістка Ларыса Кузьмінічна Еськіна.

НОВЫЯ ЗНАЁМСТВЫ

Размясцілі нас у лепшай гасцініцы горада, а потым запрасілі на вячэру да Соф'і Сяккі. Там сабраліся актывісты суполкі: Канстанцін Браім, Людміла Аннус, сям'я Парцянко і іншыя. Не было канца пытанням пра Беларусь. Частаваліся смачнымі пірагамі і спявалі беларускія песні. Усе прысутныя жанчыны ўваходзяць у склад самадзейнага калектыву — ансамбль песні "Сябры". Было такое адчуванне, што мы сядзім дзе-небудзь у гасцях у Беларусі. Мікола Котаў прывёз ноты беларускіх песень і відэазапісы танцаў. Гаварылі пра жыццё-быццё. Было шмат пытанняў пра эканоміку Беларусі. Расказвала, што беларускія трактары, вялікія самазвалы карыстаюцца попытам у іншых краінах, што ў краіне шмат робіцца для адраджэння вёсак і малых гарадоў. Многія суайчыннікі ўзгадвалі, што гасцілі ў сваякоў і дзівіліся на добрыя дарогі і на дагледжанасць палеткаў. Параўноўвалі жыццё ў Беларусі і ў Эстоніі. Нашы суайчыннікі вельмі шкадавалі, што ў Нарве пазакрываліся буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы, на якіх раней многія працавалі. Цяпер жа моладзь пакідае Нарву ў пошуках працы. Так што ў некаторых сем'ях нехта паехаў працаваць у Расію, а нехта ў Фінляндыю ці ў сталіцу Эстоніі Талін.

Старшыня суполкі Канстанцін Браім — малады энергічны беларус — трывала ўладкаваўся на працу ў Нарве. Нядаўна быў у Швецыі на стажыроўцы: асвойваў новае абсталяванне. Вывучыў эстонскую мову і здаў неабходны для атрымання эстонскага грамадзянства экзамен. Жонка таксама мае працу. Дзеці нарадзіліся ў Эстоніі і адукацыю збіраюцца атрымліваць тут. Мае працу па спецыяльнасці і Людміла Аннус: працуе на мэблевай фабрыцы, на якую трапіла яшчэ па размеркаванні з часоў СССР пасля заканчэння Ленінградскага інстытута. У Соф'і Сяккі, якая тут у Нарве выйшла замуж за фіна, сыны паехалі ў пошуках працы ў Фінляндыю. Муж знайшоў працу ў Расіі. У сям'і Парцянко двое дзяцей уладкаваліся ў Эстоніі, а старэйшая дачка прыехала жыць у Беларусь, тут у Мінску ў Лінгвістычным універсітэце вучыцца іх унучка.

Па-рознаму складваюцца лёсы... Але ўсе былі адзінадушныя — незалежна ад таго, калі пакінулі Беларусь, адчуваюць з ёй непарыўную сувязь. І ад гэтага — імкненне быць разам і цікавасць да любой інфармацыі з Радзімы.

БЕЛАРУСКАМУ АБ'ЯДНАННЮ Ў СІЛАМЯЭ — 1 ГОД

Чарговая сустрэча з эстонскімі беларусамі адбылася ў прыгожым Доме культуры ў горадзе Сіламяэ. Горад знаходзіцца кіламетрах у 25 ад Нарвы. Тут у Сіламяэ толькі год назад зарэгістравана беларускае культурнае таварыства "Крыніца" (кіраўнікі муж і жонка Сяргей і Таццяна Тульжэнкі).

Цікавасць да Беларусі вялікая і не толькі ў беларусаў ці ўраджэнцаў Беларусі. Нас запрасілі ў гарадскую газету "Сіламяэский вестник", і намеснік галоўнага рэдактара Мікалай Клачкоў задаваў нам пытанні пра жыццё на Беларусі: як працуюць беларускія прадпрыемствы, якую дапамогу ўрад аказвае вёсцы, ці цяжка ўладкавацца на працу і шмат іншых, цікавіліся і нашай газетай. Некалькі апошніх нумароў мы ім падаравалі. Пагартаўшы старонкі, рускамоўныя журналісты сказалі, што беларускую мову можна зразумець без перакладчыка. Адзначылі якасць афармлення і дызайн газеты. Мы дазволілі перадрукаваць інтэрв'ю з Надзеяй Мікуліч. Вельмі іх зацікавіў сайт газеты "Вітае Беларусь!" — Belarus21.by. Сказалі, што цяпер абавязкова будуць заходзіць на яго, каб даведацца пра апошнія беларускія навіны.

А вечарам ў Доме культуры зала была поўная. Напачатку мне далі слова, каб расказаць прысутным пра газету "Голас Радзімы", якая 50 гадоў нясе сваім суайчыннікам у 52 краінах весткі з Беларусі пра эканоміку, знаёміць чытачоў з культурай і звычаямі беларускага народа. А паколькі ў горадзе многія маюць магчымасць выхаду ў Інтэрнэт, дала параду ўсім, хто хоча ведаць пра Беларусь, заходзіць на сайт Belarus 21. by.

У вестыбюлі апошнія нумары газеты былі раскладзены на стале. Вельмі хутка яе ўжо не было. Пасля прадстаўлення газеты гучалі песні ў выкананні Надзеі Мікуліч і Наталлі Санамян, жарты канферанс'е Юрыя Хітрага. У зале былі беларусы, рускія, украінцы, эстонцы. Не ўсе ведалі беларускую мову, але беларускія байкі, якія расказваў Юрый, былі зразумелыя ўсім. Гэта адчувалася па рэакцыі залы. А як выйшаў на сцэну з бубнам Мікола Котаў, каб выканаць "Беларускую польку", яго сустрэлі бурнымі апладысментамі.

Пасля канцэрта Мікола Котаў як аўтар рубрык пра народныя абрады ў газеце "Голас Радзімы" адказваў на пытанні пра звычаі і традыцыі, правёў майстар-клас для маленькіх самадзейных артыстаў. Так усе разам мы прадстаўлялі "Голас Радзімы".

БЕЛАРУСКАЯ ПРЫСУТНАСЦЬ У ІДА-ВІРУМАА

На наступны дзень наша творчая група паехала па запрашэнні Згуртавання беларускай культуры "БЭЗ" у Іда-Вірумаа. У праграму Дзён газеты "Голас Радзімы" было ўключана правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю беларускага пісьменніка Янкі Скрыгана. У мяне былі падарункі ад дачкі пісьменніка — Галіны Іванаўны — кніга ўспамінаў пра пісьменніка, якая толькі што выйшла яе намаганнямі ў выдавецтве "Беларускі кнігазбор" і беларускія газеты з артыкуламі, прысвечанымі творчаму і жыццёваму лёсу пісьменніка.

Мерапрыемства пачалося ў парку па Кескпуйестэа ў Ківіылі, дзе адкрыты намаганнямі беларускай суполкі, пры падтрымцы беларускага і эстонскага бакоў памятны камень з барэльефам у гонар знаходжання Янкі Скрыгана ў Эстоніі. Увагі заслугоўвае не толькі творчасць пісьменніка, журналіста і перакладчыка, але і яго драматычны лёс. Я.Скрыган быў рэпрэсіраваны і амаль 20 гадоў пражыў за межамі Беларусі, але заўсёды яго прыцягвала беларускае слова, Беларусь. У Эстоніі ён пражыў нядоўга, але захаваў аб сабе вельмі добрую памяць.

Аб гэтым на мітынгу каля помніка гаварылі старшыня Згуртавання беларускай культуры "БЭЗ" Маргарыта Астраумава, Генеральны консул Беларусі ў Эстоніі Аляксандр Астроўскі, намеснік мэра горада, які, дарэчы, сказаў, што плануецца ў школе арганізаваць музей Я. Скрыгана. Каля помніка я перадала прывітанне і падарункі ад дачкі пісьменніка.

А потым у Народным доме адбыўся вечар памяці Яна Скрыгана. Спачатку сіламі актывістаў "БЭЗа" была выканана літаратурная кампазіцыя па кнізе ўспамінаў пісьменніка "Кругі", прагучаў верш нашага сталага аўтара Паўла Дзегцерука "Начамі ён сніў Беларусь...", прысвечаны пісьменніку. Затым старшыня суполкі Маргарыта Астраумава вітала газету "Голас Радзімы" з юбілеем і гаварыла, якая яна патрэбная для беларусаў, колькі цікавага знаходзяць на яе старонках беларусы Эстоніі, адзначыла, што ў апошні час газета стала яшчэ больш цікавай, палепшылася паліграфічная якасць выдання. У працяг мерапрыемства адбыўся канцэрт нашай творчай групы, якую і тут віталі вельмі цёпла.

Назад у Нарву з намі ў аўтобусе ехалі члены беларускай суполкі, якія ўдзельнічалі ў гэтым вечары, нехта з іх завёў: "Над маім лунае лёсам Беларусь мая..." Развіталіся цёпла, зацікаўленыя трымалі апошні нумар газеты "Голас Радзімы", які толькі трапіў на рассылку.

"БЕЛАРУСЬ -TV" — ВЕСТКІ З ДОМУ

Вечарам усе мы былі прыкаваны да тэлевізара: глядзелі дзіцячае "Еўрабачанне-2005". Кожны ў сваім пакоі хварэў за вынік, а калі стала вядома, што наша Ксюша Сітнік стала пераможцай, у пакой да Надзеі Мікуліч збеглася ўся група. Чаго не чакала, дык гэта ўбачыць слёзы на вачах у прафесійнай спявачкі. Яна патлумачыла, што ведае, як цяжка быць самнасам з вялікай аўдыторыяй, і якая малайчына Ксенія, што вытрымала ўсе выпрабаванні і не разгубілася ды і добра праспявала. Мы ўсе абдымаліся і віншавалі адзін аднаго. Дзякуй нашаму каналу "Беларусь -TV", які даў такую магчымасць.

"Голас Радзімы" цесна супрацоўнічае з "Беларусь -TV", інфармуе пра праграму перадач, яго імклівае прасоўванне ў сусветнай тэлепрасторы. Мы, дарэчы, пастаянна чулі падзякі не толькі ў адрас газеты, а і ў адрас гэтага канала. Да нас падыходзілі пасля канцэртаў і гаварылі: "Вы, беларусы, малайцы! Так трымаць!" Пагалоска аб тым, што ў Беларусі працуюць буйныя нашы прадпрыемствы, што іх не прадалі на водкуп іншаземцам, вызывае павагу ў многіх жыхароў Эстоніі. Казалі, вы, можа, там і не ведаеце, як гэта цяжка, калі добры завод закрыты, яго карпусы разабраны і па тэрыторыі гуляе вецер. А яшчэ ўсе, хто да нас падыходзіў і каму даводзілася ці праязджаць па тэрыторыі Беларусі, ці бываць тут, таксама выказвалі сваё захапленне чысцінёй беларускіх гарадоў і ўпарадкаванасцю палёў.

ЗАКЛЮЧНАЯ СУСТРЭЧА Ў НАРВЕ

На трэці дзень з раніцы нас запрасілі на экскурсію ў Нарвскі замак. Суправаджала наша зямлячка Ларыса Кузьмінічна Еськіна.

Пасля экскурсіі, днём, адбылася трэцяя, заключная сустрэча з нашымі сябрамі: яна праходзіла ў самай вялікай зале Нарвы — Доме культуры "Ругадзіў". Рэклама, якая прайшла па мясцовым радыё і ў мясцовых газетах, не была дарэмнай. У зале аншлаг. Сустрэчу адкрылі кіраўнікі таварыства беларускай культуры "Сябры" — Канстанцін Браім і Людміла Аннус. Віталі гасцей з Беларусі, віншавалі сваю газету з юбілеем, казалі, што газета дапамагае ім падтрымліваць сувязь з Радзімай, наталяе родным словам. Потым ансамбль "Сябры" задушэўна выканаў беларускія песні. А далей, як заўсёды, шчырымі апладысментамі надзялялі кожнае выступленне нашых прафесійных артыстаў.

Пасля людзі падыходзілі да нас, каб падзякаваць за газету, за канцэрт. А адна жанчына падрыхтавала і перадала для публікацыі ў "Голасе Радзімы" пісьмо (ГР №48-50).

Цікавасць да нашай дэлегацыі была вялікай і ў Нарве. Рэдактары дзвюх газет — "Нарвскай Газеты" і "Нарва" таксама распытвалі нас пра Беларусь. Іх цікавіла ўсё: пра адносіны да Саюза Беларусі і Расіі, пра зарплаты, пра апазіцыю... Мне спадабалася, як пра Саюз Беларусі і Расіі адказаў Мікола Котаў: "Народу не патрэбна аб'ядноўвацца, бо ён і не раз'ядноўваўся..."

Шчырым і добрасардэчным было развітанне. Доўгай дарогай назад мы абмяркоўвалі наша падарожжа, і ўсе як адзін былі ўдзячныя за шчодрасць і цеплыню ўсім нашым суайчыннікам, што спрыялі гэтай паездцы, а ў мяне мацавалася ўпэўненасць, што колькасць чытачоў у Эстоніі пашырыцца і "Голас Радзімы", сайт газеты "Вітае Беларусь!" — Belarus21.by будуць надзейнай інфармацыйнай крыніцай.

Таццяна КУВАРЫНА.

Мінск-Нарва-Сіламяэ-Іда-Вірумаа-Нарва-Мінск.

НА ЗДЫМКУ: госці з Беларусі ў офісе таварыства "Сябры" горада Нарвы.

Сяргей ТРАХІМЁНАК

Родная крывінка

Чаму Галіна Яфімаўна памятае лепей за ўсё сорак чацвёрты? Можа таму, што ён багаты на сумотныя падзеі, а можа таму, што ёй тады ўжо было сем гадоў.

Маці ўсё болей прывязвалася да Лізкі, зрэшты, як і тая да маці. Хадора, спрабуючы ўмацаваць ёй ножкі, часта трымала яе на руках, а тая скакала, упіраючыся ў калені маці.

— Ліза, Ліза, Лізавета — развясёлая кабета, — паўтарала маці адзін і той жа радок нейкай песні.

***

Набліжалася лета сорак чацвёртага. Усе разумелі, што хутка акупацыі прыйдзе канец. Сталі рыхтавацца да таго, каб пайсці ў лес на час адыходу немцаў. Людзі баяліся, каб фашысты перад адступленнем не пачалі помсціць мясцовым жыхарам за сваё паражэнне.

Маці, быццам адчуваючы хуткае развітанне з Лізкай, пачала гаварыць аб тым, што Кандрат — чалавек рызыковы, ён да канца вайны не дажыве, і тады Лізка застанецца ў нас.

— А Ксенія? — пытаўся бацька.

— А што, Ксенія, — гаварыла маці, і логіка яе была па-сапраўднаму жаночай, — яна баба маладая, ёй замуж трэба будзе выходзіць за гарадскога, а каму яна патрэбна з дзіцём...

Але аднойчы майскай ноччу да нас прыйшоў Васёк і сказаў, што ў Кандрата з'явілася магчымасць адправіць Лізку і Ксенію самалётам на Вялікую зямлю, але маці не аддала дзяўчынку, і Васёк пайшоў ні з чым. У наступную ноч з'явіўся сам Кандрат.

— Пакінь дзіця, — гаварыла маці, — скончыцца вайна, тады і прыйдзеш.

— Усё, цётка Хадора, — сказаў сурова камандзір, — мае загады абмеркаванню не належаць.

Маці пачала мітусліва збіраць Лізку ў дарогу. А тая, быццам адчуваючы расставанне, пачала пішчаць. Тады маці зайшла за печ і стала карміць яе грудзьмі, прыгаворваючы:

— Усё добра, ну, ну... мая, мая... Але Лізка ніяк не магла супакоіцца, мусіць, трывога маці перадалася ёй.

— Заварочвай яе, Хадора, — патрабаваў Кандрат.

Маці спавіла Лізку і ўкутала зверху пуховай хусткай.

— Ноччу ў балотах вільготна, — сказала яна, — не прастудзіце яе.

І здавалася, што ўсё скончыцца добра, але ў апошні момант маці быццам страціла розум. Першы гэта зразумеў бацька, ён кінуўся да яе, абхваціў рукамі і прыжаў спінай да печы, інакш яна б выцарапала Кандрату вочы. Кандрат жа накіраваўся да дзвярэй, а Васёк, як сапраўдны ад'ютант, прыкрываў яго адыход.

Чуткі аб далейшым лёсе Лізкі былі супярэчлівыя. Казалі, што яе ўдалося адправіць самалётам у Маскву, а потым гаварылі, што самалёт не прыляцеў, і яе перадалі сваякам Кандрата, якія пасля вызвалення чамусьці адразу адправілі яе ў Ленінград.

Крыху пазней даведаліся, што ў тым жа маі загінула Ксенія. А Кандрат ад'ехаў у сталіцу і ў нашы мясціны не прыязджаў больш ні разу.

Наташка да пяцідзесятых гадоў стала ўжо дарослай і на ўсечасовыя прыставанні маці натісаць у Ленінград і расшукаць Лізку сказала аднойчы, што Лізка жыве ў Ленінградзе і пайшла ў школу, паколькі яна разумная, яе прынялі з шасці гадоў.

Маці адразу пачала ўспамінаць аб тым, як хутка Лізка вучылася размаўляць і, зразумела ж, была разумненькай.

— Вось Надзька, — гаварыла маці, — навучылася размаўляць у два гады, а Лізка, яна б... А ты адкуль гэта ведаеш?

— Аднакурснік па тэхнікуму ў Ленінградзе даведку рабіў, — адказвала, не маргнуўшы вокам, Наталля.

З тае пары ўсё і пачалося. "Аднакурснік" Наталлі стаў час ад часу паведамляць аб жыцці-быцці Лізкі. А маці доўга жыла кожнай навінай, паўтарала яе, каменціравала кожнае Лізкіна дзеянне.

Гэта хлусня дзеля ратавання пацягнула за сабой серыю іншых. Так паступова Лізка расла, часта хварэла, ляжала ў нейкіх дзіцячых бальніцах, але з гонарам спраўлялася з хваробамі.

— Галоднае дзяцінства, — гаварыла маці, — вось каб яе звазіць на поўдзень.

Праз год Лізка "пачала ездзіць на поўдзень" і ёй "стала лепей". Але лепш бы пра гэтыя "паездкі" Наталля і не гаварыла. Маці стала цікавіцца, якім поездам Лізка ездзіць на поўдзень?

— І чаго ёй не заехаць да нас у госці, — гаварыла маці, — не чужыя ж мы ёй. Вось ты, Галя, яе на руках цягала, хоць сама была да печкі вяршок...

Але Лізка так і не заехала да маці. А потым і зусім закруцілася: паступіла ў інстытут, скончыла яго выдатна, стала працаваць у нейкай важнай установе. Потым выйшла замуж. Але дзяцей у яе так і не з'явілася. Наталля, памятаючы пра "паездкі Лізкі на поўдзень", інтуітыўна разумела, што маці можа пажадаць убачыць Лізкіных дзетак, можа папрасіць звязацца з Лізкай, або Лізаветай Кандрацьеўнай і папрасіць яе прывезці дзяцей на лета.

Потым з Наталляй здарылася няшчасце. Яна з мужам вярталася дадому, і машына ўрэзалася ў грузавік, які выехаў на іх паласу.

Калі горыч ад страты дачкі трохі сціхла, маці зноў стала ўспамінаць пра Лізку. І тады эстафету апавяданняў аб жыцці ў Ленінградзе Лізаветы Кандрацьеўны перайшла да Галіны. І Галіна стала рабіць гэта, як і Наталля, з тым толькі адрозненнем, што разумела грахоўнасць дзеяння. Неяк сярод ночы ёй раптам прыйшло азарэнне: а ці не пакараў Усявышні Наталлю за гэтую хлусню. Але спыніцца было ўжо немагчыма. Галіна разумела, што маці гэтага не вынесе.

Апавяданні пра Лізкіна жыццё Хадора прымала з гонарам і рэўнасцю адначасова. І толькі аднойчы выказала тую думку, якой некалі баялася Наталля.

— А вось народзяцца ў Лізкі дзеці, і будуць ездзіць да мяне на лета. А што, у нас тут добра: лес, балота, грыбы, ягады.

Але Лізка ўвесь час аддавала працы, і ёй было не да дзяцей. І

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

тады маці стала яе асуджаць за тое, што яна не думае пра дзяцей.

— Мусіць, ходзіць у паліто з гаржэткай, — гаварыла яна, — жыве ў шматпавярховым доме побач з Таўрычаскім садам. А хто аб ёй паклапоціцца, калі яна стане старой?

Пра Таўрычаскі сад маці ведала з кнжкі, якая была ва ўнука Сашкі, сына Наталлі.

І вось ужо і дачка Сашкі паступае ў інстытут. Хутка ляціць час.

Маці перажывала адсутнасць дзяцей у Лізкі, не заўважаючы, што сямейнае жыццё яе роднай дачкі Галі не складваецца, што яна разышлася з мужам і дзяцей у яе, хутчэй за ўсё, не будзе.

***

Учора зноў быў страшны дзень, пра які ўспамінаць не хочацца. У двор прыйшлі нейкія незвычайна апранутыя салдаты.

— Французы, — сказаў бацька.

На ломанай рускай мове яны папрасілі накрыць стол. Бацька паставіў на абрус чаркі, самагон, талерку з квашанай капустай і вялікую міску з бульбай.

Убачыўшы ўсё гэта, госці раззлаваліся.

— Партызанам — вялікая бульба, нам — маленькая, — залямантаваў адзін з іх.

І тут здарылася тое, чаго Галя не магла зразумець.

— Мы для сваіх дзяцей гатавалі, а не для вас, — сказаў бацька, а потым дадаў нешта на чужой мове, падобнай на буркаванне галубоў.

Французы павыскоквалі з-за стала і кінуліся да яго. А Галя саскочыла з печы і ўчапілася ў бацькаву нагу. Яна баялася, што французы яго забяруць. Так і стаяла, заплюшчыўшы вочы, слухаючы, як крычыць маці, і як аб нечым гавораць французы, патроху разумеючы, што інтанацыя іх гаворкі не нясе нічога страшнага. Ужо пасля вайны Галя даведалася, што ў Першую сусветную бацька быў у палоне, там навучыўся размаўляць па-нямецку і ведаў некалькі французскіх слоў.

Пры ўсім тым, што рацыён сям'і Прашковічаў быў небагаты, дзеці калі і не былі сытыя, але ж вялікага голаду не адчувалі.

З крапівы і шчаўя варылі суп, рыхтавалі грыбы, нават трыпутнік і кветачкі канюшыны збіралі, сушылі, таўклі ў ступе і выкарыстоўвалі як прыправы да супоў, баршчоў, балтушак з мукі і зацірак.

Але жаданне наесціся ад пуза прысутнічала заўсёды.

З часам маці стала адпускаць Галю ў лес з Наташкай, а часцей за ўсё са Сцёпкам. Вось і сёння Сцёпка лазіць па бярозах і збірае яйкі варон і сарок.

Часам ён спрабуе схапіць сароку, але ў круглых сарочых гнёздах два выхады, і калі ты ўсунеш руку ў адзін, то сарока імгненна выскачыць з другога. З варонімі гнёздамі яшчэ складаней, яны цалкам адкрытыя. Сцёпка трымае ў зубах за завязкі шапку, у якую складвае блакітна-зялёныя ў крапінку яйкі.

Вось ён спускаецца ўніз. Галя разглядае здабычу, радуецца, што тонкія шкарлупіны не пашкодзіліся. Сцёпка разводзіць агонь і ў яго зале пячэ яйкі. Рабіць гэта трэба асцярожна, каб яны адразу не патрэскаліся, не павыцякалі, не перамяшаліся з залой. Але ўсё роўна яйкі заўсёды падгараюць з аднаго боку. Сцёпка па-братэрску аддае Галі некалькі штук са сваёй долі, а потым адкусвае прынесеныя з дому вараную бульбу і хлеб, Галя з братам ядуць здабычу.

— Маці не гавары, — папярэджвае брат, калі яны вяртаюцца дадому, — што мы сарочыя яйкі пяклі.

— Добра, — адказвае Галя.

Урэшце, ёй і ў галаву б не прыйшло расказаць аб гэтым маці. Сцёпка здаецца ёй вялікім і сур'ёзным хлопцам, які заўсёды абароніць ад небяспекі, і падводзіць Сцёпку яна не будзе, хаця Галя да канца не разумее, што дрэннага ў тым, што яны пяклі і елі сарочыя яйкі.

Сцёпка рушыць наперадзе, а Галя пляцецца за ім. І ёй не страшна ў лесе, таму што з ёй старэйшы брат, які, аднак, зусім нядаўна ледзь было не падвёў усю сям'ю.

Ужо з першых месяцаў акупацыі ў жыхароў склалася негалосная дамоўленасць — у выпадку небяспекі ўсім знаходзіцца дома ці ў адным месцы.

— Калі здарыцца што, так усім адзін канец, — паўтаралі бацькі.

Сцёпка быў у суседзяў, калі пачуў гук матацыклетных матораў. Ён выскачыў з хаты Ганны Балоткі і кінуўся дадому.

Калі немцы ўбачылі хлопчыка, які бег, акружылі хату Прашковічаў, абшукалі ўсе куткі, гарышча, запечча. Яны думалі, што Сцёпка бяжыць папярэдзіць партызан, якія хаваюцца ў хаце.

***

Ужо працуючы выкладчыкам на гістарычным факультэце, Галіна Яфімаўна спрабавала ў архівах знайсці ўпамінанне аб атрадзе Кандрата, яго асабістым складзе. У кнігах пра партызанскі рух брыгад з назвай "Смерць фашыстам" было некалькі дзесяткаў. Але Галіна Яфімаўна адшукала і Барадзіна, і Кандрата. Кандрат лічыўся камандзірам асобнай дыверсійнай групы.

Далей ішлі зводкі і справаздачы аб дзейнасці брыгады, яе атрадаў і груп і нічога болей.

Тады яна пачала шукаць сведкаў. Марудна, па крупінках яна аднавіла карціну той блакады, у якую трапіла ў маі сорак чацвёртага група Кандрата.

А пасля таго, як аднавіла, з яшчэ большай рэўнасцю стала расказваць маці аб Лізцы.

Бацька памёр у семдзесят пятым, маці перажыла яго на пятнаццаць гадоў. З часам яна стала ўсё менш успамінаць аб "роднай крывінцы".

— У яе сваё жыццё, — неяк філасофскі адзначыла яна і больш ніколі не пыталася ў дачкі, што там чуваць пра Лізавету Кандрацьеўну.

І толькі перад смерцю раптам сказала:

— Памру, мусіць, хутка...

— З чаго гэта ты раптам? — пачала было Галіна.

— Лізка сёння прыснілася...

Пасля смерці маці ў Галіны Яфімаўны не было патрэбы расказваць аб жыцці ў Санкт-Пецярбургу яе прыёмнай дачкі. І аб існаванні Лізаветы Кандрацьеўны ў сям'і Прашковічаў не ўспаміналі.

***

Май сорак чацвёртага. Немцы блакіравалі суседнюю партызанскую брыгаду. І па супадзенні абставін у блакаду трапіў і атрад Кандрата. Такты ка партызан у такіх выпадках была простая: разбіцца на маленькія групы і спрабаваць прарвацца. Але Кандрат не стаў дзяліць свой атрад.

Не маючы магчымасці атрымаць у мясцовых жыхароў харчы, адхіляючыся ад пошукавых груп праціўніка, ат[illegible] спрабаваў намацаць месцы, [illegible] можна было пайсці на прарыў ці выскачыць з акружэння незаўважанымі. Але куды б яны не выходзілі, паўсюль былі немцы, стаяла ваенная тэхніка, і гучнагаварыцелі пераконвалі партызан здацца і атрымаць ратаванне ад нямецкага камандавання, памыцца ў лазні і добра паесці.

Заставалася адна надзея на выхад да стыку двух лясных масіваў. Можна было паспрабаваць прарвацца менавіта там, хоць ніякіх дадзеных, што там няма праціўніка ці праціўнік мае малыя сілы, у камандзіра не было.

Наперадзе, у межах бачнасці, былі спіны двух дазорных, астатнія ж ішлі адной групай. Байцы не спалі і не елі некалькі дзён. Незадаволенасць рашэннем Кандрата не разбіваць атрад на групы расла і перакідзіла ў гул. Ксенія несла на руках Лізку, час ад часу даючы ёй пасасаць анучку, у якую быў замотаны сухар. Але гэта ўжо не падабалася дзіцяці, і тая стала пішчаць.

— Пакінь яе, — сказаў Кандрат жонцы.

Тая адмоўна матнула галавой. Кандрат, які не прывык да спрэчак, зняў з пляча Ваські шмайсер.

— Пакінь... на купіне.

Ксенія, спатыкаючыся і азіраючыся на мужа, ці не перадумае ён, паклала свёртак, які ўвесь час пішчаў, на балотную купіну.

— Ідзі, — сказаў Кандрат ёй, указваючы ствалом аўтамата ў бок, куды рушыў атрад.

Васёк пацягнуў Ксенію за сабой, а Кандрат застаўся, у чаканні, калі апошні з яго байцоў схаваецца за ствалінай дрэваў.

Сярод мноства лясных гукаў плач дзіцяці было добра чуваць. Але раптам ён скончыўся. Лізка, нібы адчуваючы, што менавіта ад гэтага залежыць яе жыццё, змоўкла.

Ксенія вырвалася з рук Ваські і пабегла назад. Аднак плач пачуўся зноў, але... прагучала кароткая аўтаматная чарга, і Лізка больш не плакала.

У той жа дзень група Кандрата прарвалася на стыку двух лясных масіваў, страціўшы дзве трэці свайго складу. Сярод загінуўшых была і жонка Кандрата Ксенія. Тыя, хто застаўся жывы, гаварылі, што яна шукала смерці, і тая прыйшла да яе.

***

На наступны дзень Галіна Яфімаўна адстаяла службу ў Саборы Пятра і Паўла.

Яна позна прыйшла да Бога. У храм ходзіць час ад часу, дрэнна разбіраецца ў абрадах і не ведае шмат малітваў. Але кожны год у канцы мая заўсёды наведвае Сабор Пятра і Па[illegible]

З пачутага ў час службы і нейкай логікі малення яна склала сваю малітву, у якой просіць прабачэння за тую шматгадовую хлусню, і... супакаення душы Рабы Божай Лізаветы... на полі боя забітай.

Пераклад з рускай мовы Дзіяны ГРЫШАНАВАЙ.

Заканчэнне.

Пачатак у №№46-47, 48-50

Тузін музычных тузоў

"Прэм'ер тузін 2005". Мн., 2005. West records

Традыцыйна фінал года характарызуе надзвычайная актыўнасць музыкаў, выдаўцоў, прадзюсераў ды іншых актывістаў шоу-бізнесу. Гэтак сталася і сёлета, калі музычны партал "Music From By Net" наладзіў днямі ў сталічным більярдным клубе "Класік" прэзентацыю першага выдання сваёй двухгадовай ініцыятывы. Нягледзячы на парадыйны настрой маладых гульцоў музычнага пяра, прадукт у іх атрымаўся змястоўным, таму зацікавіўся ім знакаміты ва ўсім СНД лэйбл "West records", выданням якога заўсёды гарантаваны шырокі прамоўшн. Бадай, і варта.

Па-першае, упершыню меламан атрымае самы шырокі спектр самых новых твораў беларускіх поп-рок-зорак. І не бяда, што ў загалоўку абазначана стандартная працягласць музычнай праграмы новага дыска — тузін, гэта значыць дванаццаць трэкаў. Справа ў тым, што гэта толькі намёк на назву самога праекта — "Тузін хітоў", які кожную дэкаду месяца, спасылаючыся на галасы актывістаў музычнага сеціва, падбівае ўсё новыя і новыя гарачыя беларускія тузіны. Дык вось за сорак праведзеных этапаў назапасілася такая колькасць яркіх песень, што акрамя 12 самых-самых залатых шлягераў (ад мінскіх "Крамы" і "Party-zone", бярозаўскага ":B:N:", гродзенскай "Айшы") дыск здолеў уключыць і яшчэ тры дзесяткі небанальных твораў, якія мо і менш часта вылузваліся на слых Інтэрнэт-меламанаў, але таксама неаднойчы дасягалі вяршынь азначанага плебісцыту: медыявальная музыка "Старога Ольсы", меладычныя блюзы гурту "P.L.A.N."а, модныя хіп-хопавыя замесы "IQ48", няўрымслівы панк-рок ад "Нейра Дзюбеля" і "Жыгімонта Вазы", традыцыйная эстрада ад Ірыны Дарафеевай і Стэфана ды нават класічныя традыцыі ад "Camerata". Магчыма, нават самаму актыўнаму меламану, які мае ў сваім арсенале не толькі стандартны прайгравальнік, але і mp3, навінак для асэнсавання хопіць, прынамсі, на тыдзень. Дый потым застанецца ж нешта на доўгую памяць, як кажуць.

Прызнацца, калі я сачыў за самім працэсам гэтага творчага спаборніцтва, дзе былі і крыўды, і байкоты, і відавочныя падкручванні-адкручванні галасоў пэўным артыстам, не надта верылася ў нейкія аб'ектыўныя вынікі, а вось гляджу на канчатковы рэліз і... перасцярогі ў нейкай надзвычайнай неаб'ектыўнасці адыходзяць на другі план.

Безумоўна, дзівіць, што "Тузін" неяк умела абышоў, як тады казалі, "самы выбуховы дэбют 2004 года" — мінскі гурт "Tesaurus" (той самы, дзе вакаліста назвалі самым пявучым голасам беларускага року). З аднолькавай увагай падышлі адмыслоўцы хіт-парада да гурта "P.L.A.N.", які за справаздачны перыяд выдаў аж чатыры альбомы, і да гурту "Siver", які так і застаўся нікому невядомым са сваёй аднойадзінай песенькай.

І ўсё ж нельга не прызнаць, што найбольш значныя музычныя падзеі нашай краіны такі трапілі ў праект: ёсць тут і "Палац", і "Zet", і Зміцер Вайцюшкевіч, і "Guda", і "Postscriptum", і "J_Морс", і Аляксандр Памідораў, і Валік Грышко... Ёсць і лаўрэат "Славянскага базару" Пятро Ялфімаў, і нашыя дэбютанты "Еўрабачання" Аляксандра і Канстанцін. Усё ёсць. Амаль! Таму, прынамсі, для знаёмства з музычным жыццём краіны дыск будзе вельмі прыдатны.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

Лідэр групы "Новы Іерусалім" Аляксандр Патліс прадзюсіруе кліп нямецкага выканаўцы Дэні Плэта

У адным са сталічных клубаў прайшлі здымкі кліпа нямецкага выканаўцы Дэні Плэта на кампазицыю "Not a shamed" ("Я не саромеюся"). Прадзюсерам кліпа выступіў лідэр групы "Новы Іерусалім" Аляксандр Патліс.

"Здымкі кліпа для Дэні Плэта — гэта адзін з першых крокаў нашага беларуска-германскага праекта. Для мяне вельмі значна, што ўжо сёння заходнія выканаўцы прыязджаюць да нас і робяць сумесныя праекты, здымаюць відэа. Важна і цікава прадстаўляць у Беларусі добрых музыкантаў", — расказвае Аляксандр Патліс.

У кліпе Дэні Плэт іграе самога сябе. Ён спявае на сцэне. Публіка, якая прыйшла ў клуб на канцэрт, апранута ў чорную вопратку і чорныя акуляры, як і Дэні. Заканчэнне ўсё бойкай, у якой людзі з натоўпу збіваюць галоўнага героя Дэні Плэта, і тут з'яўляюцца анёлы, якія яго ратуюць.

Кліп Дэні Плэта пабудаваны ў традыцыях "Новага Іерусаліма" — на кантрастах свету і цемры, дабра і зла. Гэта не дзіўна — ідэю кліпа прыдумаў Аляксандр Патліс.

"Калі мой сябар з Беларусі адкрыў для мяне творчасць "Новага Іерусаліма", я быў натхнёны калекцыяй відэакліпаў, сабраных на DVD групы, — расказвае Дэні Плэт, — гэта і стала пачатковай кропкай у нашай сумеснай працы. І вось зараз паспеў час, калі я змог прыехаць у Беларусь".

Дэні Плэт — вядомы выканаўца хрысціянскай музыкі. Нарадзіўся ў Канадзе. З 4 гадоў жыве і працуе ў Германіі. Яго хіты: "Not a shamed", "Heaven", "You heal my wounds".

У межах гэтага праекта адбудзецца сумесны тур па гарадах Беларусі Дэні Плэта, "Новага Іерусаліма" і іншых груп, які ўжо запланаваны на 2006 год. Не выключана, што ў далейшым "Новы Іерусалім" і Дэні Плэт таксама адыграюць некалькі канцэртаў па Заходняй Еўропе.

Падрыхтавала Ганна ГАРЭЛІК.



Беларускі салавей... з Амерыкі

Данчык. "Я ад вас далёка". Мн., 2005. "БМАgroup"

У адным са сваіх пераднавагодніх прэс-рэлізаў музычна-выдавецкі лэйбл "БМАgroup" гаварыў аб падрыхтоўцы цэлай серыі перавыданняў на кампакт-дысках найбольш эпахальных альбомаў беларускай поп-музыкі апошніх дзесяцігоддзяў ("Ліцвіны", "Kriwi", "Палац", "Znich", "Народны альбом"). Ім спаўнялася то 5, то 10, то 15, а часам і 20 гадоў. Самай уражваючай аказалася першая ластаўка гэтага праекта — кампакт-дыск лепшага альбома Данчыка "Я ад вас далёка", які выпусціла ў 1985 годзе амерыканская фірма "Presswell Records". Тады гэта была яшчэ вінілавая кружэлка.

Прапаноўваючы ўпершыню гэты рэліз на кампакт-дысках, новы выдавец ("БМАgroup") палічыў магчымым аздобіць праграму кружэлкі пэўнымі дадатковымі падарункамі: адмысловым бонус-трэкам стаў дваццаціхвілінны відэазапіс фрагментаў аднаго з канцэртаў падчас другіх гастроляў Данчыка ў Беларусі (1996). Цяпер можна дакументальна пераканацца, што яны, як і ў першы раз (1989), былі трыумфальнымі.

Вядома, што Данчык (Багдан Андрусішын) — не эмігрант, а карэнны ўраджэнец Нью-Йорка. Але ж адкуль у гэтага, як пісала прэса 90-х гадоў, "залатагалосага беларускага салаўя з Амерыкі" такая бездакорная беларуская дыкцыя, такія глыбокія веды беларускага песеннага рэпертуару? А гэты ж папулярны артыст спяваў на прэстыжных сцэнах Карнэгі Хола, Лінкольн Цэнтра, Роял Альберт Хола, выдаў аж шэсць поўнафарматных альбомаў, з якіх адзін — украінскі, адзін — шматмоўны, а астатнія — беларускія.

Прычыны тут дзве. Па-першае, Данчык паходзіць з сям'і легендарных нашчадкаў славутага беларускага роду Луцкевічаў, ягоную бабулю Яніну Каханоўскую (у дзявоцтве Шабуня) калыхаў на руках сам Максім Багдановіч. І менавіта пра яе была нядаўна сумная вестка, што Яніна Каханоўская памерла ў Нью-Йорку 16 ліпеня 2005 года ва ўзросце 100 гадоў.

Па-другое, 16-гадовым юнаком Данчык трапіў на адзін з гастрольных канцэртаў па Амерыцы таямнічай зоркі з Беларусі "Песняроў" (1976) і проста захварэў іхнім рэпертуарам. Потым, калі пасля перамогі ў нейкім музычным конкурсе ён атрымаў шанц запісаць свой першы альбом (1978, "Беларусачка"), праграма кружэлкі амаль цалкам складалася з песняроўскага рэпертуару (так што першы беларускі трыб'ют — гэта не "Песнярок" 1997 года, а на дваццаць гадоў ранейшая Данчыкава "Беларусачка"). Праўда, нават у такім амплуа Данчык не губляў імпэту творчага падыходу: напрыклад, славутую песню "Белавежская пушча" Аляксандры Пахмутавай або знакамітую "Хатку па-над рэчкаю" яшчэ аднаго расійскага кампазітара Уладзіміра Мігулі Данчык выконваў у беларускім перакладзе Наталлі Арсенневай.

Альбом "Я ад вас далёка" быў другім рэлізам артыста, які даследчыкі называюць адназначна лепшым дасягненнем артыста. Ёсць там і творы знакамітых беларускіх кампазітараў з метраполіі (Ігар Лучанок, Эдуард Ханок, Юрый Савін), і фальклорныя звергрыны ("А ў полі вярба", "Лянок"). Але памятаю, як тады, у 80-х, беларусаў метраполіі ўразілі творы акурат прадстаўнікоў нашай дыяспары ў Амерыцы — Алеся Карповіча, Міколы Куліковіча. Хтосьці з іх надаваў мілагучную песенную форму класічнай паэзіі Янкі Купалы (загалоўны трэк "Я ад вас далёка"), хтосьці звяртаўся да паэтычнай спадчыны беларускай эміграцыі ("Каханая" на вершы Сержука Ясеня). Але як гэта нас уражвала тады дасканаласцю формы, відавочнасцю таленту.

Асобную ўвагу слухачоў выдаўцы звяртаюць на цяпер знакамітую песню "Зорачкі" Сяргея Новіка-Пяюна, які за сваё жыццё паспеў паспытаць смак фашысцкіх, польскіх, сталінскіх турмаў, шмат пісаў вершаў і мелодый, але толькі ў часы перабудовы дачакаўся пры жыцці выдання сціплай кніжачкі "Песні з-за кратаў". У рэпертуары Данчыка дзве ягоныя песні — "Вечар над Шчарай" і "Зорачкі", апошняя з якіх стала адным з найлепшых дыяментаў гэтага альбома. У буклеце выдання распавядаецца нават, што ў чароўным выкананні Данчыка легендарны аўтар асабіста здолеў паслухаць гэты твор хоць напрыканцы жыцця.

Што ні песня — то вірлівыя ўспаміны, што ні імя — то жывыя легенды і паданні. Такая спецыфіка гістарычных перавыданняў. Але ці будуць яны актуальнымі ў нашым часе, ці не страцілі моднага арэолу? Гэта ж папулярная музыка.

Бадай, меў рацыю музычны партал "Тузін гітоў", назваўшы гэты дыск лепшым укладам беларусаў у скарбонку наймаднейшага цяпер клубнага стылю r'n'b. Справа тым, што Данчык ніколі не арыентаваўся на моду, але заўсёды дбаў пра якасць, вось мода нарэшце і дагнала яго.

Самае прыемнае, што дыск "Я ад вас далёка" з'яўляецца пілотным выданнем запланаванай серыі поўнай дыскаграфіі Данчыка (6 CD), дзе будзе і дасканалы сучасны лічбавы гук, і рэдкія бонусы з творчага даробку артыста. Права на гэтую ініцыятыву Данчык паўнамоцна перадаў лэйблу "БМАgroup".

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

Прызнанне

"Юны Містэр свету" і "Першая Прынцэса" родам з Беларусі

Самыя таленавітыя і прыгажыя дзеці нараджаюцца ў Беларусі. Аб гэтым заявілі ўдзельнікі Міжнароднага фестывалю выканаўчых відаў мастацтва "Свет Талентаў-2005". Юныя зоркі: дэбютантка, рэкламны твар праекта "Прыгажосць выратуе свет" імідж-дызайн студыі "Вадалея" Вераніка ЦЕПЛЯКОВА (13 гадоў) і прадстаўнік Беларусі на дзіцячым конкурсе песні "Еўрабачанне-2004" Ягор ВАЎЧОК (13 гадоў), сталі абсалютнымі пераможцамі на фестывалі ў Кіеве сярод болей чым ста талентаў ад 5 да 15 гадоў з Украіны, Расіі, Беларусі, Азербайджана, Балгарыі, Польшчы, Ізраіля, Мальты і іншых краін.

Міжнародны фестываль "Свет Талентаў" існуе тры гады, і кожны раз ён прысвячаецца розным цікавым тэмам. Сёлетні — казцы ў сучаснай інтэрпрэтацыі "У гасцях у Папялушкі". Фестываль створаны па ўзоры галівудскага "Сусветнага чэмпіянату выканаўчых відаў мастацтва", калі ўдзельнікі адначасова змагаюцца ў двух конкурсах: "Шоу талентаў" і "Шоу прыгажосці". Так, талент дзяцей прафесійнае міжнароднае журы ацэньвала ў танцы, арыгінальным жанры, пародыі, вакале, акцёрскім майстэрстве, уменні ствараць і перадаваць вобразы.

Шоу прыгажосці складаецца з сямі выхадаў кожнага ўдзельніка на сцэну: прывітання каманд, выхадаў ў нацыянальных строях, кактэйльных, авангардных, вячэрніх, а таксама з шоу "містэрыя агню" і творчага нумара юных талентаў — дамашняга задання. Ва ўсіх павінен быў раскрыцца ўнутраны свет удзельнікаў, іх здольнасці хутка ўваходзіць у розныя вобразы. Асабліва спадабалася гледачам і членам журы, як Ягор спяваў беларускую песню пра тое, як цяжка хлопцу жыць сярод столькіх розных беларускіх дзяўчат-прыгажунь, а Вераніка выканала танцавальна-цыркавы эцюд, якім імкнулася данесці да гледачоў філасофію Усходу. Абодва беларускія таленты — выхаванцы імідж-дызайн студыі "Вадалея" Міжнароднага цэнтра творчасці, прыгажосці і таленту Кацярыны Пашкевіч, выклікалі сапраўдны фурор на кіеўскай сцэне і заваявалі вышэйшыя ўзнагароды.

У "Шоу талентаў" галоўны прыз атрымала Вераніка Цеплякова за лепшы нумар у арыгінальным жанры ў намінацыі "акцёрскае майстэрства", Ягор Ваўчок па вакалу заняў другое месца. А ў "Шоу прыгажосці" беларускі хлопец і дзяўчынка ўпершыню сталі ўладальнікамі такіх высокіх тытулаў, як "Юны Містэр свету" і "Першая Прынцэса свету".

Асабліва трэба адзначыць, што толькі выступленні беларускіх талентаў суправаджаліся фотавобразамі, якія ў рэжыме слайд-шоу на экранах растлумачвалі тое, што адбывалася на сцэне. Гэтыя фотавобразы і плакаты ("Банк і Цэнтр Талентаў Рэспублікі Беларусь", "Прыгажосць выратуе свет", "Брэнд-вобраз XXI стагоддзя", "Лепшы рэкламны твар кампаніі" — аўтарскія праекты Кацярыны Пашкевіч), якія былі спецыяльна падрыхтаваны да "Свету Талентаў-2005" імідж-дызайн студыяй "Вадалея", атрымалі Гран-пры ў "Шоу фантазій" на фестывалі. Падчас выхадаў беларускіх удзельнікаў на сцэну публіка ў зале крычала "Брава!", а апладысменты доўга не змаўкалі і пасля заканчэння іх выступленняў.

Што ж дапамагло беларусам аказацца лепшымі сярод столькіх таленавітых, яскравых і непаўторных дзетак з розных краін свету? Па словах Кацярыны Пашкевіч, яе выхаванцаў адрознівалі моцная энергетыка, уменне хутка пераўвасабляцца, а таксама вялізная праца і прафесійна пастаўленыя нумары.

P.S. Акрамя тых узнагарод і падарункаў, што Вераніка і Ягор ужо прывезлі ў Беларусь: карону, дыпломы пераможцаў, два Гран-пры, дзве ганаровыя стужкі, залатых матылькоў — сімвалаў фестывалю, у лютым 2006 года на форуме "Чалавек трэцяга тысячагоддзя" дзецям будуць уручаны імянныя ўзнагароды.

Кацярына НЕМАГАЙ.

НА ЗДЫМКАХ: Вераніка ЦЕПЛЯКОВА, Ягор ВАЎЧОК і іх апякунка Кацярына ПАШКЕВІЧ. Фота з архіва студыі "Вадалея", фотадызайн Ірыны БЫШКІНАЙ.

Коратка

Шэрлак Холмс Інтэрнэта

Студэнт БДУ Ігар Маханёк стаў "Чалавекам, які знайшоў усё!", паведаміла БелТА. Такое званне ён атрымаў па выніках VI Кубку Яндэкса па пошуку ў Інтэрнэце. Прадстаўнік Беларусі ўпершыню стаў пераможцам за ўсю гісторыю такіх спаборніцтваў. Лепшы Шэрлак Холмс Інтэрнэта расказаў, што ён спалучае вучобу на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ і работу ў адной з беларускіх кампаній, якая спецыялізуецца на ахове дадзеных у Інтэрнэце.

Дарэчы, у гэтым годзе ў Кубку Яндэкса прынялі ўдзел 9 тысяч 925 чалавек, з іх 237 беларусаў. Удзельнікам конкурсу было неабходна як мага хутчэй адшукаць адказы на такія заданні, як, напрыклад, хто з еўрапейцаў пабываў у Амерыцы да 1510 года, ці знайсці ў Інтэрнэце карту вёскі Самарскай вобласці, школе якой у гэтым годзе споўніцца 39 гадоў.

Таямніцы Белавежскай пушчы

Так называецца кніга, выдадзеная ў Брэсце.

...У Белавежскай пушчы жыве Дзед Мароз. Там яго маёнтак. Летам і зімой прыязджаюць сюды цікаўныя турысты з нашай краіны і замежжа. А хто ў ролі казачнага персанажа? Аказваецца, чалавек цікавага лёсу — вучоны Вячаслаў Семакоў.

Зразумела, гэта не галоўная "таямніца" пушчы.

"Распад СССР. Позірк з Белавежа" — у главе "Рэзідэнцыя". Так, гэта пра падзеі снежня 1991 года ў Белавежскай пушчы, у Віскулях. "Ракетны вожык з беларускіх лясоў". Гэты раздзел пра сакрэтныя ў мінулым аб'екты Савецкай Арміі. Зрэшты, чытач пабывае і ў кабінеце "галоўнага ракетчыка" ЗША Вернера фон Браўна, у падзямеллях ядзерных арсеналаў.

У раздзеле "Каля пушчы" — пра арганізатараў турызму, службы ДАІ і "Ахоўы" пра дарослых турыстаў і школьнікаў, якія наведваюць старажытны лес Еўропы.

Аўтары нібы запрашаюць: прыязджайце "ля высокіх бяроз сваё сэрца сагрэць".

Наталля КАЗАКОВА.

Турыстычны атлас

Адпачнём у Новы год у Беларусі

Айчынныя турыстычныя базы ў гэтым сезоне будуць самым папулярным месцам навагодняга адпачынку беларускіх грамадзян, паведамілі ў Нацыянальным агенцтве па турызме. Такі навагодні турыстычны выбар звязаны з паляпшэннем якасці сервісных паслуг на айчынных турыстычных базах і адноснай даступнасцю кошту. Айчынны спажывец пачаў прызнаваць, што беларускі ўнутраны турыстычны рынак прапаноўвае не менш якасны навагодні і калядны адпачынак, чым замежны. Асобым попытам у навагоднія святы карыстаецца двух-, трохдзённы адпачынак у катэджах на Браслаўскіх азёрах і на возеры Нарач.

Наша марка

У гатэля "Мінск" "Залатая карона"

У Маскве адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў IX Міжнароднай прэміі "Лідэры туріндустрыі", на якую з'ехаліся прадстаўнікі расійскай турэліты, а таксама нацыянальных турыстычных цэнтраў і турфірмаў еўрапейскіх краін.

Прыз конкурсу "Залатая карона" ў намінацыі "Якасць абслугоўвання (гасцінічны комплекс)" быў прысуджаны беларускаму гатэлю "Мінск". Кампетэнтнасць, упэўненасць і ветлівасць персаналу, высокія стандарты паводзін — усё гэта складаючыя поспеху гатэля. Калектыў імкнецца да выхаду беларускага турпрадукту на сусветны рынак, а таксама падтрымаць уязны турызм.

Паказальна тое, што летась заслугі гатэля "Мінск" у сферы турызму былі адзначаны ў гэтым конкурсе "Сярэбранай каронай". І, нарэшце, вось яна — "Залатая карона" гасцінічнай імперыі!

Тэкст і ф
Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Незалежнасці, 44.
Тэлефоны: (+375 – 17) 288 – 11 – 97 (бухгалтэрыя), 288–12–80, 284–76–56, 288– 17– 82 (гал./факс).
Галоўны рэдактар: 8029– 6– 88–17– 82. Email:golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ: http://www.belarus21.by

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 2035 экз. Заказ 764. Падпісана да друку 20. 12. 2005 г. у 12.00.
Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе. Знакам R пазначаны рэкламныя матэрыялы.
Аддрукавана ААТ «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.
© «Голас Радзімы», 2005.